тэй частцы Эўропы, якую пакрывае лёэс). Рэкі цякуць павольна, увясну шырока разьліваюцца і часта мяняюць свае рэчышчы, пакідаючы на месцы іх дугаватыя вазёры-старарэччы.

Клімат Беларускага лесастэпу сушэйшы, як у іншых краінах Беларусі, лета там гарачэйшае, ападкаў выпадае меней. Калісь гэтая краіна была голым бяздрэўным стэпам, але яшчэ ў перадгістарычныя часы пачала парастаць лесам, які спачатку зьяўляўся па ярох і рэчных далінах, а потым блізка-што зусім выціснуў адгэтуль стэпавыя травы. У часы панаваньня тут стэпаў лёэс пакрыўся тлустай чорназемнай глебай, але пад лесам гэтая глеба выпаласкалася, зьбялела і перавярнулася ў шэрыя суглінкі або ў суглінкі на лёэсе. Такія глебы пры добрай гаспадарцы таксама зьяўляюцца ўраджайнымі, а з гэтай прычыны чалавек з даўных часоў пачаў высякаць тутэйшыя лясы і большую частку іх перавярнуў на нівы. Цяпер лясоў тут засталося ўжо мала, а краіна выглядае зноў, як стэп, з раскіданымі па ім дубовымі гайкамі. Хваёвыя бары сустракаюцца тут ужо радзей, як у рэшце Беларусі; найболей іх па пескавых грунтох каля рэк. Насяленьне краіны—пераважна беларусы, патомкі радзімічаў; на поўдні да іх далучаецца прымешка ўкраінцаў, а па так званых „пасадах“ сустракаецца шмат старавераў—маскоўцаў, якія асталяваліся тут яшчэ ў XVII веку, калі іх ганіў і прасьледваў на Маскоўшчыне расійскі ўрад.

Гаспадарка ў краіне мае шмат асаблівасьцяй. Апрача звычайных расьлін, пашыраных паўсюды на Беларусі, тут сеюць шмат канопель, значна болей, як лёну, табакі, цукровых буракоў. Па стараверскіх пасадах пашырана прамысловае гародніцтва.

Параўнаўча з іншымі краінамі Беларусі тут значна вышэй стаіць фабрычная прамысловасьць. На захадзе ў *Новазыбкаве* (19 тыс. насельн.), *Злынцы* (6 тыс. насельн.) існуюць значныя фабрыкі сернічак; па дварох трапляюцца цукраварні, па местах шмат табачных фабрык, пенькатрапальняй, алейняй і г. д. Аднак найвялікшую прамысловую вагу мае выраб сукна ў *Клінцох* (16 тыс. насельн.). Места гэтае паводле сваёй прамысловасьці можа спрачацца за першае месца з Беластокам. Дзякуючы чыгунцы Гомель-Бранск, якая праходзіць праз Клінцы, горад гэты мае лёгкі збыт сваёй тканіны як на ўсход, гэтак і на захад. Суконныя фабрыкі, гісэрні, гарбарні і алейні раскіданы ў вялікай колькасьці і ў ваколіцах Клінцоў. З іншых гарадоў краіны варта заўважыць *Старадуб* (12 тыс. нас.), ціхі гарадок, асяродак ураджайнай акругі, багатай збожжам і пянькой, і *Почап* (12 тыс. нас.) на чыгунцы з Клінцоў у Бранск, багатае гандлёвае места, вядомае вырабам пянькі і алею.

На мяжы краіны на Дзясьне ляжыць моцна амаскалены стары горад *Бранск* (35 тыс. нас.). Цяпер гэта губэрскі горад, вядомы гандлем лесам, алеем і пянькой. Дзясна ад Бранску робіцца гожай для руху параходаў і мае вялікае значэньне для вывазу гэтых тавараў. Аднак яшчэ



болей вагі маюць чыгункі, якія разыходзяцца ад Бранску ў шасьцёх кірунках. Бранск адзначаецца буйной прамысловасьцю, галоўным чынам жалезаапрацоўчай. Асабліва вядома так званая бранская рэйка-пракатная фабрыка, адна з найвялікшых ува Ўсходняй Эўропе. Яна ляжыць у месьце *Бежыца* (20 тыс. насельн.) у ваколіцах Бранску. На поўнач ад Бранску здабываецца шмат жалезнай руды, існуе шмат гісэрань і рознастайных фабрык.

## Паўночная Маскоўшчына.

Большую частку паўночнага лясного пасу Ўсходняй Эўропы займае Паўночная Маскоўшчына. Гэта вельмі вялікая старана, пераважна нізінная, месцам роўная, месцам узгаркаватая з рэдкай люднасьцю, якая стварылася праз злучэньне фінскіх першапачатковых насельнікаў з славянамі, што надышлі сюды з Беларусі і Ўкраіны.

Ледавіковы навал пакрывае гэтую старану таксама, як Беларусь і Надбалтыцкі край, і толькі на крайнім паўночным усходзе грунты складаюцца з адкладаў Ледаватага мора, якое насоўвалася туды ў ледавіковую эпоху.

Клімат Паўночнай Маскоўшчыны жорсткі, сухі, тыповы для Ўсходняй Эўропы. Асабліва халодныя тутака зімы. Лета досыць цёплае. Ападкаў хапае. Параваньне вады з земнай паверхні малое, і з гэтай прычыны ў грунтох заўсёды многа вільгаці, так што балоты займаюць вялікія прасторы, а рэкі заўсёды маюць досыць вады. Лясы, якія пакрываюць старонку, затрымоўваюць занадта хуткае раставаньне сьнягоў, якіх тут, дзякуючы сьцюдзёнай і трывалай зіме, набіраецца ў канцы зімы вельмі многа.

Дзякуючы лясом, веснавая вада пакрысе прасочваецца ў грунт і патроху папаўняе недахват вады ў рэках. Тутэйшыя рэкі належаць да трох вялікіх вадазбораў: адны з іх бягуць у Ледаватае і Белае моры, другія—у Балтыцкае мора, трэція—у Касьпійскае возера. (Пераглядзі па карце назовы гэтых рэк). Вадападзелы тут нявысокія, так што ў даўныя часы падарожнікі лёгка перацягвалі свае чаўны з аднаго вадазбору ў другі, а цяпер рэкі ўсіх трох вадазбораў злучаны суднаходнымі каналамі і складаюць адзіную рэчную сецьь.

Лясы Паўночнай Маскоўшчыны складаюцца пераважна з іглястых дрэў, але на паўднёвым захадзе да іх далучаюцца дубы, ліпы, вязы і іншыя шыракаліставыя дрэвы. Аднак многія расьліны, якія на Беларусі зьяўляюцца самымі звычайнымі, ужо ня могуць вытрымаць халадоў Паўночнай Маскоўшчыны. Там ніколі не сустракаецца граб, няма й таполяў, конскіх каштанаў, белых „акацый“ (робініяў), якія зьяўляюцца прыгожай акрасай беларускіх гарадоў. Лясы чаргуюцца з імшарамі, а на крайняй поўначы зусім выціскаюцца імі, так што там пануе аднастайная бяз-

дрэўная тундра, у якой вечна-мёрзлы грунт перашкаджае ўзрастаньню дрэў. У іншых месцах пад лесам утварыліся падзольныя грунты, бедныя перагноем, бо ў лясох затрымоўваецца вільгаць, якая раскладае і выпаласквае перагной з грунту.

У той час, як на Беларусі славяне былі першымі з вядомых насельнікаў краю, тут, у Паўночнай Маскоўшчыне, спачатку паўсюды жылі розныя фінскія пляменьні. З гэтых пляменьняў складаліся 3 групы: заходняя або надбалтыцкая, да якой належалі між іншым і продкі сучасных эстонцаў, паўночна-ўсходняя або прыуральская і паўднёвая або паволская.

У IX в., а можа нават і раней, сюды пачалі надыходзіць славянскія перасяленцы з Беларусі і з Украіны. Стоячы на вышэйшай ступені культуры, славяне пакрысе пачалі аславяньваць тубыльцаў. Тутэйшыя фіны запазычылі славянскую мову й культуру і зьліліся з славянамі ў адну вялікарускую нацыю. Толькі ў самых глухіх немярэчах, у балотных прасторах тайгі ды ў тундры засталіся рэшткі першых насельнікаў, якія захавалі фінскую мову і старадаўныя звычаі.

Вялікарусы залажылі ў межах Паўночнай Маскоўшчыны свае княствы, а потым, пасьля татарскай няволі, злучыліся ў адну магутную Маскоўскую дзяржаву. Галоўная рака краю—Волга—паказала маскоўцам дарогу для далейшай колёнізацыі на ўсход і паўднёвы ўсход. Пакрысе вялікарусы заўладалі бязмаль усёй Усходняй Эўропай і Паўночнай Азіяй. Маскоўская або Расійская дзяржава пачала знасіцца з Заходняй Эўропай і зрабілася аднэй з найвялікшых дзяржаў сьвету. Аднак далячыня яе ад заходня-эўропэйскіх культурных асяродкаў, слабое разьвіцьцё ў ёй гандлю—затрымалі яе культурны рух, і сярод эўропэйскіх дзяржаў Расія заставалася аднэй з апошніх паводле становішча асьветы, навукі, гаспадаркі. Толькі каля буйных гарадоў, асабліва каля сталіц, дзе пашырылася фабрычная прамысловасьць, процант няпісьменных параўнаўча невялікі.

Зьяўляючыся пераважна сельска-гаспадарчым краем, Паўночная Маскоўшчына аднак і па становішчы ральніцтва засталася ззаду ня толькі ад заходня-эўропэйскіх краін, але таксама адстала і ад суседніх—Беларусі і Украіны. Наагул там пануе сярод спосабаў ральніцтва трохпалёўка, але яшчэ шмат у якіх месцах побач з гэтым захаваўся старасьвецкі лядавы спосаб ральніцтва, які бязмаль-што зусім выВеўся на Беларусі.

З другога боку, кармавых расьлін сеюць тут меней, як на Беларусі; палепшаныя спосабы ральніцтва не пашыраны. Толькі каля самай Масквы гаспадарка стаіць трохі вышэй. Палепшаныя сельска-гаспадарчыя прылады, напрыклад, плуг, які даўно выціснуў на Беларусі старасьвецкую драўляную саху, зьяўляюцца яшчэ рэдкімі ў Паўночнай Маскоўшчыне.

Жорсткі клімат Паўночнай Маскоўшчыны перашкаджае ўзрастаньню шмат якіх расьлін, пашыраных на Беларусі. Пшаніцы там сеюць яшчэ меней, як у нас, проса амаль-што зусім не расьце, таксама і кіяхі. Бульбы там сеюць значна меней, як у нас, і расьце яна там горай. Благія грунты перашкаджаюць засевам каноплі. Табака не пашырана. Галоўнымі карысньмі расьлінамі зьяўляюцца жыта, авёс, лён. Аднак і жытам старонка ня можа задаволіць патрэбы сваіх насельнікаў. Сяляне мусяць шукаць дапаможных заняткаў. Неўраджайныя грунты і недахват збожжа прымусілі тамтэйшых сялян зьвярнуць увагу на лясныя багацьці краю і на саматужныя промыслы. Валка і вываз лесу ў некаторых мясцовасьцях, дзе лесу яшчэ многа, даюць болей даходаў сялянству, чым ральніцтва й гадоўля жывёлы. Лес і лён зьяўляюцца галоўнымі продуктамі, якія Паўночная Маскоўшчына можа вывозіць у Заходнюю Эўропу.



Там, дзе лясы павысяканы, сяляне займаюцца саматужнай (кустарнай) прамысловасьцю, або йдуць на фабрыкі і на іншыя заработкі ў гарады. Саматужнікі ў сваёй хаце сваімі ўласнымі прыладамі вырабляюць тавар на продаж не па заказе, а на невядомага пакупца. (Гэтым саматужнік адрозьняецца ад рамесьніка). Асабліва пашырылася ў Паўночнай Маскоўшчыне саматужная апрацоўка дрэва, але ёсьць саматужнікі — гарбары, шаўцы, ткачы і г. д.

Адыход на заработкі асабліва пашырыўся каля сталіц. Адны з маскоўцаў ідуць выключна ў гарады працаваць на фабрыках, другія вандруюць па Усходняй Эўропе з рознымі таннымі таварамі, якімі гандлююць, па вёсках і кірмашох.

Вялікарусы Паўночнай Маскоўшчыны прызвычаіліся да вечнага змагання з прыродай, прызвычаіліся на кожным кроку перамагаць усялякія перашкоды, цярпець голад і холад, працаваць без адпачынку ў працягу кароткага лета над убогай ральлёй. У зьвязку з гэтым яны адзначаюцца нягрэблівасьцю, задавальняюцца малым, умеюць выкручвацца з цяжкіх абставін, дапасоўвацца да ўсялякіх варункаў жыцьця. У сям'і вялікарус адзначаецца дэспотызмам: бацька зьяўляецца поўным гаспадаром сям'і; муж—гаспадаром і ўласьнікам жонкі.

Зямлёй вялікарусы ўладаюць супольна. Падворная земляўласнасьць, пашыраная на Беларусі, сустракаецца рэдка ў Маскоўшчыне. Звычайна зямля належыць да ўсёй вёскі, і час ад часу адбываюцца перадзелы: зямлю разьмяркоўваюць пароўну між усімі працаўнікамі або ўсімі ядунамі вясковай грамады—„абшчыны“.

Вёскі складаюцца, як і ў нас, з драўляных хат, выцягнутых удоўж аднэй даўгой вуліцы. Хаты прастарнейшыя, чым на Беларусі, выходзяць беспасрэдна на вуліцу, рэдка абкружаны садочкамі; на вуліцах і каля хат меней, як у нас, зеляніны.

Паводле асаблівасьцяй прыроды і насельніцтва Паўночную Маскоўшчыну можна падзяліць на 4 краіны: 1) Волска-Окскае міжарэчча, 2) Вазёрную краіну, 3) Усходня-Эўропэйскую тайгу і 4) Тундру.

**Окска-Волскае міжарэчча** часта завуць яшчэ Маскоўскай прамысловай краінай або Сярэдняй Расіяй. Краіна гэтая цягнецца на ўсход ад пачаткаў Дняпра і займае прастору між вышнявінай Волгі і Акой у самай сярэдзіне Ўсходняй Эўропы.

Паводле сваёй прыроды гэтая краіна мае шмат супольнага з Беларусьсю. Гэта таксама пераходны край між паўночнай і паўднёвай паловамі Ўсходняй Эўропы. Як і на поўдні, тут часта сустракаюцца раўчакі, але, як і на поўначы, трапляюцца вазёры ледавіковага пахаджэньня. Ледавіковыя адклады ляжаць тутака досыць тонкім роўным пластом, як у нас на Палесьсі або ў Вокаўскім лесе. Амаль-што ўся краіна мае выгляд раўніны бяз узгоркаў і грудоў, пахіленай з захаду на ўсход. На мяжы з Беларусьсю на захадзе краіны цягнецца ад пачаткаў Волгі да пачаткаў Акі так званае Сярэдня-Рускае ўзвышша—вадападзел між Дняпроўскім і Волскім вадазборамі. Рэкі, якія сьцякаюць з гэтага ўзвышша, глыбока ўрэзаліся тут сваімі далінамі ў земную паверхню. На ўсход ад суток Акі з яе прытокай—Масквой—Сярэдня-Рускае ўзвышша няпрыметна пераходзіць у нізіну, якая пад назовам Вышня-Волскай нізіны абымае большую частку краіны.

Параўнаўча з беларускім, тутэйшы клімат досыць жорсткі, значна сушэйшы. Зімы тут марозныя, трывалыя, лета цяплейшае, як на Беларусі, а ліпень можа лічыцца нават сьпякотным, занадта гарачым. Ападкі, як і ў нас, выпадаюць пераважна ўлетку, узімку іх меней, але з прычыны адсутнасьці адліг сьнег трымаецца праз усю зіму і зьбіраецца да вясны грубейшым, як у нас, пластом.

У асяродку краіны ў гор. Маскве сярэдняя тэмпэратура году $+3,9^{0}$, сярэдняя студзеня—$11^{0}$, ліпеня$+18,9^{0}$.

Чым далей на ўсход, тым халаднейшы клімат, тым пазьней пачынаецца вясна. З гэтай прычыны галоўныя рэкі краіны, якія цякуць з захаду на ўсход (Волга, Ака, Масква, Клязьма), узьнімаюцца раней за ўсё ў сваіх пачатках. Крыга вышнявіны даходзіць да пакрытай яшчэ лёдам часткі ракі, набіваецца пад лёд і ўтварае так званыя лёдавыя заторы. Вада не знаходзіць сабе дарогі, выходзіць з берагоў і залівае даліну. Такім чынам веснавыя разводзьдзі тут бываюць асабліва вялікімі.

Расьліннасьць Окска-Волскага міжарэчча складаецца, як і на Беларусі, з мяшаных лясоў. Дуб і ліпа сустракаюцца тут побач з елкай і хвояй. Але тут па лясох ужо нідзе не расьце граб, а самых лясоў засталося значна меней, як у нас; большую частку іх даўно павысякалі. Як і на Беларусі, тут пераважваюць лясныя дзярнова-падзольныя грунты, але, дзякуючы халаднейшаму клімату, ураджаі збожжа тут яшчэ горшыя, як у нас.

Даўныя насельнікі краіны—фінскія пляменьні паволскай групы: мурома (па Ацэ) і мера (па Волзе) і літоўскае племя голядзь (на захад ад



Масквы)—тут зусім разышліся ў грамадзе славянскіх перасяленцаў, якія прышлі сюды з захаду і з паўднёвага захаду. Увабраўшы ў сябе фінскую кроў, славяне стварылі тут вялікарускую нацыю, якая хутка падпала яшчэ пад уплывы татараў, але вызвалілася з-пад татарскага ярма, узмацнілася, склала магутную Маскоўскую дзяржаву, колёнізавала землі, што ляжаць на ўсход па Волзе, Урал і Сібір, злучыла нарэшце пад сваёй уладай усю Ўсходня-Эўропэйскую раўніну і бязьмежныя абшары Паўночнай Азіі.

Окска-Волскае міжарэчча зьяўляецца асяродкам вялікарускага краю і калыскай вялікарасійскай дзяржаўнасьці. Ад даўных тубыльцаў краіны—фінаў—тут не засталося нават і рэштак. Сучасныя насельнікі лічацца самымі тыповымі прадстаўнікамі вялікарусаў, а мова іх зрабілася агульна-вялікарускай пісьменнай мовай. Тут, каля Масквы, пачалося аб'яднаньне даўных вялікарускіх княстваў у адну Маскоўскую дзяржаву, так званае „зьбіраньне зямлі Рускай".

Для вялікарусаў характэрным зьяўляецца ўсходні ўплыў у сямейным, грамадзянскім і рэлігійным жыцьці. У рэлігійных пытаньнях вялікарусы выяўляюць чыста ўсходні фанатызм. Пры гэтым яны найвялікшую вагу дадаюць ня сутнасьці веры, а паказному яе боку, абрадам. Нідзе сярод славянаў няма такой вялікай колькасьці рэлігійных сэкт, як сярод маскоўцаў.

Можна сказаць, што кожнае здарэньне ў політычным жыцьці Маскоўшчыны выклікала ўтварэньне новых рэлігійных сэкт, новых рэлігійных суполак. Пасьля выпраўленьня даўных кніг патрыярхам Ніканам утварыліся стараверы рознага закону, якія абвясьцілі „ніканіанцаў" гэрэтыкамі, богаадступнікамі; пасьля рэформаў Пётры I зноў аддзялілася ад праваслаўнай веры некалькі сэкт, якія абвясьцілі Пётру I антыхрыстам. На чужаверцаў маскоўцы глядзяць з пагардай і ўнікаюць іх. У іх няма тэй рэлігійнай талерантнасьці, якой адзначаюцца беларусы і ўкраінцы. Гэтым тлумачацца надзвычайныя разьмеры рэлігійных змаганьняў паміж сэктамі, змаганьняў, якія загналі фанатычных старавераў у пушчы далёкай поўначы, у пустыні далёкага ўсходу, за межы Маскоўшчыны, змаганьняў, якія выклікалі нават самаспаленьне старавераў на вогнішчах.

Дзякуючы палажэньню ў асяродку Ўсходняй Эўропы, у Окска-Волскім міжарэччы крыжуюцца галоўныя ўсходня-эўропэйскія чыгункі, галоўныя гандлёвыя шляхі. Лежачы на мяжы паўднёвага бязьлеснага земляробскага пасу і паўночнага пасу, багатага дрэвам, краіна зрабілася пасярэдніцай у гандлі гэтых пасаў. Пашырэньню гандлю ў краіне дапамагала і адсутнасьць ураджайных грунтоў, бо прымушала насельнікаў шукаць дапаможных заняткаў апрача ральніцтва, якое не давала тут вялікай карысьці.

Ральніцтва стаіць у краіне нявысока. Толькі ў апошнія гады перад вайной каля сталіцы пачалі завадзіць канюшыну; у рэшце краіны рашуча пануе трохпалёўка, і галоўнымі расьлінамі зьяўляюцца жыта і авёс. Свайго збожжа тут не хапае.

Лепей стаіць гародніцтва. На поўначы краіны каля возера Неро (Растоўскага) нават цэлыя вёскі залюднены выключна гароднічымі. Гарох, цыбуля, часнок, цыкорыя вырабляюцца там на вываз, а тамтэйшыя сяляне адыходзяць на заработкі ў гарады і ў суседнія краіны, дзе іх з ахвотай наймаюць, як найлепшых гародніч ых-спэцыялістых. З кожным годам пашыраецца ў краіне і садоўніцтва, саджаньне яблынь і йгруш, але далёка ня мае тэй вагі, як у нас на Беларусі. Сьліва тут зусім не расьце, вішня расьце вельмі дрэнна.

Затое нідзе не пашырана гэтак, як тут, саматужная прамысловасьць. Некалькі мільёнаў сялян зусім кінулі земляробства і займаюцца тут выключна саматужным вырабам на продаж розных драўляных, скураных, мэталічных, бавэўняных, ільняных і іншых рэчаў хатняга ўжытку.

У гэтай працы прымаюць удзел і жанчыны і дзеці поплеч з мужчынамі, занятымі толькі самай цяжкай часткай гэтай работы. З дрэва вырабляюць мэблю, калёсы, колы, сані, цацкі, лыжкі і г. д. З гліны гатуюць добрую пасудзіну, парцалянавую і паўпарцалянавую (асабліва каля мястэчка Гжэль Маскоўскай губ., дзе знаходзяць паклады найлепшага белагліньня); з жалеза вырабляюць замочкі, нажы, відэльцы, нажнічкі і г. д. (асабліва каля сутокі Акі з Клязьмай). Месцам саматужнікі шыюць на продаж боты (па Вышняй Волзе, асабліва каля места Кімры), месцам малююць абразы для цэркваў і веруючых (па нізавіне Клязьмы). Саматужныя вырабы прадаюцца звычайна дробным вандроўным гандляром, якія або самі разносяць і развозяць гэтыя тавары, або перапрадаюць іх буйным гарадзкім гандляром. Даўней сярод саматужных промыслаў пачэснае месца займала ткацтва, але ў апошнія гады саматужнае ткацтва выціснулася мануфактурнымі і фабрычнымі вырабамі.

Кіруючы гандлем Усходняй Эўропы, Маскоўская прамысловая краіна высока паставіла ў сябе і фабрычную прамысловасьць. З усіх кутоў Расійскай дзяржавы сюды прывозяць розную сырыну і ўсё патрэбнае для яе апрацоўкі, перарабляюць на тутэйшых фабрыках і зноў развозяць фабрычныя вырабы па ўскрайках дзяржавы. Асабліва многа тут ткацкіх фабрык. З Туркестану, з Закаўказьзя, з Кітаю, нават з Амэрыкі прывозілі сюды баваўняную сырыну і выраблялі тут з яе баваўнянку розных гатункаў. Шмат якія фабрыкі апрацоўваюць тут ільняніну, воўну і шоўк. Вялікую вагу мае і апрацоўка мэталаў, асабліва ў тых мясцовасьцях, дзе трапляюцца значныя паклады жалезнай руды, як па рэчцы Жыздры (Прасачы па карце, куды яна ўліваецца) і па Ніжняй Ацэ. Шкляныя гуты, цагельні, бравары і паравыя млыны таксама даюць заработкі тысячам насельнікаў краіны. Зразумела, што прамысловасьць краіны ня можа йсьці ў параўнаньне з прамысловасьцю каменна-вугальных акруг, бо тут нехапае свайго мясцовага апалу і яго трэба прывозіць з далёкай Данеччыны, але ўва Усходняй Эўропе гэта—адна з найболей прамысловых краін.

Дзякуючы высокаму становішчу гандлю і прамысловасьці, Окска-Волскае міжарэчча адзначаецца, параўнаўча з суседнімі краінамі, досыць высо-



кай гушчынёю залюдненьня. (На квадратны кілёмэтр тутака прыпадае болей за 42 чал., у той час, як на Беларусі толькі каля 35; у Вазёрным краі яшчэ меней). Значная частка сялянскага люду не знаходзіць сабе працы ані на фабрыках, ані ў саматужніцтве і шукае заработкаў за межамі ў Украіне і Сібіры, па Ніжняй Волзе і г. д. Адыход на заработкі тут мае вельмі вялікую вагу, асабліва каля Масквы, дзе значная частка сялянства йдзе ў сталіцу. Часамі на вёсках застаюцца толькі бабы, дзеці ды старыкі, бо ўсе працаздольныя мужчыны адыходзяць у гарады. Амаль-што па ўсёй Усходняй Эўропе працуюць калускія грабары, цесьляры, пячнікі, ніжагародзкія грузчыкі; паўсюды вандруюць яраслаўскія ды ўладзімірскія гандляры (офені, коробейнікі), цвярскія хурманы і г. д.

Вёскі тутэйшых сялян складаюцца з аднапаверхавых драўляных хат і маюць шэры ўбогі выгляд. Затое шмат якія вёскі, насельнікі якіх займаюцца саматужнымі промысламі, пабагацелі, адбудаваліся на гарадзкі ўзор, вырасьлі і перавярнуліся ў запраўдныя гарады. Замест нашых мястэчак там сустракаюцца, як у старавераў Беларускага лесастэпу, яшчэ так званыя „пасады", якія зьяўляюцца часта запраўднымі гарадамі з буйной прамысловасьцю і бойкім гандлем. Наагул паселішчы гарадзкога тыпу тут сустракаюцца часьцей, як у іншых мясцовасьцях Усходняй Эўропы. Тутэйшыя гарады адзначаюцца вялікай колькасьцю цэркваў і кляштараў. Часта месты з 2-3 тысячамі насельнікаў маюць болей цэркваў, як самыя вялікія гарады Беларусі. Часта па сярэднярасійскіх гарадох захаваліся й так званыя „крэмлі", крэпасьці ў асяродку гарадоў з руінамі старасьвецкіх муроў, веж і г. д.

Званіцы цэркваў і кляштараў побач з комінамі фабрык, вежы старасьвецкага крамля поруч з сучаснымі многапаверхавымі камяніцамі кідаюцца перш за ўсё ў вочы і ў сталіцы Вялікарусі, у галоўным горадзе краіны—у *Маскве.* Горад гэты ляжыць, можна сказаць, у самым асяродку Усходняй Эўропы, прыблізна ў роўнай адлегласьці ад Белага і Чорнага мораў, ад Польшчы і ад Уралу, ад Касьпійскіх стэпаў і ад прыстань Балтыцкага мора. Першым горадам Усходняй Эўропы Масква магла зрабіцца толькі тады, як уся Усходняя Эўропа была ўжо больш-менш роўна залюднена і ўся больш-менш запазычыла агульна-эўропэйскую культуру.

Заложаная яшчэ ў XII веку, Масква хутка зрабілася сталіцай Маскоўскага вялікага княства, а потым Маскоўскага царства, і праз увесь час існаваньня Маскоўскай дзяржавы павялічвалася, узмацнялася, багацела. Нават перанясеньне сталіцы ў Ленінград ня зьнішчыла вялікай вагі гэтага гораду. Масква заставалася месцам, багатым гістарычнымі ўспамінамі, асяродкам вялікарускай самабытнай культуры.

Асяродкавае палажэньне Масквы прымушала пракладаць праз яе галоўныя чыгункі Расійскай дзяржавы, і яна зрабілася галоўным вузлом дарог Усходняй Эўропы. У той час, калі Ленінград быў асяродкам замежнага гандлю Вялікарусі, Масква была асяродкам гандлю ўнутранога. (Ган-

длёвыя абароты яе да вайны перавышалі 2 мільярды рублёў золатам). Калі-ж Ленінград пасьля вайны страціў сваю вагу з прычыны спыну замежнага гандлю Расіі, Масква зрабілася першым горадам Усходняй Эўропы, а ўсьлед за тым яе зноў зрабілі сталіцай Расійскай дзяржавы.

Як старасьвецкая сталіца Маскоўскага царства, Масква зьмяшчае шмат цікавых і прыгожых помнікаў мінуўшчыны. Перш за ўсё такім помнікам трэба лічыць Крэмль, старасьвецкую крэпасьць, якая ляжыць у асяродку сталіцы на беразе ракі Масквы. З усіх бакоў гэтую даўнюю крэпасьць атачаюць мураваныя сьцены з прыгожымі вежамі, а ў сярэдзіне яе знаходзяцца таксама вельмі старыя кляштары і саборы, палацы цароў, „палаты“ (Грановітая і Оружэйная), якія зьяўляюцца запраўднымі музэямі царскіх даўнасьцяй. Каля крамлёўскіх муроў ляжыць так званы Белы горад, найболей эўропэйская частка Масквы.



Мал. 95.—Крэмль у Маскве.

Прамысловую, фабрычную частку сталіцы становяць яе многалічныя ўскрайкі, у якіх побач з харошымі паркамі і прытульнымі дачамі пабудованы вялізныя фабрыкі, на якіх вырабляюцца крамніна розных гатункаў, скураныя тавары, мэталёвыя прылады, папера, прадметы раскошы і г. д., якія адгэтуль вывозіліся ня толькі ўва ўсе куты даўнай Расійскай імпэрыі, але нават у Кітай, Пэрсію, Афганістан і Манголію. (Продукцыя маскоўскіх фабрык дасягала да вайны 200 мільёнаў рублёў золатам). Як культурны асяродак Вялікарусі, Масква мае шмат вышэйшых школ (у тым ліку найстарэйшы і найлюднейшы унівэрсытэт Расіі, сельска-гаспадарчую акадэмію, шэраг асаблівых тэхнічных вышэйшых школ і г. д.), слынных музэяў („Третьяковская галлерея“, „Румянцевский музей“), шмат бібліотэк, навуковых і іншых культурных устаноў.



Перад вайной Масква была восьмым горадам у сьвеце паводле сваёй велічыні. Ува Усходняй Эўропе толькі Ленінград перавышаў яе па колькасьці насельнікаў. У 1917 г. тут было болей за 2 мільёны насельнікаў. Аднак ад гэтага часу ў зьвязку з агульным заняпадам гарадоў Расіі насяленьне Масквы пачало зьмяншацца. У 1920 г. тут засталося толькі 1028000 насельнікаў; Масква перагнала Ленінград, але сярод гарадоў сьвету апынулася толькі на 18 месцы. Затым горад зноў пачаў адраджацца, і цяпер налічвае ўжо каля 1500000 насельнікаў.



Мал. 96.—Масква. „Красная площадь“.

Навокала Масквы ляжыць шмат другарадных гарадоў, якія складаюць падмаскоўны прамысловы раён. Сюды належаць *Падольск* (13000 насельн.), *Багародзк* (25000 н.) з буйным вырабам крамніны, *Арэхава-Зуева* (44000 н.), якое лічылася вёскай аж да рэволюцыі, хаця фактычна было важным і багатым прамысловым местам. Фабрыкі падмаскоўнага прамысловага раёну будуць у будучыне карыстацца замест апалу электрычнай энэргіяй, якую будзе выпрабляць электрычная станцыя ў *Ягор'еўску*. Гэтая станцыя будзе працаваць, карыстаючыся, як апалам, мясцовым торфам.

Такі самы прамысловы раён, як пад Масквой, ёсьць і на паўночным усходзе краіны. Асяродкам гэтага раёну зьяўляецца горад *Іванава-Вазьнясенск* (72000 н.), які лічыцца галоўным асяродкам расійскай баваўнянай прамысловасьці, і з гэтай прычыны завецца расійскім Манчэстэрам. У хуткім часе тут мусіць пабудавацца вялікая электрычная станцыя, якая заменіць апал на мясцовых фабрыках электрычнай энэргіяй. Сама гэтая станцыя будзе карыстацца, як апалам, ваколічнымі запасамі торфу.

Аднак самыя важныя пасьля Масквы гандлёвыя гарады краіны ляжаць на Волзе, як на галоўным гандлёвым шляху ўсёй Вялікарусі. На вышнявіне Волгі на межах з Беларусьсю ляжыць старое крывіцкае места *Ржэва* (27000 н.). Там існуюць значныя фабрыкі з вырабам ільняніны.



Мал. 97.—Ніжні-Ноўгарад.

Ніжэй супроць вусьця Твярцы, злучанай Вышнявалоцкім каналам з Мстой, якая належыць ужо да Балтыцкага вадазбору, ляжыць губэрскі гандлёва-прамысловы горад *Твер* (83000 н.). Гэта—пачатковы пункт параходнага руху па Волзе і важная станцыя на чыгунцы з Масквы ў Ленінград. Яшчэ большую гандлёвую вагу мае *Рыбінск* (49000 н.), волская прыстань, якая ляжыць процiў вусьця Шаксны, злучанай каналамі і рэкамі з Онескім возерам. Тут тавары, што прывозяцца з Ніжняй Волгі, перагружаюцца з параходаў на баркі, у якіх іх вязуць па Шаксьне і далей у Ленінград. Увясну і ўлетку сюды на працу зьбіраюцца дзесяткі тысяч асначоў з усёй краіны.



Ніжэй па Волзе ляжаць губэрскія гарады, важныя гандлёва-прамысловыя асяродкі: *Яраслаў* (90 тыс. насельн.) і *Кострома* (59 тыс. нас.). Першы з іх ляжыць на чыгунцы з Масквы ў Архангельск і вырабляе ільняніну і баваўнянку. Другі таксама мае шмат фабрык, вырабляючых крамніну, асабліва ільняніну.

Нарэшце, на крайнім усходзе краіны, каля сутокі Волгі і Акі, знаходзіцца багаты гандлёвы горад *Ніжні-Ноўгарад* (134 тыс. насельн.), слынны сваім кірмашом, які адбываецца што-год з 15 ліпеня па 25 жніўня. У час кірмашу тутака зьбіраюцца дзесяткі й сотні тысяч гандляроў з усіх куткоў Усходняй Эўропы, Паўночнай і Заходняй Азіі.

Гэта самы вялікі кірмаш усяго сьвету, на які прывозяць тавараў што-год коштам на 150 мільёнаў рублёў. З Сібіру сюды вязуць хутры, мяса й масла, з Уралу—жалеза, з Масквы, а даўней яшчэ і з Польшчы і Нямеччыны, вязьлі крамніну, з Каўказу—газу, з Астрахані—рыбу, з поўначы—лес, з Туркестану—баваўну, з Украіны—пшаніцу. Блізка ад Ніжняга-Ноўгараду каля места Балахны на Волзе будуецца моцная электрычная станцыя, якая будзе карыстацца, як апалам, запасамі лявольскіх пакладаў торфу. Гэтая станцыя будзе падаваць на ніжагародзкія фабрыкі электрычную энэргію, якая заменіць там апал. Дзякуючы гэтаму Ніжні-Ноўгарад у будучыне можа зрабіцца вялікім прамысловым асяродкам.

Па Ацэ пабудаваліся значна меншыя гарады, як па Волзе. Там ніжэй вусьця р. Вугры ляжыць,напрыклад, *Калуга* (43000 нас.), ціхі губэрскі горад з слаба разьвітай прамысловасьцю. Большую прамысловую вагу маюць месты, што ляжаць ніжэй па Ацэ ў суседзтве з сталіцай: *Серпухаў* (36 тыс. насельн.) з ткацкімі фабрыкамі і гарбарнямі, і *Каломна* (25 тыс. насельн.), ля сутокі Акі з Масквой-ракой, з вялікай вагона-будавальнай фабрыкай. З 1922 г. для гэтай фабрыкі пабудавана Кашырская электрычная станцыя, якая замяняе для Каломны апал электрычнай энэргіяй.

Ніжэй па Ацэ мала прамысловых гарадоў, і толькі на нізавіне яе, каля самага Ніжняга-Ноўгараду, дзе знаходзяць жалезную руду, пабудован горад *Паўлава*, які да рэволюцыі лічыўся сялом. У ваколіцах гэтага места вырабляюць замкі, нажы, відэльцы, нажнічкі і іншыя рэчы з жалеза і з сталі.

**Вазёрная краіна** ляжыць на паўночны захад ад Волскай вышнявіны і проста на поўнач ад Беларусі. З захаду лагчына Чудзкага возера і р. Наровы аддзяляе гэтую краіну ад Эстоніі, а на поўначы западзіна вялікіх вазёр (якіх?) і рэк, што злучаюць гэтыя вазёры паміж сабой і з Фінскай затокай (як завуцца гэтыя рэкі?), становіць мяжу між Вазёрнай краінай і Карэліяй.

На поўдні і паўднёвым усходзе краіна мае выгляд значнага ўзгор'я, якое атрымала назоў Валдайскіх гор і зьяўляецца самай паўночнай часткай Сярэдня-Рускага ўзвышша. На поўнач паверхня пакрысе зьніжаецца, і краіна пераходзіць у нізіну, роўную або ледзь хвалістую, балотную,

аднастайную. На поўначы, над западзінай вялікіх вазёр, гэтая раўніна раптам абрываецца прыступкай так званага глінту (глядзі агляд Эстоніі), які зьяўляецца берагам даўнага мора, што злучала калісь Фінскую затоку праз Ладаскае і Онескае вазёры з Белым морам. Рэкі, якія сьцякаюць з глінту ў Ладаскае возера (Волхаў, Сясь) або ў Няву, утвараюць тут парагі або вадаспады (напрыклад, Гасьцінапольскія парагі на р. Волхаў).

Краявід Вазёрнай краіны вельмі тыповы для краёў, пакрытых ледавіковым навалам. На поўдні краіна мае бязмаль-што горны выгляд. Высокія, а часамі стромкія ўзгоркі, нібы засеяныя ледавіковым каменьнем, зьмяняюцца далінамі рэк і многалічнымі вазёрнымі катлінамі.

У той час, як у Маскоўскай прамысловай краіне ад часу вялікага зьледзяненьня прайшло многа тысячагодзьдзяў, і рэкі пасьпелі глыбока ўрэзацца ў грунты, тут сьляды ледавіковага пэрыоду сьвяжэйшыя, рэкі яшчэ не пасьпелі стварыць паўсюды глыбокіх далін і часта маюць выгляд пратох паміж вазёрамі. Вазёры мала дзе пасьпелі перавярнуцца ў балоты і зарасьці травой і мохам, і паўсюды зьяўляюцца тыповай адзнакай краявіду. Апрача вялікіх вазёр: Чудзкага, Ладаскага і Онескага, лежачых на ўскрайках краіны, у жыцьці гэтай краіны вялікую ролю грае няглыбокае возера Ільмень, што ляжыць у самым асяродку яе і зьбірае ваду многіх рэк, якія сюды ўліваюцца з захаду (Шалонь), з паўдня (Ловаць) і з усходу (Мста). З Ільменя ў Ладагу цячэ магутны Волхаў, так што галоўныя рэкі краіны выносяць сваю ваду ў мора за дапамогай стоку Ладагі—Нявы. (Пералічы азначаныя на карце рэкі і вазёры краіны. Дзе знаходзяцца пачаткі Волгі?). Вазёры і балоты ўпарадкоўваюць колькасьць вады ў рэках, так што ўлетку гэныя рэкі не мялеюць гэтак моцна, як у Окска-Волскай краіне, або тым барджэй у Паўднёвай Маскоўшчыне.

Блізкасьць Балтыцкага мора робіць клімат Вазёрнай краіны крыху мякчэйшым, як у Сярэдняй Расіі. Ня гледзячы на вышэйшую географічную шырыню, сярэдняя тэмпэратура году тутака бязмаль такая самая, але зіма значна цяплейшая, а ўлетку ня бывае такой сьпякоты, як там.

Ленінград мае сярэднюю тэмпэратуру году $+3,7^{0}$, студзеня $-9,3^{0}$, ліпеня $+17,7^{0}$. Параўнай з адпаведнымі лічбамі для Масквы.

Увясну тут часьцей бываюць ранічныя маразы, ад якіх вельмі цярпіць збожжа і садовіна. Недахват летняй цяплыні і сьвятла адбіваецца на асаблівасьцях расьлінных згуртаваньняў. Праўда, і тут побач з хвоямі і елкамі расьце дуб, ясень, вяз, ліпа, але наагул лясы горшыя, як на Беларусі або ў Сярэдняй Расіі. Балоты займаюць тутака большы процант паверхні, як там.

Першапачатковая люднасьць Вазёрнай краіны, як і ў іншых краінах Маскоўшчыны, складалася з розных фінскіх пляменьняў надбалтыцкай галіны (водзь, весь, іжора, чудзь), аднак сюды вельмі даўно надышлі славянскія перасяленцы, галоўным чынам крывічы з Паўночнай Беларусі. Як у



межах Маскоўскай прамысловай краіны, гэтак і тут славяне мяшаліся з пачатковымі насельнікамі, прышчаплялі ім сваю культуру і мову, так што няма нічога дзіўнага, што нарэшце й тут утварыўся такі самы вялікарускі люд, як і там. Аднак у той час, як там прыродныя варункі былі досыць выгоднымі для гаспадаркі, тут славянскія перасяленцы знайшлі густыя лясы, непраходныя балоты, убогую глебу і няпрыветлівы клімат. З гэтай прычыны залюдненьне Вазёрнай краіны адбывалася марудней, пашырэньне земляробства і наагул славянскай культуры пасоўвалася наперад павольна, так што аж да цяперашняга часу ня ўсе тутэйшыя фіны пасьпелі авялікарусіцца, і некалькі дзесяткаў тысяч людзей ужываюць яшчэ фінскую мову.

Як у Сярэдняй Маскоўшчыне асяродкам славянскай колёнізацыі была з даўных часоў Масква, так і тут яшчэ раней утварыўся вялікарускі асяродак—Ноўгарад, які згуртаваў каля сябе вялікарусаў Вазёрнай краіны і зрабіўся магутнай самастойнай дзяржавай, якая панавала над гандлем па вялікай вадзяной дарозе „з Вараг у Грэкі“.

Аддзелены ад Маскоўскага княства непралазнымі імшарамі і высокімі Валдайскімі ўзгоркамі, Ноўгарад жыў самастойным культурным і палітычным жыцьцём, быў цесна злучаны з ганзэйскім хаўрусам нямецкіх гарадоў, гандляваў, багацеў і пашыраў славянскую культуру на крайняй поўначы Усходняй Эўропы ў глухой тайзе. Толькі ў XV в. Масква заўладала Вялікім Ноўгарадам; непакорных ноўгародцаў сілком перасялілі ў Сярэднюю Маскоўшчыну, а на іх месцы асадзілі падмаскоўных вялікарусаў. Вазёрная краіна пазбавілася сваёй самастойнасьці, сваёй гандлёвай вагі і свайго багацьця. У канцы XVII і ў пачатку XVIII в. маскоўцы зьвярнулі ўвагу на Вазёрную краіну, пабудавалі нарэшце каля вусьцяў Нявы новую гандлёвую прыстань—сучасны Ленінград,—які хутка зрабіўся новым асяродкам экономічнага і культурнага жыцьця краіны.

У XVIII веку праз Вазёрную краіну пралажылі важныя вадзяныя дарогі—каналы, якімі злучылі вадазбор галоўнай ракі Маскоўшчыны—Волгі—з вадазборам Балтыцкага мора.

Вышнявалоцкі канал злучыў Волгу з Нявой цераз Твярцу, Мсту, Волхаў і Ладаскае возера; Ціхвінскі шлях злучыў тыя-ж Волгу з Нявой цераз Малогу, Чагадошчу, Ціхвінку, Сясь і тое-ж Ладаскае возера; нарэшце Марыінскі вадзяны шлях, цяпер самы важны, цягнецца па Шаксьне, Белым возеры, Выцегры, Онескім возеры, Сьвіры і Ладазе.

З дапамогай каналаў рэкі Вазёрнага краю злучаны ў адзіную сецьвадзяных дарог з рэкамі рэшты Вялікарусі. Такім чынам краіна апынулася на галоўнай дарозе, па якой вывозіцца паволскае збожжа і тайговы лес у Заходнюю Эўропу. Гандаль маскоўскімі таварамі зьяўляецца асновай дабрабыту Вазёрнай краіны. З сваіх уласных тавараў краіна вывозіць лён, лес і драўляныя вырабы, бо лясоў тут захавалася яшчэ шмат. Па берагох рэк і вазёр часамі ўся дарослая люднасьць ваколічных вёсак займаецца валкай, перавозкай і сплавам лесу.

Ральніцтва ў краіне стаіць горай, як на Беларусі або ў Сярэдняй Маскоўшчыне. Трохпалёўка тут таксама пераважвае над іншымі спосабамі ральніцтва, але тут яшчэ вельмі пашыраны лядавы спосаб гаспадаркі (што гэта за спосаб?). Жыта тут яшчэ пануе над іншымі гатункамі збожжа, але расьце горай, як у нас, дрэнная тамака й бульба. Затое авёс, які не вымагае трывалага лета, не патрабуе шмат цяплыні, набывае тут большую вагу. Таксама вялікую карысьць селяніну дае лён. Лёнам засяваюць найлепшыя землі, яго вывозяць і за межы за дапамогай вандроўных гандляроў, купляючых ільняніну ад сялян. Асабліва многа лёну выраб-ляюць Пскоўская і Ноўгародзкая губэрні. Пасьля вайны плошча засеваў лёну значна зьменшылася.

Многалічныя вазёры краіны слынуць сваімі рыбнымі багацьцямі, між іншым корушкай, сігамі, сьняткамі і ласоскамі, лоў якіх дае важны даход ваколічным насельнікам.

Саматужная прамысловасьць тутака ня мае тэй вагі, як у Маскоўскай прамысловай краіне. (Толькі па Валдайскіх узгорках карыстаецца славай выраб мядзяных званочкаў ды ў пачатках Волгі саматугам выраб-ляюць на продаж боты). Затое адыход на працу ў гарады, асабліва ў Ленінград, адцягвае шмат працоўных рук ад ральніцтва. Шмат у якіх месцах краіны знаходзяць жалезную руду (вазёрную і балотную), а каля места Баравічаў трапляецца і буры вугаль, але фабрычная прамысловасьць карыстаецца прывозным апалам, пераважна ангельскім вугалем, і гуртуецца каля Ленінграду, куды гэты апал лягчэй за ўсё прывезьці. Толькі пільні і фабрыкі сернічак распаўсюджыліся блізка-што па ўсёй краіне.

Як і паўсюды ўва Ўсходняй Эўропе, вясковая люднасьць у Вазёрнай краіне пераважвае над гарадзкой. Вёскі тут маленькія, але чысьцейшыя, як у Сярэдняй Маскоўшчыне, часта па іх сустракаюцца й двохпавярховыя хаты. Гарады тут маюць болей заходня-эўропэйскіх адзнак, чым гарады Маскоўскай прамысловай краіны.

*Ленінград*, як асяродак Вазёрнай краіны, якая заўсёды бойка гандлявала з Заходняй Эўропай, мае выгляд чыста эўропэйскага, сучаснага гораду. Тут няма тэй самабытнасьці, якой адзначаецца Масква. Сярод насельнікаў Ленінграду спатыкаюцца прадстаўнікі ўсіх народаў Эўропы, асабліва Ўсходняй. Апрача маскоўцаў, украінцаў, беларусоў, жыдоў і палякоў тут жыве многа немцаў, фінляндцаў, эстонцаў, латышоў, татараў, швэдаў і г. д. Абапал простых, шырокіх, добра брукаваных вуліц тут цягнуцца аднастайныя, як кашары, пераважна трох-чатырох паверхавыя будынкі. Аднак і тут ёсьць шмат прыгожых сабораў (Ісакаўскі, Казанскі, Васкрасенскі), помнікаў (Пётру Першаму), даўнацарскіх палацаў (Зімовы, Мармуровы, Анічкін), тэатраў, будынкаў, вышэйшых культурных і асьветных устаноў і г. д. Акрасай гораду зьяўляецца Нява, у вусьці якой, на астравох дэльты ён пабудаваўся. Вялізныя харошыя масты, гранітныя надбярэжжы, параходны рух дадаюць шмат хараства



былай сталіцы Расійскай дзяржавы. На так званым Ленінградзкім востраве („баку"), які зьяўляецца найдаўнейшай часткай гораду, ёсьць шмат старасьвецкіх будынкаў XVIII веку, у тым ліку Петрапаўлаўская крэпасьць і шэраг іншых. Культурныя ўстановы (Унівэрсытэт, Горны Інстытут, Акадэмія Мастацтваў) гуртуюцца на Васілеўскім востраве. Драбнейшыя астравы зьяўляюцца прыгожымі паркамі або былымі дачнымі прадмесьцямі. Ленінградзкая прыстань на Фінскай затоцы ёсьць найбліжэйшай морскай прыстанньню для ўсёй Сярэдняй Маскоўшчыны. З гэтай прычыны Ленінград зрабіўся найважнейшым асяродкам замежнага гандлю для ўсёй Маскоўшчыны. (Перад вайной гандлёвы абарот Ленінградзкай прыстані перавышаў 265 мільёнаў рублёў золатам. Параўнай з Лёндонам, Гамбургам, Лівэрпулем, Рыгай і г. д.).

Выгоднае палажэньне вусьцяў Нявы зьвярнула на сябе ўвагу Пётры І, які й залажыў Ленінград у 1712 годзе. Спачатку расійскі ўрад сілком зганяў сюды працаўнікоў, гандляроў і рамесьнікаў з усіх кутоў Маскоўшчыны; потым народ і сам зразумеў выгоды жыцьця ў гэтым горадзе, і люднасьць яго пачала хутка ўзрастаць. У 1869 г. тут было ўжо 667000 насельнікаў, у 1897—ужо 1267000, а ў 1914 гэты лік дасягнуў 2300000, так што Ленінград па колькасьці насельнікаў займаў 7-ае месца ў сьвеце. Вайна спыніла замежны гандаль Расіі і выклікала заняпад Ленінграду. У 1920 г. тут заставалася ўжо толькі 906000 нас. Але цяпер іх лік зноў перавысіў мільён.

Да рэволюцыі Ленінград быў адміністрацыйным асяродкам, сталіцай Расійскай дзяржавы; самая рэволюцыя тут распачалася і адгэтуль заліла сваімі хвалямі ўсю Ўсходнюю Эўропу.

Як прамысловы асяродак, Ленінград мае шмат фабрык, на якіх перад вайной працавала 150000 чалавек. Тут апрацоўвалася бавоўна, воўна, ільняніна; тут існавала шмат гісэрань, машына-будавальных, табачных фабрык, паперань, цукраварань, фабрык сьвечак, мылаварань і г. д. Каля Ленінграду будуецца цяпер вялікая электрычная станцыя, якая будзе карыстацца, як апалам, пакладамі торфу і будзе перадаваць па дроце электрычную энэргію замест апалу на ленінградзкія фабрыкі.

Як у культурным асяродку, тутака згуртаваліся розныя вышэйшыя навуковыя ўстановы (Акадэмія Навук), музэі, вышэйшыя школы (Унівэрсытэт і асабліва тэхнічныя вышэйшыя школы), бібліотэкі. (Публічная бібліотэка Ленінграду мае больш за мільён тамоў кніг і лічыцца 3-яй у Эўропе).

Як у ваколіцах Масквы, гэтак і навокала Ленінграду пабудаваліся дачныя месты з прыгожымі паркамі, чароўнымі фонтанамі і вялізнымі палацамі: Дзецкае сяло (даўней Царскае, 15000 насельн.), Пэтэргоф, Паўлаўск (цяпер Слуцк), Гатчына (цяпер Троцк, 12249 н.), Ораніенбаум і г. д. У прадмесьці Пулкаве знаходзіцца слынная обсэрваторыя, у Колпіне (12000 нас.) буйныя машына-будавальныя фабрыкі. На Фінскай затоцы на востраве Кот-

ліне ляжыць *Кроништат* (30000 нас.), важная морская крэпасьць, якая засланяе Ленінград ад наступу з мора.

Старадаўны *Ноўгарад* (28000 нас.), лежачы каля выйсьця р. Волхаву з Ільменскага возера, меў у сярэдня вякі каля 400000 насельнікаў. Цяпер гэта ціхі губэрскі гарадок. Толькі руіны старой крэпасьці „дзяцінца“, старасьвецкі Софійскі сабор ды іншыя помнікі сьведчаць аб мінулай магутнасьці гэтай сталіцы сярэднявяковай славянскай рэспублікі. На поўдзень ад Ільменя ляжыць *Старая-Руса*, здароўніца з салонымі крыніцамі, якія скарыстаны для лекарскіх мэт.

*Пскоў* (37000 насельн.), як і Ноўгарад, у сярэдня вякі быў незалежнай рэспублікай, а цяпер зьяўляецца асяродкам гандлю ільнянінай. Як і ў Ноўгарадзе, тут захавалася шмат старасьвецкіх будынкаў і руіны „дзяцінца“.



Мал. 98.—Пэтэргоф. Фонтаны каля царскага палацу.

Каля ст. Званка, Паўночн. чыгунак, згодна пляну электрыфікацыі СССР будзе пабудована вялізная электрычная станцыя, якая будзе замест апалу карыстацца сілай падаючай вады ракі Волхаў. Такія-ж станцыі павінны пабудавацца на рацэ Сьвір каля парогаў гэтай ракі. Усе гэтыя станцыі мусяць зусім забясьпечыць Ленінградзкі край таннай энэргіяй, дзякуючы якой фабрыкі гэтага краю будуць абыходзіцца без замежнага вугалю. Гэтыя станцыі апроч таго зьменяць варункі дастаўкі лесу і іншых тавараў па Марыінскім вадзяным шляху ў Ленінград, бо мэханізуюць працу на перавалачных пунктах гэтай дарогі.



**Усходня-Эўропэйская тайга** ляжыць у вадазборы Паўночнай Дзьвіны і паўночных прытокаў Волгі. Краіна гэтая адзначаецца роўнасьцю паверхні, і нават на вадападзеле між Волскім і Беламорскім вадазборамі знаходзяцца толькі нізкія ўзгоркі, якія атрымалі назоў Паўночных грудоў (увалаў). Як на поўнач, гэтак і на поўдзень ад гэтых грудоў паверхня зьніжаецца вельмі павольна, ледзь прыметна, на паверхні ляжаць мяккія морэнавыя адклады, а на поўнач ад прытокі Паўночнай Дзьвіны—Вычагды—іх замяняюць адклады Ледаватага мора, якое пакрывала калісь крайнюю поўнач Усходняй Эўропы.

Клімат Усходня-Эўропэйскай тайгі параўнаўча халодны, жорсткі, сухі. Праўда, улетку яшчэ хапае цяплыні нават для дасьпяваньня збожжа, але затое зіма паўсюды вельмі халодная, марозная. Сьнегавы насьціл пакрывае краіну ў працягу 5-6 месяцаў. Халодная пара году цягнецца каля 6 месяцаў, а часам і болей.

Места Вусьць-Сысольск, на ўсходзе краіны, мае сярэднюю тэмпэратуру году $+0{,}3^{0}$, сярэднюю студзеня—$15{,}2^{0}$, ліпеня $+16{,}6^{0}$. На поўначы Архангельск мае такую самую сярэднюю тэмпэратуру году, але дзякуючы суседзтву Белага мора, там лета халаднейшае (ліпень $+15{,}8^{0}$), а зіма не такая марозная (студзень—$13{,}7^{0}$).

У час кароткага лета не пасьпяваюць адкрасаваць і прынесьці плады звычайныя ліставыя дрэвы; з ліставых дрэў толькі бяроза, дзе-ні-дзе вольха ды кволая рабіна могуць вытрымаць тутэйшы клімат. Галоўнымі расьлінамі краю зьяўляюцца іглastыя дрэвы: хвоя, елка, сібірская мадрына, на ўсходзе яшчэ сібірская ельніца, а на крайнім усходзе сібірская кядровая хвоя, ядобнае насеньне якой пад назовам кядровых арэшкаў паўсюды прадаецца па крамах і рынках. Ня вельмі высокія, рэдкія й кволыя, пакрытыя лішаямі дрэвы тайгі нібы згарбелі, выстараліся без пары. Паўсюды сярод лясоў сустракаюцца імшары, шмат ёсьць такіх непралазных немярэчаў, па якіх ня ступала чалавечая нага. Лясы пакрываюць большую частку краіны і зьяўляюцца галоўным багацьцем яе.

Па глухіх пушчах і немярэчах да цяперашняга часу жыве яшчэ шмат рознастайных жывёл: ласёў, мядзьведзяў, ваўкоў, лісаў, рысяў, куніц, гарнастаяў і расамах. Асабліва-ж многа вавёрак і лясных птушак: глушцоў, цецярукоў, рабкоў.

Затое чалавек у тайзе прымае меншы ўдзел у краявідзе, чымся ў тых краінах, якія ляжаць на поўдзень адсюль. На ўсходзе краіны на кожнага чалавека прыпадае квадратовы кілёмэтр, або сто й нават болей дзесяцін зямлі. Балотныя, няпрыступныя вадападзелы залюднены вельмі рэдка або й зусім не залюднены. Крышку гусьцей жывуць людзі каля рэк, якія граюць вельмі важную ролю ў жыцьці краіны. Поплавы каля рэк даюць найлепшую спажыву дамовай жывёле; рыбныя багацьці даюць яду чалавеку; як узімку, гэтак і ўлетку рэкі зьяўляюцца найлепшымі дарогамі; па рэках

адбывалася колёнізацыя тайгі славянамі; па рэках і цяпер вывозяць за межы галоўнае багацьце краіны—лес.

Ня гледзячы на малую колькасьць ападкаў, выпадаючых у краіне, рэкі тутэйшыя вельмі поўнаводныя, шырокія, глыбокія. Замярзаюць яны на 5-6 і болей месяцаў; увясну, дзякуючы вялікай колькасьці раптам раставаючага сьнегу і лёдавым заторам, яны вельмі шырока разьліваюцца, але ня вельмі мялеюць і ўлетку, бо выпарэньне вады тут малое, а балоты пакрысе жывяць рэкі сваёй вадой у працягу ўсёй навігацыі. Апрача таго, лясы, якіх тут вельмі многа, рэгулююць колькасьць вады ў рэках, бо дапамагаюць павольнаму прасякненьню сьнегавой і дажджавой вады ў грунт.

Галоўная рака краіны—Паўночная Дзьвіна—складаецца з дзьвёх рэк: Сухоны, якая выцякае з Кубенскага возера, і Югу з прытокай Лузай. Ніжэй сутокі Сухоны й Югу Паўночная Дзьвіна прымае яшчэ прытоку Вычагду і робіцца магутнай ракой болей за вярсту ўшыркі. У сваёй нізавіне, прыняўшы яшчэ некалькі буйных прытокаў, Паўночная Дзьвіна дасягае ўшыркі 3-5-7 і болей вёрст і нарэшце ўліваецца ў Дзьвінскую затоку (т. зв. губу) Белага мора. Для тайгі Паўночнай Маскоўшчыны Паўночная Дзьвіна мае такую-ж вагу, як Волга для Сярэдняй і Паўднёвай Маскоўшчыны. Па ёй праз Архангельск вывозіцца за межы лес, па ёй адбываюцца зносіны паміж асобнымі часткамі краіны. Суднаходны канал злучае Сухону з Шаксной, і такім спосабам злучае яе з Волскім вадазборам і рэчнай сецьцю Вазёрнай краіны (бо Шаксна злучана з Онескім возерам). Вышнявіны Югу і Лузы блізка падыходзяць да пачаткаў рэк Волскага вадазбору (Унжы, Вятлугі), а прытокі Вычагды толькі нізкім вадападзелам аддзелены ад прытокаў Камы і Вяткі.

Ужо ў даўныя часы цераз гэтыя вадападзелы або волакі, як іх тады звалі, перацягвалі тавары даўныя гандляры, што разьяжджалі ў сваіх чаўнох па Паўночнай Дзьвіне і па Волскіх прытоках. Сухона была галоўнай дарогай, па якой у тайгу пранікалі перасяленцы—славяне з Вялікага Ноўгараду. Шукаючы нечапаных лясоў, багатых на хутровага зьвера, ноўгародзкія зьвералоўцы плылі на ўсход па Сухоне, потым або на поўдзень па Югу і Лузе, па Вятцы і Каме, або на поўнач па Паўночнай Дзьвіне да берагоў Белага мора.

За зьвералоўцамі ішлі земляробы, якія пабудавалі там свае вёскі і гарады, зваявалі першапачатковых насельнікаў і далучылі ўсю краіну да ўладаньняў Вялікага Ноўгараду. У XV в. тайга пераходзіць пад уладу Масквы, але сувязь яе з Масквой спачатку была вельмі слабая, і толькі ў XVII в. сюды, у бязьлюдныя лясныя нетры, пачалі перасяляцца стараверы, якія хаваліся тут ад прасьледаваньняў і ўціску на іх веру з боку маскоўскага ўраду. Нават каля самай Волгі па берагох яе левых прытокаў аж у XIX в. трымаліся патаемныя кляштары старавераў, потым разбураныя расійскім урадам.



Сярод сучасных насельнікаў тайгі пераважваюць расійцы, якія або зьмяшаліся з першапачатковымі тубыльцамі, або адціснулі іх у глухія лясы і тундры на поўнач і ўсход. Тутэйшыя вялікарусы трохі адразьняюцца ад сярэдніх і паўднёвых маскоўцаў. Яны захавалі болей старасьветчыны ў сваіх поглядах і звычаях, гаворка іх адзначаецца „оканьнем“, выразным вымаўленьнем безнаціскнога „о“. (Паўднёвыя вялікарусы, як і беларусы, гавораць у такіх выпадках „а“, напр., „Масква“, а не „Москва“).

На захадзе краіны ў вадазборы Паўночнай Дзьвіны мясцовыя вялікарусы адзначаюцца высокім ростам, моцным целаскладам, самапэўнасьцю, рухавасьцю, прыгожасьцю. На паўднёвым усходзе па Вятцы жывуць вялікарусы ніжэйшага росту, слабыя, хваравітыя на выгляд. Хаты вялікарусаў у вадазборы Дзьвіны вялікія, адмыслова акрашаныя разьбой; у сярэдзіне хаты чыста, прыгожа, бязмаль гарадзкая абстаноўка. У вяцкіх вялікарусаў хаты брудныя, маленькія, крытыя саломай; у пакоях цемра, убоства, гразь. Адсталасьць і беднасьць вяцічаў тлумачаць большым пашырэньнем прыгону ў іх землях, а ніжэйшы рост іх ставяць у залежнасьць ад большай падмешкі фінскай крыві.

Побач з вяцкімі вялікарусамі яшчэ й цяпер жыве шмат даўных насельнікаў краю—фінаў-вацякоў, якія вельмі падобны па абліччы да сваіх вялікарускіх суседзяў, але адразьняюцца ад іх галоўным чынам сваёй вацяцкай мовай фінскага кораню. Яны таксама нізкія, пахілыя, маўклівыя, жывуць бедна, у цемры і брудзе. Паводле веры яны лічацца праваслаўнымі, але захавалі шмат паганскіх звычаяў і поглядаў.

Поўную процілежнасьць ім становяць зыране, другі фінскі народ, як да гэтага часу складае большасьць насяленьня ў вадазборы Вычагды. Яны сярэдняга або й высокага росту, здаровыя, здольныя, падобныя да вялікарусаў Дзьвінскага вадазбору. Зыране жывуць у чыстых, іншы раз двохпаверхавых хатах, любяць мыцца і каля хаты заўсёды будуюць асобную лазьню. Зыране добрыя паляўнічыя, лоўкія гандляры, але кепскія земляробы. Паводле мовы як зыране, гэтак і вацякі належаць да прыуральскай галіны фінскага племя.

Як зыране, гэтак і вацякі атрымалі цяпер самаўрад. Залюдненыя імі землі складаюць самаўрадныя рэспублікі Воцкую (29 тыс. кв. клм , 705 тыс. насельн.) і Зыранскую (275 тыс. кв. клм., 203 тыс. насельнікаў).

Усе часткі Ўсходня-Эўропэйскай тайгі вывозяць лес і продукты лясной гаспадаркі: дзёгаць, смалу, шпігінар. Аднак вялікая адлегласьць гэтай краіны ад краін, патрабуючых дрэва, перашкаджае лясному гандлю. У Заходняй Эўропе болей куплялі лясных матар'ялаў з Беларусі і Фінска-Скандынаўскага масыву, бо прывозіць лес з тайгі праз Архангельск і Ледаватае мора было нявыгодна: дарога каштавала болей, як самы матар'ял. Аднак у апошнія часы зьнішчэньне лясоў Сярэдняй Эўропы прымусіла зьвярнуць болей увагі на лясы далёкай тайгі. Цяпер лясныя промыслы могуць лічыцца галоўным заняткам люднасьці тайгі. Ральніцтва тут

адыходзіць на другое месца. На поўначы, на нізавіне Дзьвіны, і на ўсходзе, у вадазборы Вычагды, збожжа зусім дрэнна расьце і часта не дасьпявае. На паўднёвым захадзе сеюць жыта, авёс, бульбу, лён, як і ў Вазёрнай краіне, але маюць ад гэтага мала карысьці, і калі сяляне жывуць досыць заможна, дык дзякуючы іншым галінам гаспадаркі (лясным заняткам, малачарству і г. д.). Найвялікшую вагу мае ральніцтва на паўднёвым усходзе, бо там найлепшыя грунты і найцяплейшае лета. З гэтай прычыны там можна сеяць, апрача жыта і аўсу, нават пшаніцу і мецъ збожжа ў дастатку, тады як у рэшце краіны свайго збожжа не хапае. Трохпалёўка на паўднёвым усходзе, у вадазборы Вяткі, пануе над іншымі спосабамі ральніцтва,у іншых месцах пераважвае лядавы спосаб.



Мал. 99.—Пільня каля Архангельску.

Там дзе не хапае збожжа, асабліва на Сухоне і па нізавіне Паўночнай Дзьвіны, па багатых поплавах пасьвяць найлепшае малочнае быдла. Вялікай славай карыстаецца, напрыклад, халмагорскае быдла каля вусьцяў Паўночнай Дзьвіны. Масла і сыр вывозяцца ў Ленінград і Маскву.

У Зыранскай тайзе, у вадазборы Вычагды, галоўным заняткам можна лічыць паляваньне. Ледзь пачнуцца маразы, як зыране, згуртаваўшыся ў маленькія суполкі, пакідаюць свае вёскі і йдуць у лясы, дзе будуюць сабе часовыя хаты і па некалькі месяцаў займаюцца выключна ловам вавёрак, лісаў, кун, расамах і мядзьведзяў. На вёсках часта застаюцца толькі жанчыны ды дзеці.

На ўзьбярэжжы Белага мора і на нізавіне Паўночнай Дзьвіны, дзе жывуць так званыя паморы, тыповыя паўночныя вялікарусы, вельмі важным



заняткам зьяўляецца рыбацтва. Паўночная Дзьвіна багата навагай і сёмгай, а ў Белым моры вельмі многа селядцоў. Паморы з дзіцячых гадоў прызвычаіліся да рыбнага лову. Яны сьмела выяжджаюць і ў адкрытае мора, дзе б'юць маржакоў, нэрп дзеля іх лою і скуры, бялугу (жывёлу, падобную да дэльфінаў) і г. д. Часта паморы ганяюцца за кітамі па Ледаватым моры, забіраюцца на скалаватыя астравочкі гэтага мора, палююць там морскіх птушак, у тым ліку на гаг, качак, гусей (дзе яшчэ ловяць гаг?).

Адным з галоўных асяродкаў рыбацтва на Белым моры зьяўляюцца Салавецкія астравы, залюдненыя чарняцамі Салавецкага кляштару. У час рэлігійных змаганьняў на Маскоўшчыне стараверы 8 гадоў баранілі гэты кляштар ад урадовага войска.

Галоўнай прыстанью краіны ёсьць *Архангельск* (54 тыс. насельн.), што ляжыць у вусьці Паўночнай Дзьвіны. Праз гэты горад з тайгі вязуць дрэва, смалу, дзёгаць, шпігінар, з Сухоны лён, з-пад Вяткі збожжа і г. д. Тут існуе шмат пільняў і некалькі іншых фабрык. Асабліва вялікую вагу набываў Архангельск у часы заняпаду Балтыцкіх прыстань у часы войн, калі Маскоўшчына магла вывозіць свае тавары толькі праз Белае мора. Так было ў XVI, XVIII в., калі яшчэ нябыло Ленінграду; тое-ж было ў часы Напалеонаўскіх войн і ў час мінулай сусьветнай вайны.

На паўднёвым захадзе ў вадазборы Сухоны ляжыць на скрыжаваньні чыгунак Масква-Архагельск і Ленінград-Вятка-Перм *Волагда* (53 т. насельн.), асяродак унутранага гандлю краіны, а на паўднёвым усходзе на аднаназоўнай рацэ пабудавалася *Вятка* (52 тыс. насельн.), старадаўная колёнія Вялікага Ноўгараду, цяпер галоўны пункт загатоўкі збожжа для архангельскіх рыбакоў.

**Тундра** крайняга паўночнага ўсходу Эўропы, у вадазборы рэк Пячоры і Мезені, у канцы ледавіковага пэрыоду была дном Ледаватага мора. Мяккія гляістыя і пескавыя адклады гэтага мора роўным паземным пластом адклаліся ў гэтай надзвычайна роўнай нізіне. Толькі па сярэдзіне краіны з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход на Пячорска-Мезенскім вадападзеле цягнецца шэраг нявысокіх узгоркаў, так званы Тыманскі груд. Гэта старадаўны ланцуг зморшчавых гор, адгор'е Уральскіх гор, моцна размытае вадой і разьедзенае выпятрэньнем. У ледавіковы пэрыод гэты груд быў востравам або ланцугом астравоў, пакрытым грубым пластом лёду, як і ўсё сухазем'е Паўночнай Эўропы. Яшчэ й цяпер самы далёкі паўночна-заходні аддзел Тыманскага груду—паўвостраў Канін—аддзяляецца ад галоўнай часткі груду морскай затокай (Чэскай губой). Паўвостраў Канін даўней быў востравам. Пярэсмык, які злучае яго з контынэнтам, зьяўляецца нізінай і пакрыт морскімі адкладамі. Гадоў 100 назад на гэтым пярэсмыку яшчэ была апошняя рэштка мора—возера, з якога рэкі адначасна выцякалі на захад у Белае мора і на ўсход у Чэскую губу, так што навокала Каніна можна было скрозь праехаць вадой. (Які кавалак сухазем'я

да цяперашняга часу застаўся востравам Ледаватага мора каля берагоў тундры на захад ад вусьцяў Пячоры і на ўсход ад Каніна?).

Клімат Усходня-Эўропэйскай тундры халодны, хмуры, няпрыемны. Нават і лета тутака халоднае, вельмі кароткае, нават і ўлетку здараюцца маразы. Зіма нязвычайна сьцюдзёная; сьнегавы насьціл трымаецца болей за 6 месяцаў, рэкі скуты лёдам каля 7 месяцаў; каля берагу і Ледаватае мора, як і Белае, на паўгода пакрываецца лёдам.

Сярэдняя тэмпэратура году паўсюды ніжэй за 0°, а каля вусьцяў Пячоры ніжэй за—6°. Самы цёплы месяц мае ў сярэднім +6,+8°, а самы халодны—14°,—22°.

Ападкаў у тундры выпадае мала (меней за 300 мілім.), але параваньне такое малое, што вільгаці заўсёды болей, як трэба. Вільгацьцю паўсюды насякнены грунты і на мяккіх грунтох скрозь утварыліся вялізныя, бязьмежныя балоты. Грунты прамярзаюць на многа аршын глыбіні, а ўлетку пасьпяваюць адтаваць толькі на самай паверхні. На глыбіні 10-30 вяршкоў ляжыць вечнамёрзлы грунт, які перашкаджае пранікаць у зямлю карэньню дрэўных расьлін. З гэтай прычыны лясоў тут няма, а галоўным расьлінным згуртаваньнем зьяўляюцца імшары, пакрытыя тарфяным мохам, журавінамі, расіцай. Характэрная паўночная ягада пабоч з журавінай—марошка. Прухнучы мох пакрысе ператвараецца ў торф, з якога скалаліся цэлыя гарбавінкі так званай „бугрыстай тундры“. Найлепшымі куточкамі тундры зьяўляюцца засланёныя ўзгоркамі сухія схілы, пакрытыя пярэстым дываном красак і траў, падобным да альпійскіх лугоў. Як і ў Лапаршчыне, тут захавалася яшчэ шмат падканцавосных жывёл: лемінгаў, блакітных лісаў, сьнежных соў, пардваў або белых курапат. Улетку сюды прылятаюць з выраю мільёны качак, гусей, лебядзей і іншых балотных



Мал. 100.—Самаеды.



і вадзяных птушак. Мошкі і камары становяць кару насельнікаў тундры, мучаць жывёлу і не даюць адпачынку чалавеку. Рэкі краіны багаты рыбай, і рыбацтва дае галоўныя сродкі да жыцьця. З гэтай прычыны і насяленьне гуртуецца каля рэк, тым барджэй, што рэкі зьяўляюцца адзіным надзейным шляхам для зносін улетку. На вадападзелах насельнікі гадуюць паўночных аленяў, якія, на жаль, часта сотнямі мруць ад пошасных хвароб. З скуры аленяў выраўляюць замшу, лепшыя гатункі якой вывозяць у Сярэднюю Расію.

Першапачатковыя насельнікі тундры—самаеды, фінскага племя—нізкага росту, вузкавокія, жорсткавалосыя, з нізкім лобам, плескаватым носам і жоўтай скурай. Яны жывуць у так званых „чумах“, складзеных з простых кіёў, убітых у зямлю, зьвязаных наверсе канцамі і абцягнутых скурай аленяў. З аленевых скур робяць самаеды і вопратку: кашулю хутрам унутр і „маліцу“—кашулю з нагавіцамі і хутрам знадворку.

Самаеды вядуць бадзяжны спосаб жыцьця, вандруюць з аленямі па тундры, жывяцца мясам і малаком гэтых аленяў. Па веры самаеды лічацца праваслаўнымі, але трымаюцца паганскіх паглядаў і побач з крыжам носяць на сабе фігуры паганскіх бажкоў. Гультаяватыя, бедныя, цёмныя, брудныя, прыхільныя да п'янства, самаеды, як іх алені, патроху вымiраюць ад пошасных хвароб. Патроху іх выціскаюць зыране, якія заўладалі ў



Мал. 101.—Места Мезень у тундры.

вышнявіне Пячоры бліска-што ўсімі аленямі, і расійцы-стараверы, якія захапілі ўсе рыбныя промыслы на Пячоры.

Гарадоў у тундры мала, і яны маюць характар дробных бедных мястэчак. (Глядзі мал. 101).

## У р а л.

(Азнач паводле карты географічнае палажэньне Уральскага горнага ўкладу. Якія астравы Ледаватага мора лічыш магчымым прызнаць за працяг Уральскіх гор контынэнту? Якія моры—часткі Ледаватага—атачаюць гэтыя астравы? Якія пратокі аддзяляюць гэтыя астравы адзін ад аднаго і ад контынэнту?)

Уральскі горны ланцуг зьяўляецца найдаўжэйшым горным укладам нашае часткі сьвету. Пачынаецца ён пад вечным лёдам Ледаватага мора і цягнецца аж да напаленых сонцам пустынь Арала-Касьпійскай катліны. Спачатку (на астравох Новай Зямлі) ён выгінаецца на захад, потым (на поўнач ад падканцавоснага кола) выгінаецца на ўсход, далей — зноў на захад і нарэшце (на поўдні) — зноў на ўсход. На ўсім сваім працягу ён мае аднальковую геолёгічную будову. Пасярэдзіне цягнецца пас крышталічных спрадвечных скал: гранітаў, гнэйсаў, крышталічных лупнякоў; абапал гэтага пасу цягнуцца йстужкі пазьнейшых, пераважна пластовых адкладаў: вапнякоў, маргляў. Урал мае выразную будову зморшчавых гор, але зморшчыліся тут толькі самыя даўныя пласты (азойскай і палеозойскай эр да каменна-вугальнай эпохі ўключна), а пазьнейшыя адклады ляжаць паземна. Адгэтуль відаць, што Урал утварыўся вельмі даўно, калі яшчэ ня было пазьнейшых адкладаў, бо йначай і яны скл͏аліся-б у маршчыны.

Зморшчы, з якіх складаецца Уральскі ланцуг, цягнуцца роўналежна з поўначы на поўдзень. Усходнія з іх моцна сьціснуты з бакоў, адзначаюцца большай вышынёй і стромкасьцю, чымся заходнія. Шмат у якіх месцах яны патрэскаліся, а з шчылін, якія такім спосабам утварыліся, павылівалася цякучая лява. З гэтай лявы стварыліся жылы і цэлыя горы выбуховых скал, у якіх галоўным чынам і залягаюць багатыя паклады карысных мінэралаў, якімі славяцца ўсходнія пакаты Уралу. Заходнія зморшчы нявысокія, шырокія і адхонныя; пакрысе яны пераходзяць у асобныя парослыя лесам плоскаўзвышшы, так званыя пармы, пакрытыя паземнымі пластамі маргляў і пескавікоў.

Здаецца дзіўным самотнае палажэньне Уралу, адсутнасьць сувязі з іншымі зморшчавымі гарамі, бо звычайна зморшчавыя ланцугі становяць працяг адзін аднаго, пераходзіць адзін у другі. Аднак дакладнае азнаямленьне з Уралам паказвае, што гэта толькі руіны магутнага горнага ўкладу. Самыя ўсходнія зморшчы Уралу зьнішчаны нядаўна, параўнаўча з узростам Уралу, размыты вадой мора, што існавала на месцы сучаснай Заходня-Сібірскай нізіны. Некаторыя вучоныя гавораць, што даўней Урал цягнуўся далёка на поўдзень, быў злучаны з Цянь-Шанем і іншымі гарамі



Азіі. Як старадаўны, моцна размыты і выпятрэлы ланцуг, Урал мала дзе дасягае значнай вышыні. Найвышэйшая гара яго (Тэльпос-Іс) дасягае 1656 м. н. р. м., праходы ляжаць паўсюды нізка, а ў сярэдняй частцы ўздымаюцца толькі на 300 м. н. р. м. і побач з суседнімі плоскаўзвышшамі Ўсходняй Эўропы маюць выгляд невялікіх узгоркаў. Вадападзел між рэкамі Эўропы і Сібіру праходзіць па сярэднім крышталічным пасе ланцуга. На ўсход ад вадападзелу ўсходні схіл (складзены з стромкіх, моцна сьціснутых зморшчаў) стромка спадае ў бок роўнай Заходня-Сібірскай нізіны; заходні схіл наадварот—павольна зьніжаецца, так што трудна прымеціць, дзе канчаецца Ўсходня-Эўропэйская раўніна і пачынаюцца першыя ўзгоркі Уральскага ўкладу. З гэтае прычыны Урал звычайна далучаюць да Эўропы, а не да Азіі, ад якой ён выразна адмяжоўваецца. Аднак і ўсходні схіл Уралу можна толькі ўмоўна лічыць мяжой Эўропы і Азіі. Па той бок яго пануюць такія-ж прыродныя варункі, як і ў Эўропе. Уральскі ланцуг занізкі нават для таго, каб затрымаць усю вільгаць заходніх вятроў, якія пануюць абапал яго. Праўда, на яго схілах выпадае болей ападкаў, чымся ў суседніх старонках, але й Заходні Сібір абвадняецца галоўным чынам тымі дажджамі, якія пераходзяць цераз Урал з захаду.

Урал, аднак, можна лічыць усходняй мяжой уплываў Гольфштрому. На захад ад Уралу сярэдняя тэмпэратура году пад уплывам Гольфштрому вышэй, чымся ў іншых мясцовасьцях, ляжачых на такой самай шырыні. На ўсход ад Уралу тэмпэратура году ніжэй за сярэднюю тэмпэратуру ўсіх мясцовасьцяй, ляжачых на такой самай шырыні. Урал, як кажуць, ляжыць на ізоаномале 0°. На захад ад яго ляжаць нібы перагрэтыя краіны, на ўсход—нібы перасьцюджаныя.

Расьлінныя згуртаваньні мясцовасьцяй, што ляжаць абапал Уралу, бязмаль аднальковыя. Пасы гэтых згуртаваньняў у Сібіры складаюць працягі адпаведных пасаў Эўропы. Толькі самы хрыбет Уралу адразьняецца ад суседніх старонак расьліннасьцю, тыповай для вышэйшых шырынь. (Чаму?)

Народы Эўропы і Сібіру лёгка пераходзілі цераз Уральскія нізкія праходы. Як ува Ўсходняй Эўропе, гэтак і ў Заходнім Сібіры абапал Уралу цяпер жывуць пераважна маскоўцы, якія патроху выціскаюць першапачатковых насельнікаў, належачых да фінскіх і туркскіх пляменьняў. Абапал Уралу на аднальковай шырыні, у аднальковых расьлінных пасах пануюць і аднальковыя заняткі насельнікаў. Толькі самы ланцуг і яго прыгор'і, дзякуючы вялізным запасам мінэральнага багацьця, зьяўляецца старонкай, у якой побач з сельскімі заняткамі пашырыліся нетракапальная і фабрычная прамысловасьць і гандаль.

У XVIII веку Урал, як край, багаты жалезнай рудой і дрэўным апалам, быў галоўным жалезаздабывальным краем Эўропы. Ад таго-ж часу, як жалеза пачалі выплаўляць за дапамогай каменнага вугалю, значэньне

Уралу зьменшылася, бо каменнага вугалю тутака мала, а колькасьць лясоў штo-год зьмяншаецца. Апрача таго, Уралу шкодзіць яго далячыня ад культурных краёў Эўропы.

Адзіны з геолёгічнага погляду, Урал можа быць падзелены на 4 географічныя краіны ў залежнасьці ад географічнай шырыні, клімату, колькасьці падземных багацьцяў і іншых прыродных асаблівасьцяй: 1) астравы Новая Зямля і Вайгач разам з грудом Пай-Хой на контынэнце могуць разглядацца, як першая з гэтых краін *Падканцавосны Урал;* 2) ад Карскага мора да $60^0$ паўночн. шыр. цягнецца так зв. *Паўночны Урал*; 3) далей да шырыні $55^1/_2{}^0$—*Сярэдні* або *Рудны Урал* і 4) адтуль на поўдзень —*Башкірскі* або *Паўднёвы Урал.*

**Падканцавосны Урал** зьяўляецца нібы адгор‘ем галоўнага ланцуга. Каля $68^0$ паўн. шырыні ад Уралу аддзяляецца ў кірунку на паўночны захад груд Пай-Хой. Працягам гэтага груду ёсьць горы вострава Вайгач. Гэта паўднёвая частка Падканцавоснага Уралу, вярхі якой нідзе не дасягаюць вышыні сьнегавой мяжы. Зусім іншы выгляд маюць горы Новай Зямлі, якая можа лічыцца працягам Вайгачу. Там, асабліва на паўночным востраве Новай Зямлі, вярхі гор дасягаюць 1400 і болей мэтраў увышкі. Горы выглядаюць хмурымі і дзікімі, завінуты хмарамі, а па вярхох пакрыты вечным сьнегам. Магутныя ледавікі спаўзаюць адтуль беспасрэдна ў Карскае і Барэнцава моры. Вялізныя адломкі такіх ледавікоў, цэлыя лёдавыя горы заўсёды плаваюць па Карскім моры. Іншы раз, нават улетку, з-за іх нельга праехаць па гэтым моры. Наадварот, заходнія берагі Новай Зямлі знаходзяцца яшчэ пад слабым уплывам Гольфштрому і ўлетку не замярзаюць. Заходнія берагі Новай Зямлі пашматаны глыбокімі вузкімі затокамі, вельмі падобнымі да фіордаў Норвэгіі, усходнія—зрывістыя, недаступныя, заўсёды забітыя лёдам.

Клімат краіны вельмі халодны (сярэдняя гадавая тэмпэратура каля пратокі Маточкін Шар—$8^0$), так што мала якія расьліны могуць вытрымаць тамтэйшыя маразы. Здалёку скалы Новай Зямлі, ніжэй сьнегавой мяжы, здаюцца зусім голымі, але там яшчэ трапляюцца лішаі, мох ды паўзучая падканцавосная ніцая лаза. Жывёлы краіны трымаюцца каля мора, дзе яны могуць жывіцца рыбай. Туды часта заходзіць белы мядзьведзь, забягае блакітны ліс, а заўсёды там жывуць толькі многалічныя морскія птушкі.

У канцы мінулага веку на Новай Зямлі пасялілася некалькі сямей самаедаў, якія там займаюцца рыбацтвам і паляваньнем, а продукты свае мяняюць на збожжа, якое сюды прывозяць час ад часу архангельскія паморы.

**Паўночны Урал** пачынаецца ў 30 вёрстах ад Карскага мора. (Там знаходзіцца гара Константынаў Камень 520 м. увышкі). Спачатку Паўночны Урал цягнецца на паўднёвы захад, а каля $64^1/_{20}$ паўн. шыр. (каля гары Саблі) зварочвае проста на поўдзень. Найвышэйшыя горы краіны, так званыя



там „Камені“, дасягаюць значнай вышыні і здалёку выглядаюць, запраўды як голыя вялізныя камені, паднятыя над зялёнымі пасторамі суседніх тундр і тайговых лясоў. Вярхі некаторых тутэйшых гор дасягаюць вышыні 1500 і болей мэтраў, так што гэтая краіна зьяўляецца самай высокай часткай Уралу.

Ледавікоў у межах краіны бязмаль-што зусім няма, хаця шмат якія горы дасягаюць сьнегавой мяжы. Аднак у ледавіковы пэрыод ледавікі пакрывалі краіну, як і ўсю Паўночную Эўропу.Сучасны клімат Паўночнага Уралу вельмі жорсткі, сухі, адзначаецца малой колькасьцю ападкаў і марознай зімой.

Нават на крайнім поўдні краіны паселішча Багаслоўскі завод мае сярэднюю тэмпэратуру году—$1,3^0$, ліпеня+$17^0$, студзеня —$19,4^0$.

У паўднёвай частцы краіны па схілах гор сустракаюцца igластыя лясы з сібірскіх кядровых хвой, ельніцы і мадрын. Асабліва-ж багаты на лес плоскаўзвышшы—пармы, якія цягнуцца ўдоўж заходняга схілу Уральскага ланцуга.

Паўночны Урал яшчэ мала асочаны, але, агулам кажучы, гэта бедны і ўбогі куток Эўропы. Паляваньне на тайговых зьвяроў ды рыбацтва, а на поўначы яшчэ гадоўля паўночных аленяў даюць магчымасьць існаваць рэдкаму насяленьню краіны. Жывуць тут пераважна фінскія пляменьні: на поўначы—самаеды, на поўдні—зыране, асьцякі, вагулы. Толькі на крайнім поўдні вялікарусы пасьпелі пабудаваць некалькі паселішчаў, але й там не пашырылася ральніцтва, бо й там у час кароткага лета не дасьпявае часамі ня толькі збожжа, але нават і гародніна. Вялікарусы займаюцца там пераважна гандлем, купляюць хутры ад зыран і вагулаў, а ім дастаўляюць збожжа, соль, крамніну, гарбату.

**Сярэдні Урал** завецца йначай Рудным, бо адзначаецца вялікім багацьцем на ўсялякія карысныя мінэралы. Асабліва тутака многа жалезнай руды, з якой месцам складаюцца цэлыя горы (напр., гара Благадаць і Высокая з магнэзавага жалезьняку). Болей за ўсё жалеза на ўсходніх схілах Сярэдняга Уралу ў выбуховых скалах, якія калісь выліліся там на паверхню ў стане цякучай лявы праз шчыліны земнай кары. Апрача таго, тамака ў жылах і золатародных пясках знаходзяць золата і плятыну ў такой колькасьці, як нідзе ў Эўропе. Плятына сустракаецца вельмі рэдка, але гэта наагул вельмі рэдкі каштоўны мэтал, так што й на ўсім сьвеце яго не знаходзяць столькі, як на Урале. Далей у Сярэднім Урале трапляецца маляхіт і іншыя мядзяныя руды, руды волава і серабра, мангану, нікелю, жывога серабра, ёсьць шмат мінэральных крыніц, з якіх здабываюць соль. Ёсьць тут і дарагія камені: топазы, амэтысты, бэрылы, горны крышталь, смарагд, ёсьць і каштоўныя будаўнічыя камені: апрача маляхіту—мармур, яшма і г. д. Сустракаецца й каменны вугаль, але ня вельмі добрага гатунку.

У адзнаку ад Паўночнага Уралу, параўнаўча высокага, Урал Сярэдні складаецца з нявысокіх узгоркаў і грудоў, да самага верху пакрытых лясамі кедравых хвой, ельніц, мадрын і г. д. Праходы ляжаць тутака на вышыні 300 і меней мэтраў над роўнем мора, так што гэта найніжэйшая частка Уральскага ланцуга—нібы брама з Эўропы ў Азію, брама, цераз якую з даўных часоў пераходзілі з аднэй часткі сьвету ў другую. Нават пракладаньне чыгунак праз Сярэдні Урал не вымагала пракопваньня тунэляў.

Зразумела, што ў Сярэднім Урале нельга спадзявацца знайсьці вечных сьнягоў або ледавіковых струменяў. Нават у ледавіковую эпоху, дзякуючы сухому клімату, тут існаваў параўнаўча тонкі лёдавы насьціл, і ледавіковы навал тут ня кідаецца ў вочы.

Сухі, контынэнтавы клімат пануе й цяпер у гэтай краіне. Уплывы Гольфштрому адчуваюцца тут вельмі слаба, і сярэдняя тэмпэратура году тут ніжэй, як у іншых месцах Эўропы, што ляжаць на тэй самай шырыні. Зіма вельмі сьцюдзёная, лета гарачае, але часамі нават у летнія ночы здараюцца маразы. Садовіна тут расьці ня можа, дый збожжа часамі церпіць ад недахвату цяплыні. Глебы тут падзольныя, неўраджайныя; толькі на крайнім поўдні сустракаецца чорназем. З гэтай прычыны на поўдні чалавек расьцерабіў лясы, займаецца ральніцтвам і задавальняе збожжам усю краіну. На поўначы ральніцтва дае мала карысьці: там захавалася многа лясоў, а сяляне побач з ральніцтвам займаюцца ляснымі промысламі, валяць і сплаўляюць па рэках дрэва, гоняць смалу, выпальваюць дрэўны вугаль. Але большую карысьць даюць мінэральныя багацьці краіны. Паўсюды, асабліва-ж на ўсходніх схілах, тысячы працоўных людзей капаюць жалезную руду, працуюць на фабрыках, гутах, гісэрнях. Даўней па колькасьці здабыванага железа краіна займала першае месца ўва Ўсходняй Эўропе. Цяпер Урал застаўся з гэтага боку ззаду ўкраінскай Крывароскай акругі, але й цяпер тут існуе буйная жалезаапрацоўчая прамысловасьць. Каменны вугаль здабываюць абапал ланцуга, і хаця яго тут ня дужа многа, але ён грае важную ролю, як апал для тутэйшых гут і фабрык. Так званыя „стараЦелі" саматугам здабываюць золата і плятыну. Гэта дробныя прамыслоўцы, якія шукаюць дарагіх мэталаў на скарбовай зямлі і здабытак аддаюць за грошы прадстаўнікам ураду.

Лежачы на межах Эўропы і Азіі, маючы шмат выгодных праходаў, Сярэдні Урал мае вялікую гандлёвую вагу. З Маскоўшчыны па Каме, з Сібіру па прытоках Обі, адусюль па чыгунках сюды вязуць сырыну, крамніну, збожжа, адгэтуль ува ўсе бакі вывозіцца сталь, чыгун, бляха, іншыя жалезныя вырабы і асабліва зброя.

Першапачатковыя насельнікі краіны—пермякі, якія разам з зыранамі і вацякамі належаць да прыуральскіх фінаў, захаваліся толькі ў невялікім ліку ў вадазборы Камы; значная частка іх зусім аславянілася, і пакрысе іх выціскаюць вялікарусы, якія паўсюды складаюць большасьць і ўладаюць бязмаль ўсёй зямлёй, усімі капальнямі, руднямі, гутамі.



Ужо ў XIV в. сюды надышлі ноўгародцы. У XV в. краіна была далучана да Маскоўшчыны, а ў XVI в. большая яе частка была аддадзена гандляром Строганавым, якія адчынілі тутака саляварні. З таго часу пачалася шпаркая колёнізацыя краю. Сяляне-ўцекачы ад паноў, стараверы і звычайныя бадзягі з Маскоўшчыны пачалі сяліцца сярод тутэйшых фінаў і мяшацца з імі. У часы Пётры Першага тут пабудавалася першая жалезная гута („Няўянскі завод"), і залюдненьне Сярэднага Уралу пачало хутка пасоўвацца наперад. Часамі сялян Сярэдняй Маскоўшчыны сілком перасялялі на Урал і прымушалі працаваць на руднях і гутах. Пакрысе фінскія тубыльцы—пермякі, часткай вацякі і зыране (на поўначы) бязмаль-што зусім разышліся ў грамадзе маскоўскага люду.

Значная частка уральскіх вялікарусаў жыве па так званых „заводах". Гэта мястэчкі і пасёлкі, якія пабудаваліся каля рудняў, капальняў, гут або фабрык і іншы раз маюць выгляд запраўдных гарадоў. Часта ў такіх „заводах" жыве колькі дзесяткаў тысяч насельнікаў, ёсьць па некалькі фабрык, шмат крам і г. д.

У драбнейшых „заводах" заўсёды ў асяродку стаіць гута або фабрыка, каля якой гуртуюцца будынкі шпіталю, аптэкі, палац уласьніка фабрыкі, царква. Ад асяродку ўва ўсе бакі разыходзяцца простыя, даўгія, досыць частыя і шырокія вуліцы, абапал якіх стаяць маленькія, але прытульныя хаты працоўнага люду. Асабліва многа такіх „заводаў" на ўсходніх схілах ланцуга (чаму?).

У асяродку самай багатай прамысловай акругі ляжыць і самы вялікі горад краіны *Кацярынбург* (97 тыс. насельнікаў), злучаны чыгункамі з Сібірам, Паўднёвым Уралам і Паўночнай Маскоўшчынай. Гэта галоўны асяродак нетракапальнай прамысловасьці ў землях, залюдненых маскоўцамі і самы важны фабрычны горад краіны. У ім знаходзіцца буйная дзяржаўная фабрыка шліфаваньня дарагога каменьня і галоўныя ўстановы, што кіруюць нетракапальнымі промысламі, а ў адным з прадмесьцяў (Верх-Ісецкім заводзе) ёсьць адна з найвялікшых гісэрань. Навокала Кацярынбургу існуюць сотні „заводаў", з якіх некаторыя й цяпер ужо атрымалі назоў гарадоў. Самы вялікі з іх *Ніжнятагільск* (27000 нас.) пасьля рэволюцыі абвешчан горадам. Вялізныя гуты гэтага места апрацоўваюць жалезную руду, якую здабываюць побач у гары Высокай. У ваколіцах Ніжнятагільску ёсьць багатыя паклады мядзяных руд.

У будучыне прамысловасьць Сярэдняга Уралу мусіць карыстацца электрычнай энэргіяй, якая будзе выраблящца на электрычных станцыях у Ягоршчыне каля Кацярынбургу і на р. Чусавой. Гэтыя станцыі будуць карыстацца замест апалу сілай цякучай вады.

Заходнія схілы Сярэдняга Уралу маюць значна меней гарадоў і „заводаў", чым усходнія. Нетракапальныя промыслы там адыходзяць на другі плян, затое большую вагу маюць лясныя занятк. Галоўным горадам там

зьяўляецца *Перм* (68000 нас.), які ляжыць на Каме ніжэй сутокі гэтай магутнай ракі з сваёй уральскай прытокай—Чусавой. Дзякуючы параходнаму руху па Каме і чыгункам, што злучаюць горад з Ленінградам і Кацярынбургам, Перм зьяўляецца галоўным гандлёвым асяродкам Руднага Уралу. У час вайны тут адчыніўся унівэрсытэт, дый наагул гэта важны культурны цэнтр Уралу. У некалькіх вёрстах ад гораду знаходзіцца Мотовіліхінскі „завод“ з вялізнымі гісэрнямі і фабрыкамі зброі.

Вышэй Пермі каля Камы ляжыць некалькі мястэчак, слынных здабываньнем солі з салоных крыніц. Да іх належаць *Салікамск, Усольле, Ленва* і *Дзядзюхін*. У Усольскім павеце знаходзяцца й галоўныя капальні каменнага вугалю на Урале каля мястэчка *Луньнеўкі*. Там будуецца вялікая электрычная станцыя, якая будзе задавальняць электр. энэргіяй ваколічныя капальні.



Мал. 102.—Рака Чусавая ў Сярэднім Урале.

**Паўднёвы або Башкірскі Урал** складаецца з асобных ланцугоў, якія вахляром разыходзяцца з поўначы на паўднёвы ўсход, на поўдзень і паўднёвы захад, і дасягае значна большай вышыні, чым Сярэдні.

На крайнім усходзе цягнуцца нявысокія Ільменскія горы; бязмаль роўналежна ім цягнецца вадападзельны ланцуг Урал-Таў; далей на захад уздымаюцца яшчэ вышэйшыя ланцугі: Ірэмель (1599 м. выш. над роўнем мора), Яман-Таў (1642 м. н. р. м.), Зігальга, Урэнга і Таганай, з захаду да Паўднёвага Уралу прыгарнулася Уфімскае плоскаўзвышша, на поўдні так званыя Губэрлінскія горы і плоскаўзвышша р. Сакмары, на паўднёвым



ўсходзе Паўднёвы Урал мае свой працяг—Мугоджарскія горы, якія пакрысе зьнікаюць у стэпе Арала-Каспійскай нізіны. Між асобнымі ланцугамі Паўднёвага Уралу ў шырокіх прадоўжных далінах працякаюць важныя рыбныя рэкі, а на поўначы краіны знаходзіцца важны рэчны вузел, дзе сваімі пачаткамі сходзяцца рэкі Каспійскага ды Обскага вадазбораў. На захад адтуль бяжыць прытока Камы Белая з сваёй прытокай Уфой, на поўдзень—Урал, на ўсход у Заходні Сібір—рэкі Обскай рэчнай сеці.

Клімат тутака трохі цяплейшы, але яшчэ сушэйшы, як у Сярэднім Урале. Марозная зіма тутака трывае месяцы тры, цёплая пара (з сярэдняй тэмпэратурай начадзеньня вышэй за $+10^0$) цягнецца 4-5 месяцаў, а ў ліпені стаіць надзвычайная сьпякота (з сярэдняй тэмпэратурай начадзеньня вышэй за $+20^0$, як у Паўднёвай Эўропе).

Орэнбург, на поўдні краіны, мае сярэднюю тэмпэратуру года $+3{,}3^0$, сярэднюю студзеня—$15{,}4^0$, сярэднюю ліпеня $+21{,}6^0$.

Па схілах гор тут яшчэ пераважваюць лясы, але ўжо рэдка igластыя, хіба толькі па вярхох гор, а часьцей ліставыя, складзеныя з ліп, бярэзін і дубоў. Па падгор'ях, а на поўдні нават і па самых горах, растуць толькі травы тыповага кавыльнага стэпу. Згодна з гэтым там глебы пераважна чорназемныя, вельмі ўраджайныя, што ў зьвязку з цёплым кліматам даваляе зьбіраць багатыя ўраджаі пшаніцы і рознага іншага збожжа, якое адгэтуль вывозіцца ў Паўночную Маскоўшчыну і ў Кіргіскі стэп на поўдзень. Саджаюць тут кавуны, дыні, гарбузы, гуркі; займаюцца і гадоўляй жывёлы, бо спажывы тут для яе хапае як у стэпе, гэтак і на поплавах у рэчных далінах. Даўней кожны гаспадар тут трымаў па некалькі тысяч коняй; цяпер ужо няма такіх статкаў, але гадоўля коняй і авечак і да гэтага часу зьяўляецца адным з важнейшых заняткаў люднасьці. Як і ў Сярэднім Урале, тут сустракаюцца багатыя паклады жалезнай руды (Бакальская рудня, гара Магнэзавая), дарагіх мэталаў і каштоўных каменяў. Апрача таго, на поўдні краіны знаходзяцца вялікія запасы падземнай каменнай солі. Дзякуючы гэтаму, і тут пашырылася нетракапальная прамысловасьць; усюды зьявіліся гуты і фабрыкі; але ўраджайнасьць глебы адцягвае працоўны люд ад нетракапальных і фабрычных заняткаў.

Як і ў Сярэднім Урале, першапачатковымі насельнікамі краіны былі розныя фінскія народы, але ўжо ў IX веку іх выціснулі адгэтуль горды башкіраў, якія прышлі сюды з Азіі і пачалі вандраваць па прыуральскім стэпе з сваімі статкамі без перашкод, пакуль краіну не захапілі маскоўцы. З маскоўцамі башкіры ўпарта змагаліся за сваю незалежнасьць і некалькі разоў паўставалі супроць маскоўскага ўраду. Змаганьне было бязьлітасным. Часамі башкіры выкапвалі з магіл расійскіх нябожчыкаў, каб на башкірскай зямлі не заставалася ані жывых, ані памершых чужынцаў. Але кожны раз маскоўцы перамагалі башкіраў, і ў XVIII в. паўстаньні апошніх спыніліся. Расійцы пачалі й тут будаваць свае гуты, фабрыкі, гарады, занесьлі сюды земляробства. Аднак і да цяперашняга часу башкіры складаюць значны

процант тутэйшай люднасьці, а ў шмат якіх месцах пераважваюць над расійцамі. Башкіры адзначаюцца шырокім плоскім тварам, плескаватым носам, круглай галавой і сярэднім ростам. Яны лічаць сябе за патомкаў ногайскіх татар і звычайна разглядаюцца, як народ туркскага племя. (Некаторыя дасьледчыкі аднак лічаць башкіраў за ататараных тубыльцаў Уралу—фінаў).

Башкіры, прынамсі да прыходу маскоўцаў, былі простымі, сумленнымі і лёгкавернымі людзьмі. Гэтым часта карысталіся расійцы, каб ашукаць іх і купіць за нівошта вельмі каштоўныя землі, на якіх сустракаліся карысныя мінэралы.

Уладаўшы калісь неаглядньімі статкамі жывёлы, башкіры пад уладай маскоўскіх цароў хутка зьбяднелі і часта галадавалі каля складаў збожжа, сабранага расійцамі з башкірскай зямлі, бо самі не навучыліся добра вырабляць зямлю. Цяпер яны жывуць асела, займаюцца ральніцтвам, але ня любяць гэтага занятку. Польную працу вядуць кабеты, а мужчыны, ледзь пачнецца вясна, кідаюць свае вёскі і разам з сваёй жывёлай перабіраюцца на пашу, дзе жывуць у часовых хатах—берасьцяных або лямцовых палатках, якія там завуцца кібіткамі. Тут на сочнай траве аджывае башкірская жывёла—коні ды авечкі, аджываюць і самі башкіры. Кумыс—кабыльле малако, якім жывяцца там башкіры—вельмі карысны для здароўя, і за лета башкір пасьпее раздабрэць і набрацца сіл для наступнай зімы. Увосені башкіры зварачваюцца ў свае вёскі, і такім чынам вядуць да цяперашняга часу напалову вандроўны, напалову аселы спосаб жыцьця.

Зімовыя хаты башкіраў пабудованы кепска, маюць выгляд нясканчаных або зруйнованых і сьведчаць аб тым, як мала цікавіць башкіра яго сталае месца жыцьця. Хаты будуюцца ня ўдоўж вуліц, як у нас ці ў маскоўцаў, а без парадку; на славяніна башкірская вёска наганяе смутак і жаль.

Пасьля рэволюцыі часткі башкірскага стэпу, у якіх башкіры да гэтага часу складаюць большасьць, былі вылучаны з даўнейшых Уфімскай і Орэнбурскай губэрняў і абвешчаны самаўраднай Башкірскай рэспублікай (2573000 насельн.).

Апрача расійцаў і башкіраў у межах Паўднёва-Уральскай краіны жывуць народы фінскага племя—мешчаракі і цепцяры, якіх лічаць уцекачамі з Паволжа і Казаншчыны. Яны ўжо моцна абашкірыліся і разам з башкірамі трымаюцца магомэтанскай веры. У час башкірскіх паўстаньняў мешчаракі разам з башкірамі біліся за незалежнасьць Башкірскага Уралу, а цепцяры, наадварот, падтрымоўвалі маскоўцаў. З гэтай прычыны маскоўцы пасьля перамогі над башкірамі надзялілі цепцяроў зямлёй, а мешчаракоў і башкіраў прасьледвалі і ганьбілі аж да апошняга часу.

Маскоўцы Паўднёвага Уралу жывуць як па вёсках, гэтак і па гарадох і „заводах“, падобных да „заводаў“ Сярэдняга Уралу.



Дзякуючы прыродным багацьцям краіны, гарады тутака шпарка растуць, адзначаюцца вялікім разьвіцьцём прамысловасьці і бойкім гандлем. Асабліва бойка гандлююць тыя гарады, што ляжаць на вялікай чыгунцы з Маскоўшчыны ў Сібір (так званай Вялікай Сібірскай чыгунцы). Таксама бойкі абмен тавараў адбываецца і ў тых гарадох, якія пабудаваліся на межах Паўднёвага Уралу і Кіргіскага стэпу (Арала-Каспійскай катліны).

Самы важны з гэтых гарадоў—*Орэнбург* (106000 насельн.) ляжыць на рацэ Урал у тым месцы, дзе яе пераразае чыгунка з Маскоўшчыны ў Туркестан (на Ташкент). Горад зьяўляецца пасярэднікам у гандлі Маскоўшчыны з Кіргіскім стэпам і ўсёй Сярэдняй Азіяй. Пасьля рэволюцыі Орэнбург зроблены сталіцай Кіргіскай самаўраднай рэспублікі.

Даўней гандаль Маскоўшчыны з Кіргіскім стэпам гуртаваўся ў *Троіцку* (25000 насельнікаў). Яшчэ й цяпер тут што-год адбываецца вялікі кірмаш, на які на вярблюдах прывозяцца вырабы Кіргіскага стэпу і Туркестану: шэрсьць вярблюдаў, баваўняная і шоўкавая сырына, мігдал, фісташкі, абрыкосы і іншыя плады з-пад гор Сярэдняй Азіі. У замену Маскоўшчына сюды пасылае крамніну, а Урал—жалеза, збожжа, медзь.

Каля Вялікай Сібірскай чыгункі ляжаць: *Уфа* (84000 нас.), важны гандлёвы горад на сутоцы рэк Белай і Уфы; *Златавуст* (34000 нас.) у тым месцы, дзе чыгунка падымаецца на уральскі хрыбет з вялікай фабрыкай, на якой вырабляюцца нажы, шаблі і іншыя сталёвыя вырабы; *Міас* (23000 нас.), асяродак нетракапальнай прамысловасьці Паўднёвага Уралу, і *Чалябінск* (54000 насельн.), багаты, гандлёвы горад, асяродак важнай золатароднай акругі, з вялікімі паравымі млынамі, на якіх апрацоўваюць мясцовае і сібірскае збожжа.

У Чалябінску мусіць быць заложана вялікая электрычная станцыя, якая будзе карыстацца мясцовымі пакладамі бурага вугалю. Гэтая станцыя будзе абслужваць як чалябінскія фабрыкі, гэтак і нетракапальны раён Златавусту.

## Паўднёвая Маскоўшчына.

(Азнач яе географічнае палажэньне. Пералічы тыя староны, з якімі яна мяжуецца).

Паўднёвая частка зямель, залюдненых вялікарусамі, або, карацей кажучы, Паўднёвая Маскоўшчына належыць ужо да паўднёвага, стэпавага пасу Ўсходняй Эўропы і ляжыць на захад ад Паўднёвага Уралу і на поўдзень ад Акі.

У сярэдняй частцы гэтага краю яшчэ сустракаюцца ледавіковыя адклады, але тут яны пахованы пад грубым пластом лёэсу і ня высоўваюцца на паверхню. Асаблівасьці краявіду залежаць тут перш за ўсё ад уласьцівасьцяй лёэсу. Раўчакі ды яры ў розных кірунках пераразаюць

гэты край, але й яны надаюць мала рознастайнасьці краявіду. Даўней тут сустракалася досыць многа лясоў, так што краіна мусіць лічыцца пераважна лесастэпам, але цяпер большая частка гэтых лясоў павысякана і пераверненa на бязьмежныя палі. Верхні пласт тутэйшых лёэсавых грунтоў, багаты перагнілай травой, складае вельмі ўрадлівую чорназемную глебу. Аднак каля рэк дзе-ні-дзе трапляюцца і пяскі, падобныя да пяскоў Палесься. Такімі неўраджайнымі куточкамі краю зьяўляюцца мясцовасьці, што ляжаць па Сярэдняй Ацэ, па Суры і па левым беразе Волгі між Вятлугай і Камай. Там па пяскох растуць пераважна хваёвыя бары, таго часу як у рэшце краю па лепшых глебах калі і ёсьць лясы, дык галоўным чынам ліставыя—асабліва дубовыя гаі, з усіх бакоў абкружаныя нівамі ці стэпам. Запраўдны кавыльны стэп (а не лесастэп) пакрывае толькі паўднёва-ўсходнія ўскрайкі старонкі.

Паводле будовы паверхні Паўднёвую Маскоўшчыну можна падзяліць на 4 краіны: 1) на захадзе, на мяжы з Беларусьсю і Украінай, уздымаюцца ўзгор'і Сярэдня-Рускага ўзвышша; 2) на ўсход адтуль цягнецца прамытая рэкамі Окска-Донская нізіна, якая злучае Чорнаморскую нізіну з нізінамі Окска-Волскага міжарэчча; 3) яшчэ далей на ўсход удоўж правага берагу Волгі ўздымаюцца Прыволскія ўзвышшы; 4) па-за Волгай нізкі левы бераг ракі зьяўляецца пачаткам Заволскай нізіны.

Клімат у Паўднёвай Маскоўшчыне чыста контынэнтавы, сухі, і чым далей на ўсход, тым яшчэ й яшчэ сушэйшы. Зіма вельмі сьцюдзёная, асабліва на паўночным усходзе. (Сярэдняя тэмпэратура студзеня хістаецца між —7° і—14°). Затое ўлетку паўсюды пануе амаль аднальковая высокая тэмпэратура. (У ліпені старонка ляжыць між роўнацёплымі лініямі+20° і +22°). Дажджы выліваюцца ў найвялікшай колькасьці ўлетку, але звычайна—вялікімі ўлевамі, вада якіх хутка сьцякае, не пасьпеўшы прамачыць грунту. Часта здараюцца сухмені, калі бязмаль ад самай вясны да восені ня бывае дажджу, і сонца выпальвае ўсю расьліннасьць. Чым далей на ўсход, тым часьцей і небясьпечней гэтыя сухмені, якія выклікаюць час ад часу страшэнныя неўраджаі.

У гады сухменяй нівы выгараюць, часамі ўсыхаюць нават асобныя дрэвы, і ўся старонка прымае выгляд голай, убогай пустыні. Затое ў тыя гады, калі выліваецца досыць дажджу, чорназемная глеба дае надзвычайныя ўраджаі, сяляне не пасьпяваюць жаць, і старонка напаўняецца працоўным людам з Паўночнай Маскоўшчыны, які шукае тады тут заработкаў.

Сельская гаспадарка тут грае яшчэ большую ролю, як у Паўночнай Маскоўшчыне. Большую частку зямлі ўжо ўзаралі, але вырабляюць зямлю кепска, змагацца з сухменямі ня ўмеюць, прылады ўжываюць старыя. Галоўным збожжам тут зьяўляецца жыта (а не пшаніца, як на Украіне), сеюць, апроч таго, авёс, бульбу, каноплі, грэчку. У апошнія часы замест грэчкі ўсё часьцей сеюць проса, якое лягчэй пераносіць сухмені і дае большыя ўраджаі, чым грэчка. Ня гледзячы на надзвычайную ўраджай-



насьць чорназемнай глебы, сяляне жывуць бедна. Зямлі ў іх было мала, і яны, прынамсі да рэволюцыі, мусілі працаваць на панскай зямлі. Вёскі Паўднёвай Маскоўшчыны складаюцца з драўляных брудных шэрых халуп, выцягнутых абапал даўгой бяздрэўнай вуліцы. Тут няма прыгожых вясковых садоў, якімі багата суседняя Украіна, няма і высокіх двохпаверхавых чыстых будынкаў, якія часта сустракаюцца па вёсках Паўночнай Маскоўшчыны.

Першапачатковае насяленьне Паўднёвай Маскоўшчыны складалася з розных фінскіх пляменьняў: мешчаракоў, мардоўцаў, марыйцаў (чэрамісаў), чувашоў і г. д., але ўжо ў сярэднія вякі сюды пачалі надыходзіць з захаду славяне, а з усходу татарскія (туркскія) народы. Фінскія пляменьні або ататарыліся, як чувашы, або амаскаліліся, і толькі ад мардоўцаў ды марыйцаў засталіся значныя рэшткі да гэтага часу. Славяне, злучыўшыся з фінамі, як і ў Паўночнай Маскоўшчыне, утварылі такі самы вялікарускі народ, але тут ім прышлося спачатку вытрымаць цяжкую барацьбу з татарамі. Спачатку татары былі пераможцамі. Славянскія княствы былі адкінуты за Аку, і нішто не перашкаджала татарскім вандроўнікам панаваць на ўсёй прасторы Чорназемнай Маскоўшчыны. Аднак у XV в. вялікарусы паступова адваёўваюць гэты край. Маскоўскі ўрад высоўвае за Аку свае ўмацаваньні-гарады; каля гарадоў пачынаюць сяліцца сяляне, змагаюцца з фінамі і татарамі і пакрысе мяшаюцца, зьліваюцца з імі. У XVI в. маскоўцы захапляюць асяродак Татарскай дзяржавы—Казань, спускаюцца на ніз па Волзе і пакідаюць там сваіх асаднікаў, так званую вольніцу, якая й дапамагае зьнішчэньню апошніх рэштак вандроўнага жыцьця.

Большасьць сучасных насельнікаў Чорназемнай Маскоўшчыны належыць да вялікарусаў, і, як большасьць вялікарусаў, адразьняецца ад беларусоў і ўкраінцаў ніжэйшым ростам, шырэйшым тварам, большым выступаньнем скул. У характары іх прымячаецца больш азійскага, больш усходніх звычаяў, усходніх поглядаў, якія выяўляюцца, напрыклад, у дэспотычным прыгняценьні кабеты. Запазычыўшы цераз Украіну і Беларусь грэцкую бізантыйскую культуру, яны перарабілі яе на свой лад, дапасавалі да сваіх сьветапаглядаў.

Мова паўднёвых вялікарусаў адразьняецца ад паўночна-вялікарускіх гаворак некаторай падобнасьцю да беларускай мовы.

Яны таксама, як і беларусы, акаюць (вымаўляюць „о" бяз націску, як „а"), таксама, як і мы, вымаўляюць „г" (як латыньскае „h"), гук „в" у іх часта пераходзіць у „ў", „т", у трэцяй асобе спражэньня дзеясловаў яны вымаўляюць мякка.

Паводле сваёй культуры паўднёвыя маскоўцы стаяць значна ніжэй за паўночных маскоўцаў, за беларусоў і ўкраінцаў. Няпісьменных тут яшчэ болей, як там. Ня маюць паўднёвыя вялікарусы і тых энэргіі і гандлёвых здольнасьцяй, якімі адзначаюцца паўночныя маскоўцы.

Ня гледзячы на вялікую розьніцу ў прыродзе і на значную розьніцу ў люднасьці, Паўднёвая Маскоўшчына аднак становіць адно цэлае з Маскоўшчынай Паўночнай. Тлумачыцца гэтае адзінства Маскоўшчыны галоўным чынам яе рэчнай сецьцю. Таксама, як ядро Паўночнай Маскоўшчыны Окска-Волскае міжарэчча абвадняецца Волгай і яе прытокамі, гэтак і большая частка Паўднёвай Маскоўшчыны ляжыць у Волскім вадазборы. Як Дняпро лічыцца нацыянальнай ракой украінцаў і беларусоў, як Вісла зьяўляецца нацыянальнай ракой Польшчы, гэтак Волга ёсьць галоўнай жылай Маскоўшчыны. Волга дапамагла Маскоўшчыне злучыцца ў адну вялікую дзяржаўную адзінку; па волскіх прытоках і па Волзе кіравалася маскоўская колёнізацыя далёкіх ускрайкаў; асаблівасьці Волскага вадазбору, злучанага ня з морам, а з Касьпійскім возерам і адрэзанага нават ад гэтага возера Прыкасьпійскай пустыняй, зрабілі Маскоўшчыну замкнутай сухаземнай дзяржавай, якая доўга ніяк не магла прабіцца да патрэбных ёй морскіх прыстаняй. Да Паўднёвай Маскоўшчыны належыць толькі сярэдняе цячэньне Волгі ад сутокі яе з Акой да Царыцыну. На ўсім працягу гэтай часткі свайго цячэньня Волга цячэ між высокім і зрывістым правым берагам і нізінным лугавым берагам левым, заўсёды точыць і размывае правы бераг і адступае ад левага.

Гэтая ўласьцівасьць усіх рэк паўночнай паўкулі тлумачыцца вярчэньнем зямлі навокала сваёй восі

(Пералічы, якія рэкі Волскага вадазбору працякаюць па Паўднёвай Маскоўшчыне. Якія яшчэ рэкі пачынаюцца ў гэтай старонцы?).

Паўднёвую Маскоўшчыну можна падзяліць на 4 краіны: 1) чыста вялікарускую Паўднёва-Заходнюю Маскоўшчыну, 2) Прыволскае ўзвышша, 3) Заволжа і 4) Казаншчыну на паўночным усходзе.

**Паўднёва-Заходняя Маскоўшчына** ляжыць у вадазборы вышняй і сярэдняй Акі, пераважна па правым беразе гэтай ракі. Заходняя частка гэтай краіны належыць да Сярэдня-Рускага ўзвышша і становіць вадападзел Дняпра, Дону і Волгі. Тут пачынаецца Сэйм, галоўная прытока Дзясны, Дон, Ака. (Якія яшчэ рэкі цякуць па заходняй частцы краіны?). На ўсход ад вышнявіны Дону паверхня зьніжаецца і пераходзіць у Окска-Донскую нізіну.

Клімат краіны сухі, але ападкаў тут выліваецца болей, як у іншых краінах Паўднёвай Маскоўшчыны, а сухмені бываюць радзей. Лясоў тут захавалася болей, асабліва каля рэк. Глеба пераважна чорназемная і толькі па ўзьбярэжжах Акі пераходзіць у падзольную і пескавую.

Славяне тут асталяваліся раней, чымся ў іншых краінах Маскоўшчыны. Першапачатковыя насельнікі—фіны—тут зусім зьліліся з славянамі; татарскія ўплывы таксама тут адчуваюцца слабей, як на ўсходзе Паўднёвай Маскоўшчыны.



З даўных часоў большасьць зямлі, гожай на ральлю, тут распрацована, але гаспадарка стаіць кепска. Да апошняга часу плугі і жалезныя бароны сустракаюцца досыць рэдка. Сяляне да цяперашняга часу карыстаюцца пераважна старасьвецкай сахой і драўлянай бараной. Краіна досыць густа залюднена, і сяляне ўладаюць маленькімі надзеламі; зямлёй карыстаюцца супольна, усёй вёскай, і час ад часу зямлю пераразьмяркоўваюць згодна зьменам у колькасьці членаў кожнай сям'і. Значная частка зямлі да рэволюцыі належала тутака да паноў, і малазямельныя сяляне мусілі працаваць у дварох. Аднак і там не хапала працы для ўсяго насяленьня, і значная частка яго што-год падавалася на заработкі на Ўкраіну ці ў казацкія стэпы. Дзякуючы дрэннай гаспадарцы, глеба ўжо не дае такіх багатых ураджаяў, як даўней, і вымагае ўгнаеньня, але пакуль-што ў звычайныя гады ўраджаі збожжа яшчэ вялікія і задавальняюць хлебам усё насяленьне, нават даюць магчымасьць вывозіць збожжа за межы. Болей за ўсё тут сеюць жыта, далей ідзе авёс, пшаніца, бульба. Вялікую вагу маюць засевы цукровых буракоў і табакі. Блізка-што ўсе сяляне сеюць каноплі, і паводле вырабу пянькі краіна займае першае месца ў Маскоўшчыне. Параўнаўча з іншымі краінамі Маскоўшчыны, тут даволі часта сустракаюцца сады.

У Окска-Донскай нізіне (у Тамбоўскай і Варонескай губ.) пашырылася гадоўля заводзкіх коняй-рысакоў і грузавых біцюгоў. Параўнаўча з іншымі краінамі Маскоўшчыны тутака трымаюць даволі многа сьвіней, але значна меней, як на Беларусі або на Ўкраіне. Па Сярэдняй Ацэ ў акругах, што ляжаць блізка ад Масквы, распаўсюджылася прамысловая гадоўля курэй. Наагул блізка-што ўсе галіны сельскай гаспадаркі граюць тут большую ролю, як у рэшце Маскоўшчыны. Параўнаўча з іншымі краінамі Маскоўшчыны, гэта найболей тыповая сельска-гаспадарчая краіна. Апрацоўчая прамысловасьць і гандаль стаяць тут вельмі нізка. Нават саматужная прамысловасьць, распаўсюджаная ў Паўночнай Маскоўшчыне, тутака не пашырылася. Толькі каля Тулы саматужным спосабам выробляюцца асобныя часткі самавараў, якія аднак зьбіраюцца ў адно ўжо на самаварных фабрыках у самой Туле. За выключэньнем Тульскай акругі, у рэшце Паўднёва-Заходняй Маскоўшчыны на фабрыках апрацоўваюцца толькі сельска-гаспадарскія продукты. У вадазборы Сэйму (у Куршчыне) па буйных дварох працуюць цукраварні і бравары; паўсюды па гарадох і маёнтках сустракаюцца паравыя млыны, алейні, крухмальні. Аднак большая частка мясцовых продуктаў вывозіцца за межы ў неапрацованым стане. Галоўныя продукты вывазу: збожжа, пянька і жывёла.

Мала дзе яшчэ па гарадох жыве такі малы процант усёй люднасьці, як у Паўднёва-Заходняй Маскоўшчыне. Рашучую большасьць складае вясковая люднасьць. Вёскі, значна большыя, чым у Паўночнай Маскоўшчыне складаюцца часта з брудных „курных“ хат, у якіх узімку часам разам з чалавекам жыве й жывёла. Што-год многа вёсак гіне ад пажараў, бо хаты пераважна драўляныя.

Толькі ў апошнія часы па ўзоры суседзяў-украінцаў пачынаюць будаваць гліняныя хаты-ляпянкі. Гарады краіны зьяўляюцца асяродкамі загатоўкі збожжа для вывазу за межы.

Толькі *Тула* (123000 насельнікаў) можа лічыцца прамысловым асяродкам дзякуючы вялізным фабрыкам зброі, самавараў і іншых мэталёвых вырабаў. У ваколіцах Тулы знаходзяцца паклады бурага вугалю, якім карыстаюцца тульскія фабрыкі, і значныя запасы жалезнай руды. На мясцовым вугалі будзе працаваць вялікая электрычная станцыя, якая дазволіць замяніць апал на тульскіх фабрыках электрычнай энэргіяй.

На поўдзень ад Тулы, на вышнявіне Акі, ляжыць *Арол* (72000 насельнікаў), з якога па Рыга-Арлоўскай чыгунцы праз Смаленск, Віцебск і морскія прыстані Латвіі вывозілася на захад шмат жыта, пшаніцы і пянькі. Мясцовыя фабрыкі апрацоўваюць пяньку, вырабляюць крупы і алей. Яшчэ далей на поўдзень над Сэймам на чыгунцы, што злучае Маскву, Тулу і Арол з Харкавам і Крымам, стаіць *Курск* (86000 насельнікаў), які гандлюе збожжам, жывёлай, скурамі і цукрам.



Мал. 103.—Жыгулёўскія горы над Волга.

У вадазборы вышняга Дону ляжаць *Ялец* (40000 насельнікаў) і *Казлоў* (45000 насельнікаў), асяродкі хлебнага гандлю, і *Варонеж* (94 тыс. насельнікаў), важны культурны і гандлёвы асяродак з буйнымі млынамі, гарбарнямі і мылаварнямі. Тут загатаўляюць для вывазу збожжа і алей, сюды-ж прыводзяць для пагрузкі і вывазу слынных заводзкіх коняй.

У асяродку Окска-Донскай нізіны на р. Цне ляжыць *Тамбоў* (70000 насельнікаў), з якога вывозяць збожжа, сала, скуру, воўну і коняй. На Сярэдняй Ацэ ляжыць невялікае губэрскае места *Разань* (45 тысяч насельнікаў), у якім вырабляюць сельска-гаспадарчыя прылады.

**Прыволскае ўзвышша** абымае сярэднюю частку Паўднёвай Маскоўшчыны і складае высокі правы бераг Волгі на працягу ад сутокі яе з Акой да Царыцыну. На поўначы, ад вусьця Акі да вусьця Камы, высокі правы бераг Волгі мае назоў Фадзееўскіх гор, складаецца з бязьлесных чырвоных скал і становіць рэзкую проціленжнасьць левабярэжным нізінным густым лясом.



Асаблівай прыгожасьцю адзначаецца правы бераг Волгі ў так званых Жыгулёўскіх горах, якія пачынаюцца ніжэй места Ульлянаўск (Сімбірск) і адзначаюцца чароўнай зьменай дзікіх голых скал і акругленых лясных схілаў. Жыгулёўскія горы зьяўляюцца адзіным скідам усёй Усходня-Эўропэйскай раўніны. У тым месцы, дзе цяпер Волга выгінаецца ў так званую Самарскую луку, калісь утварылася ў шырынёвым кірунку вялікая шчыліна ў земнай кары. Пласты, што ляжалі на поўдзень ад гэтай шчыліны, падняліся мэтраў на 200 над пластамі, якія засталіся на поўнач ад шчыліны. Такім спосабам і ўтварыліся горы на самай дарозе ракі Волгі. Волга мусіла абысьці Жыгулёўскае ўзвышша і прабілася праз яго толькі каля места Самары. У гэтым месцы прарыву ракі праз Жыгулёўскі скід, нават і на левым, звычайна нізінным, беразе ўздымаюцца ўзгоркі—так званыя Сакаловы горы—працяг Жыгулёў.

На поўдзень ад Жыгулёў Прыволскае ўзвышша дасягае найвялікшай вышыні (385 м. н. р. м. каля м. Хвалынску), цягнецца далей да Царыцыну, пакрысе зьніжаецца і нарэшце на поўдзень ад Царыцыну застаецца ў баку ад Волгі і пераходзіць у ланцужок Эргеньскіх узгоркаў на вадападзеле Касьпійскага і Чорнаморскага вадазбораў.

Пачынаючы ад вусьцяў Камы і далей на поўдзень правы бераг Волгі ляжыць каля самага вадападзелу. Толькі маленькія кароткія рэчкі сьцякаюць з гэтага вадападзелу на ўсход беспасрэдна ў Волгу. Большасьць рэк цячэ адтуль або на захад у Аку (Мокша), або, як Мядзьведзіца і Ілаўля,—на поўдзень у Дон, або, як Сура і Сьвіяга,—на поўнач у Волгу. Сура і Сьвіяга цякуць амаль роўналежна Волзе, але ў адваротным кірунку.

Сьвіяга каля Ульлянаўску цячэ толькі ў 3-х вёрстах ад Волгі (затое на 20 сажняў вышэй), але далей, перш як уліць у Волгу сваю ваду, бяжыць у паўночным кірунку 375 вёрст. Такім чынам калі з Ульлянаўску паехаць за вадой па Сьвіязе, дык, праехаўшы некалькі сот вёрст па гэтай рацэ ды колькі сот вёрст па Волзе, можна зноў апынуцца ў Ульлянаўску. Волга бязупынна падгрызае свой правы бераг, і магчыма, што ў хуткім часе ўся адлегласьць між ёй і Сьвіягай будзе зроўнена, а Сьвіяга будзе ўлівацца ў Волгу ня ў Сьвіяску, як цяпер, а каля Ульлянаўску, і з значнай ракі перавернецца ў зусім кароткую.

Клімат Прыволскага ўзвышша сушэйшы, як у Паўднёва-Заходняй Маскоўшчыне. Улетку ўсё тут сьмягне ад сьпякоты, узімку і расьліны, і жывёлы, і чалавек церпяць ад марозу.

Саратаў мае сярэднюю гадавую тэмпэратуру $+5{,}7^0$, сярэдняя студзеня $-10{,}8^0$, ліпеня $+22^0$.

Сухмені—самае звычайнае зьявішча краіны і самае жудаснае няшчасьце. Раз у 4-5 гадоў сухмені нішчаць усё збожжа, гароды і сады, ад сухменяў гіне ўся трава, трэскаюцца грунты, і краіна ператвараецца ў пустыню.

Дзікая расьліннасьць краіны наагул убогая. Калісь існавалі на поўначы краіны лясы, але яны даўно павысяканы; ад іх засталіся хіба маленькія дубовыя гаі. Прыгожыя дубовыя ды ліпавыя лясочкі апранаюць яшчэ толькі схілы Жыгулёўскіх гор, ды на пяскох над вышнявінай Суры растуць яшчэ нават хваёвыя бары. Аднак лясы хутка замяняюцца нівамі, і што-год зьмяншаецца плошча, пакрытая дрэўнай расьліннасьцю. На поўдзень ад Саратаву пачынаецца запраўдны кавыльны стэп, там хіба ў далінах рэк ды па ярох сустракаюцца ўбогія кусткі і дрэўкі.

Люднасьць Прыволскага ўзвышша вельмі match розначастайная. Тут даўжэй, як на захадзе Маскоўшчыны, трымалася панаваньне вандроўнікаў, сюды пазьней надышлі аселыя славяне з Сярэдняй Маскоўшчыны, і з гэтай прычыны тут болей захавалася рэштак даўных насельнікаў.

З сучасных народаў краю самымі даўнымі насельнікамі Прыволскага ўзвышша лічаць прыволскіх фінаў. З гэтай галіны фінскага племя самымі многалічнымі, культурнымі, здаровымі і здольнымі зьяўляюцца мардоўцы (каля 1000000 чал.). Спачатку гэты народ жыў па ўсёй паўночнай, лесастэпавай палове краіны, але цяпер мардоўцы перамяшаліся з вялікарусамі, запазычылі шмат якія расійскія звычаі, адзяюцца ў маскоўскую вопратку і жывуць астравочкамі сярод прастораў, залюдненых расійцамі. Параўнаўча з іншымі прыволскімі фінамі мардоўцы адзначаюцца высокім ростам, моцнай будовай цела, значнай сілай, энэргіяй і самапэўнасьцю. Мардоўцы займаюцца пераважна ральніцтвам, зямлю апрацоўваюць старэнна і жывуць багацей за сваіх суседзяў-расійцаў. На поўначы краіны на межах з Казаншчынай спатыкаюцца чувашы і татары. Апошніх многа й па гарадох усёй краіны.

Татары надышлі ў краіну ў XIII в. і панавалі тутака аж да XVI в., калі расійцы разбурылі апошнія татарскія царствы. У XVII в. сюды надышло ўжо шмат славян з Маскоўшчыны і Украіны. Перш за ўсё гэта былі ўцекачы з Сярэдняй Маскоўшчыны, якія не жадалі цярпець уціску маскоўскіх баяраў і ваяводаў. Гэтая так званая паволская вольніца білася з рэшткамі суседніх вандроўных народаў, а часамі падымала паўстаньні (пад кіраўніцтвам Разіна, Пугачова) супроць маскоўскага ўраду.

Большасьць сучаснага насяленьня складаюць расійцы (патомкі паволскай вольніцы), якія жывуць тутака так сама бедна, як і ў Паўднёва-Заходняй Маскоўшчыне. Лепей жылі ўкраінцы, якіх даволі многа ў паўднёвай частцы краіны, і асаднікі-немцы.

Немцаў сюды запрасіў урад Кацярыны II. Ім далі шмат зямлі, спачатку нават звольнілі ад салдатчыны і падаткаў. Немцы не мяшаліся з расійцамі, у чыстаце захавалі тут сваю мову, звычаі і лютэранскую веру, жылі багата і карысталіся найлепшымі сельска-гаспадарчымі прыладамі. Дзякуючы вышэйшай культуры, яны лепей за расійцаў змагаліся з сухменямі. Аднак голад 1921 году палажыў канец іх дабрабыту. Пасьля рэволюцыі немцы-асаднікі краіны разам з немцамі Заволжа атрымалі самаўрад. Іх землі складаюць асобную самаўрадную рэспубліку „Немцаў Паволжа“ (502 тыс. насельн.).



Ральніцтва ў Прыволскім узвышшы зьяўляецца галоўным заняткам люднасьці. Жыта, як наагул блізка-што па ўсёй Маскоўшчыне, займае першае месца сярод гатункаў збожжа. За жытам ідуць усьлед пшаніца і ячмень; дзеля алею сеюць сонечнік, лён, каноплі, а ў нямецкіх асадах— яшчэ гарчыцу, якая лёгка пераносіць сухмені і дае вялікія ўраджаі. У сярэднім краіна мае некаторы надмер збожжа і алею, і звычайна вывозіць яго ў Сярэднюю Маскоўшчыну. Аднак на выпадак сухменяў, каб не галадаваць, кожны гаспадар мусіць рабіць запасы збожжа на 2-3 гады. У паўднёвай палове краіны (у Саратаўшчыне) вельмі добра сьпеюць кавуны (асабліва ля места Камышын); каля рэк і ў ярох саджаюць садовіну, пераважна яблыні і вішні, бо йгрушы і сьлівы гінуць ад зімовых маразоў. Саматужная прамысловасьць пашырана ў нямецкіх асадах, дзе карыстаюцца славай саматужныя ткацкія вырабы. Фабрычная прамысловасьць накіравана на апрацоўку мясцовага збожжа, асабліва на выраб мукі. Каля Волгі апроч таго пабудавалася многа пільняў, на якіх пілуюць сплаўленае з Паўночнай Маскоўшчыны дрэва.

Галоўнай адзнакай краіны зьяўляецца сувязь яе з Волгай. Волскае рыбацтва, праўда, ужо страціла сваю даўнейшую вагу, і толькі на поўдні ловяць яшчэ шмат волскай рыбы, але Волга зьяўляецца важным гандлёвым шляхам, які злучае краіну з Касьпійскім стэпам і Каўказам, з Сярэдняй і Паўночнай Маскоўшчынай і Уралам. Тысячы людзей знаходзяць сабе заработкі на Волзе. Тысячы грузчыкаў, плытнікаў і асначоў ад вясны да позьняй восені працуюць на волскіх прыстанях, на розных параходах, на барках, бярлінах і плытох. Волга зрабіла краіну гандлёвым пасярэднікам між асяродкам Маскоўшчыны, Сярэдняй Азіяй і Каўказам; дзякуючы Волзе, краіна адразьняецца ад Паўднёва-Заходняй Маскоўшчыны сваім вялікім гандлёвым значэньнем.

Аднак у галодныя гады ніякія дапаможныя заняткі не даюць дастатных заработкаў насельнікам краіны, і сотні тысяч тутэйшых сялян кідаюць свае вёскі ды йдуць у гарады, выяжджаюць у суседнія краіны, на Дон, Кубань, на Украіну.

Гарады Прыволскага ўзвышша ўтварыліся з даўна-маскоўскіх крэпасьцяй, пабудованых з мэтай засланяць Маскоўшчыну ад заволскіх стэпавых вандроўнікаў. З часам разьвіцьця параходнага руху па Волзе гэтыя гарады набылі значэньне абменных пунктаў і асяродкаў апрацоўкі сельска-гаспадарчых продуктаў. Зразумела, што найвялікшыя з іх павырасталі над самай Волгай на высокім правым беразе яе. Шмат церпяць гэтыя гарады ад размываньня ракой гэтага берагу. Кожны год рака перасоўваецца на захад, цэлыя кварталы гарадоў абурваюцца і спаўзаюць у раку, а насельнікі гарадоў мусяць будаваць свае хаты ўсё далей і далей на захад.

На паўночным усходзе краіны над Волгай і Сьвіягай у тым месцы, дзе паміж гэтых рэк застаецца толькі вузкі пярэсмык у 3 вярсты ўшыркі, ляжыць губэрскі горад *Ульлянаўск* або Сімбірск (69 тыс. нас.), асяродак загатоўкі збожжа і лесу, з вялікім чыгуначным мастом цераз Волгу.

Ніжэй Самарскай лукі стаіць *Сызрань* (43 тыс. нас.), таксама важны пункт пераправы цераз Волгу. Мост цераз Волгу ў Сызрані зьяўляецца найвялікшым ува ўсёй Усходняй Эўропе (дасягае 1 вярсты 175 сажняў удоўжкі). У ваколіцах Сызрані ў Жыгулёх капаюць асфальт. Ёсьць тут таксама значныя паклады гаручых лупнякоў. Імі будзе карыстацца, як апалам, вялікая электрычная станцыя, якую тут спадзяюцца пабудаваць.

Далей на поўдзень ляжыць, так сказаць, сталіца краіны—*Саратаў* (183 тыс. насельн.), які бойка гандлюе прыволскім збожжам, прыкамскім лесам, ніжняволскай рыбай і каўкаскай нафтай. Мільёны пудоў дрэва, што сплаўляецца сюды па Волзе, пілуецца на многалічных пільнях Саратаву; яшчэ большую вагу мае апрацоўка мясцовых продуктаў—апрацоўка скуры, выраб мукі, круп ды алею. Саратаў зьяўляецца зборным месцам волскіх плытнікаў і асначоў, якіх тут лягчэй за ўсё наняць для працы на рэчных судзінах. Як у культурным асяродку Прыволскага краю, у Саратаве шмат усялякіх школ і ў тым ліку ёсьць унівэрсытэт.

Ніжэй Саратаву, у тым месцы, дзе Волга мяняе свой паўднёвы кірунак на паўднёва-ўсходні і зварочвае ў Прыкаспійскі саланчаковы стэп, стаіць *Царыцын* (107 тыс. насельн.). Сюды прывозяць і адгэтуль разьмяркоўваюць па ўсёй Усходняй Эўропе рыбу волскай нізавіны і каўкаскую газу; адгэтуль-жа разьмяркоўваюць па стэпе лес, які прывозіцца па Волзе з Паўночнай Маскоўшчыны. У ўраджайныя гады праз Царыцын вывозіцца на паўднёвы захад да прыстаняй Азоўскага і Чорнага мора значная частка прыволскага збожжа.

Адкідныя матар'ялы царыцынскіх і саратаўскіх пільняў будуць служыць апалам для вялікіх электрычных станцый, якія будуць тут пабудаваны згодна пляну электрыфікацыі Расіі. Царыцынская станцыя мусіць даваць энэргію між іншым для электрычнай чыгункі ў Данеччыну.

У баку ад Волгі на вышнявіне Суры, у асяродку Мардоўскай зямлі, ляжыць значны губэрскі горад *Пенза* (80 тыс. нас.) з вялікімі паравымі млынамі і буйным хлебным гандлем.

**Заволжа** адразьняецца ад Прыволскага ўзвышша як сваёй прыродай, гэтак і люднасьцю. Гэта вялікая роўная нізіна, даўнейшае дно Каспійскага мора і суседніх з ім даўно зьнікшых несалоных вазёр. Ледзь прыметна нізіна павышаецца на ўсход, пакрысе пераходзячы ў так званае Прыуральскае ўзвышша (якое йначай завецца Обшчым Сыртам). Левы бераг Волгі паўсюды нізінны, роўны і голы або пакрыты лярэчным поплавам. Толькі супроць Самарскай лукі, дзе Волгу пераразае Жыгулёўскі скід, і тут, на левым беразе, уздымаюцца гэтак званыя Сакаловы горы і паміж іх цікавы сваёй самотнасьцю Цараў Курган.



Пескавыя і гляістыя каспійскія адклады Заволжа пакрыты ўраджайнай чорназемнай глебай, але клімат тут яшчэ сушэйшы, як у Прыволскім узвышшы, і сухмені яшчэ болей перашкаджаюць гаспадарцы, як там. Калі ўвясну выпадаюць дажджы, ураджаі бываюць надзвычайна вялікія, але часта здараецца, што ад пачатку вясны аж да канца лета дажджу зусім ня бывае, і тады засевы гінуць да каліва пад палючымі праменьнямі сонца. Тысячы людзей паўміралі тут з голаду ў 1873 г., але яшчэ болей адбіўся на жыцьці краіны галодны 1921 год. Зіма ў краіне сухая, бясьсьнежная, але марозная, багатая на завірухі з моцнымі паўночна-ўсходнімі вятрамі. Лясоў тутака зусім няма; паўсюды пануе стэп, голы, жоўты, аднастайны, выпалены сонцам.

Заволжа залюднілася яшчэ пазьней, як Прыволскае ўзвышша, і да гэтага часу насяленьне тут радзейшае, як там. Зямельнай цеснасьці тут яшчэ не адчуваецца, сяляне ўладаюць яшчэ вялікімі надзеламі і ня дбаюць аб тым, каб скарыстаць кожны кавалак зямлі. Замест трохпалёўкі, распаўсюджанай на захадзе ад Волгі, тут пануе дзірванны або аблогавы спосаб ральніцтва, пры якім зямлю засяваюць да таго часу, пакуль яна дае добрыя ўраджаі, а потым кідаюць пад дзірван на некалькі гадоў, пакуль яна не адновіць сваю ўрадлівасьць. Замест жыта тут сеюць пераважна пшаніцу, а на папары і на ялавіне пасьвяць вялікія статкі авечак, коняй і быдла. Квасное кабылячае малако, гэтак званы кумыс, зьяўляецца ўлюбёным мясцовым піцьцём. Яно лічыцца вельмі карысным для здароўя і прынаджвае сюды ў стэп многа хворых на грудзі, якія прыяжджаюць сюды на лета з іншых мясцовасьцяй Маскоўшчыны. Апрача збожжа і алейных расьлін, тут сеюць табаку, пераважна махорку, а на так званых баштанах—кавуны, дыні, гарбузы, гуркі. Затое садоўніцтва тут зусім немагчыма, садовыя дрэвы растуць вельмі кепска. Палепшаныя сельска-гаспадарчыя прылады тутака болей пашыраны, як у рэшце Маскоўшчыны, і звычайна сяляне жывуць значна замажней, як у Паўднёва-Заходняй Маскоўшчыне або ў Прыволскім узвышшы. Затое ў галодныя гады раптам зьнікае ўсё багацьце, усюды адчуваецца ўбоства і беднасьць.

Сярод насельнікаў Заволжа рашуча пераважваюць вялікарусы, паміж якіх шмат старавераў.

> Хаваючыся ад уціску маскоўскага ўраду, з даўных часоў стараверы ўцякалі сюды, у бязьлюдны стэп, і закладалі тут свае патаемныя суполкі і кляштары. Па берагох ракі Іргіз асабліва доўга існавалі старaверскія скіты, качанткова зьнішчаныя маскоўскім урадам толькі ў першых дзесяцігодзьдзях XIX в. У XVIII в. там зьбіраліся казакі-паўстанцы на чале з Пугачовым; там Пугачоў атрымаў благаславенства стараверскіх папоў на змаганьне з войскам Кацярыны II.

Апрача расійцаў у Паўночным Заволжы жыве шмат татараў, на ўсходзе—башкіраў, у сярэдняй частцы захаваліся астравочкі мардоўцаў, а на поўдні каля Волгі пасялілася шмат нямецкіх асаднікаў.

Як у Прыволскім узвышшы, гэтак і ў Заволжы галоўнай гандлёвай дарогай зьяўляецца Волга. Каля Волгі гуртуецца найболей густое насяленьне, на Волгу вязуць свае тавары сяляне ўсёй краіны, каля Волгі пабудаваліся галоўныя гарады.

Найвялікшым з гэтых гарадоў зьяўляецца *Самара* (150 тыс. нас.), якая ляжыць каля ўсходняга канца Самарскай лукі. Толькі тут і мог пабудавацца значны горад на левым беразе Волгі, бо толькі тут узгоркі, якія лічацца працягам Жыгулёў, стаяць у беспасрэднай блізкасьці ад ракі, тады як у іншых месцах удоўж левага берагу цягнуцца шырокія лугавыя нізіны, якія заліваюцца ў час веснавых разводзьдзяў. Праз Самару праходзіць чыгунка з Масквы ў Сібір, што выклікае шпаркі рост гандлю і прамысловасьці гораду. У звычайныя гады Самарская прыстань грузіць на волскія судзіны мільёны пудоў пшаніцы і іншага збожжа, табакі, лою, мыла і скуры. Вялікія паравыя млыны перарабляюць у Самары мільёны пудоў збожжа на муку. Зразумела, што ў галодныя гады гандаль і прамысловасьць прыходзяць у занядад.

На поўдзень ад Самары (між вусьцем Іргізу і Саратавам) каля левага берагу Волгі стаіць самая важная з нямецкіх асад—*Марксштат*-сталіца самаўраднай рэспублікі немцаў Паволжа. Яшчэ далей на поўдзень супроць Саратаву ляжыць бойкая гандлёвая прыстань—*Пакроўск*, даўней украінская слабада (30 тыс. насельн.).

**Казаншчына** ляжыць абапал сярэдняга цячэньня Волгі і абапал нізавіны Камы. На захадзе яе мяжой зьяўляюцца рэкі Сура і Вятлуга; на ўсходзе яна дасягае да сутокі Камы і Белай.

Гэтая краіна займае пасярэдняе месца паміж лесастэпам і стэпам Прыволскага ўзвышша ды Заволжа з аднаго боку і тайгой ды Прыуральскім краем—з другога. Тут, прыблізна ў асяродку краіны, злучаюцца дзьве найвялікшыя ракі Маскоўшчыны: Волга і Кама. Злучыўшыся, яны цякуць па роўнадзейнай лініі на поўдзень, але яшчэ на вялікай адлегласьці ад сутокі можна прасачыць каля левага берагу чыстую блакітную камскую ваду, а каля правага—каламутную жоўтую ваду волскай вышнявіны. Здаецца, нібы Кама і Волга не жадаюць зьліцца, хаця й цякуць у супольным рэчышчы.

Уся Казаншчына можа лічыцца нізінай, але правы бераг Волгі і тут, параўнаўча з левым, высокі і стромкі, і можа лічыцца працягам Фадзееўскіх гор з аднаго боку і Жыгулёў з другога боку.

Як у Прыволскім узвышшы, гэтак і ў Казаншчыне, Волга бязупынна точыць і размывае свой правы бераг і пакрысе перасоўвае сваё рэчышча ўсё далей управа, на паўднёвы захад. Гарады і вёскі, пабудованыя на правым беразе, патроху абурваюцца ў раку і мусяць перасоўвацца ўсё далей на паўднёвы захад. Наадварот, паселішчы, што ляжаць на левым беразе Волгі, патроху застаюцца ўсё далей і далей ад ракі.



Так, напрыклад, Казань даўней стаяла на самым беразе Волгі, а цяпер Волга цячэ за 5 вёрст ад яе, і толькі ў час разводзьдзяў волская вада дасягае да прадмесьцяў Казані.

На поўначы краіны ўдоўж левага берагу Волгі між Вятлугай і Камай грунты складаюцца з нанесеных Волгай пяскоў. Ніжэй Камы, на ўсход ад Волгі, ляжаць адклады прэснага возера, якое там калісьці было і, мусі-быць, мела сувязь з Касьпійскім возерам. Удоўж правага берагу Волгі на паверхні ляжыць лёэс. Ледавіковых адкладаў у Казаншчыне няма.

Клімат краіны параўнаўча з кліматам іншых мясцовасьцяй, якія ляжаць каля берагоў Волгі, найболей халодны.

Сярэдняя гадавая тэмпэратура ў Казані $+3^{0}$ Ц., студзень там мае сярэднюю тэмпэратуру—$13,8^{0}$, ліпень $+19,6^{0}$.

Вясна тут пачынаецца пазьней, як на вышнявіне і на нізавіне Волгі. З гэтай прычыны Волга тут узьнімаецца на тыдзень пазьней, як там. Ужо па волскай вышнявіне ідзе крыга, а сутока Волгі з Камай застаецца пад лёдам. Крыга вышнявіны забіваецца пад лёд, утвараецца лёдавы затор, і вада не знаходзіць сабе дарогі, выходзіць з берагоў і залівае ваколіцы. У травені ровень вады ў Волзе на 4-6 сажняў вышэй, як улетку.

У Казаншчыне яшчэ могуць расьці ліставыя дрэвы, прынамсі каля берагоў Волгі; гэта, можна сказаць, самы ўсходні куток пасу эўропэйскага мяшанага лесу. Аднак іглястыя лясы тут ужо пераважваюць, асабліва на поўнач ад Волгі і Камы. На поўдні краіны лясоў вельмі мала, там іх павысякаў і расьцерабіў чалавек. Голы, або пакрыты нівамі, правы бераг Волгі становіць рэзкую процілежнасьць лясному леваму берагу.

У адзнаку ад іншых частак Маскоўшчыны ў Казаншчыне вялікарусы складаюць толькі меншасьць мясцовага насяленьня. Патомкі першапачатковых фінскіх насельнікаў краіны тут, галоўным чынам на захадзе краіны, жывуць яшчэ шчыльнай групай, а не астравочкамі, раскіданымі сярод прастораў, залюдненых вялікарусамі. Да прыволскіх фінаў тут належаць марыйцы або чэрамісы, якія залюдняюць пераважна левы бераг Волгі між Вятлугай і Ілецьцю.

Ужо ў XIII в. ноўгародзкія славяне залажылі на іх зямлі свае першыя асады, і з таго часу марыйцы знаходзяцца пад вечнай пагрозай асыміляцыі маскоўцамі з аднаго боку і татарамі з другога. Яны аднак упарта змагаліся за сваю незалежнасьць і нават яшчэ ў XVII в. часамі паўставалі супроць маскоўскага ўраду і перарывалі зносіны між Масквой і Казаньню.

Малая частка марыйцаў жыве на правым беразе Волгі супроць вусьця Вятлугі. Гэта так званыя горныя марыйцы, якія адзначаюцца досыць высокім ростам, займаюцца пераважна ральніцтвам і падпалі пад мац-

нейшы ўплыў маскоўцаў. Агулам кажучы, марыйцы адзначаюцца плескаватым носам, выдатнымі скуламі і вузкім разрэзам вачэй. Большасьць марыйцаў, што жыве на левым беразе Волгі, займаецца паляваньнем, пчалярствам і рыбацтвам, ня любіць ваджацца з зямлёй і ня можа добра гаспадарыць. Марыйцы лічацца праваслаўнымі, але шануюць і Магомэта і сваіх старых паганскіх багоў, якіх часамі блытаюць з праваслаўнымі сьвятымі.

На паўднёвым захадзе Казаншчыны, на правым беразе Волгі між Сурой і Сьвіягай, жывуць чувашы, народ фінскага пахаджэньня, але ататараны, запазычыўшы ад татараў большую частку слоў сваёй мовы. Ад расійцаў чувашы запазычылі праваслаўную веру, але, як і марыйцы, яны захавалі шмат паганскіх звычаяў і поглядаў. Кволыя і няўклюдныя на погляд, чувашы аднак жывуць досыць заможна, старэнна выробляюць зямлю і сваёй працавітасьцю перавышаюць усіх сваіх суседзяў: маскоўцаў, марыйцаў, татараў і нават мардоўцаў.

З 1839 г. ў чувaскіх школах выкладаецца родная мова, і цяпер на чувaскай мове напісана ўжо досыць багатая літаратура, пераважна рэлігійнага зьместу, бо аб такой літаратуры болей за ўсё клапаціўся расійскі ўрад да рэволюцыі.

У сярэдзіне і на ўсходзе Казаншчыны большасьць насельніцтва складаецца з казанскіх татараў, якія па гарадох Маскоўшчыны распаўсюджыліся далёка за межы краіны. За межамі яны займаюцца гандлем, купляюць і прадаюць старую вопратку, працуюць, як парабкі, хурманы, грузчыкі і г. д.

У Казаншчыну татары надышлі ў XIII в., ататарылі камскіх балгараў і частку прыволскіх фінаў, якія жылі тут раней, а на месцы багатага Балгарскага царства, што панавала тут з X да XIII в., залажылі яшчэ болей магутнае Казанскае царства. Толькі ў XVI в. расійцы захапілі Казань і зруйнавалі Казанскую дзяржаву, але знайшлі тут сталую самастойную культуру. Выгоды географічнага палажэньня Казаншчыны на скрыжаваньні дарог з поўначы (Кама), з захаду (Вышняя Волга) і з паўдня (Ніжняя Волга) дапамаглі татарам дасягнуць такога экономічнага і культурнага разьвіцьця, што расійцы ня здолелі іх амаскаліць.

Татары ўпарта баранілі сваю культуру ад расійскіх уплываў. У сваёй вопратцы, звычаях і поглядах яны захавалі поўную незалежнасьць ад расійцаў. Магомэтанская вера, якой трымаюцца татары, забараняе есьці сьвініну, але яны ня грэбуюць затое канінай. У кожнай татарскай вёсцы ёсьць мячэць і школа-мэдрэсэ, у якой даўней мясцовы мула вучыў дзяцей паарабску; з часам у школах пачала выкладацца татарская мова. Ужо ў канцы XVIII в. зьявілася і пачало пашырацца самастойнае татарскае пісьменства.

Пасьля рэволюцыі Казаншчына падзялілася на тры самаўрадныя часткі: Татарскую самаўрадную рэспубліку на ўсходзе (2504 тыс. насельн.), 



Чувaскую самаўрадную краіну на паўднёвым захадзе (776 тыс. насельн.) і Марыйскую самаўрадную краіну на паўночным захадзе (371 тыс. насельн.).

Ува ўсіх трох гэтых частках галоўным заняткам насельнікаў зьяўляецца ральніцтва, асабліва сяўба жыта, аўсу і грэчкі.

Найлепей стаяла ральніцтва ў Чувaскай краіне, і толькі голад 1921 г. выклікаў заняпад гэтай багатай акругі. Поплавы левага берагу Волгі даюць найлепшую спажыву для жывёлы, і гадоўля авечак, коняй, кароў мае вялікую вагу як у татараў, гэтак і ў марыйцаў. Дастатнасьць жывёлы становіць грунт для фабрычнай прамысловасьці: шмат у якіх гарадох Татарскай рэспублікі існуюць буйныя і дробныя гарбарні, мылаварні, фабрыкі сьвечак і г. д.

Асновай багацьця краіны аднак можна лічыць гандаль. З Уралу па Каме сюды прывозяць руду і жалеза, з-пад Масквы па вышняй Волзе —крамніну, з Прыволжа па ніжняй Волзе збожжа. На гэтым гандлі грунтуецца значэньне галоўнага гораду краіны—*Казані* (158000 нас.). Горад гэты ляжыць на рэчцы Казанцы, але лічыцца волскай прыстаньню, хаця параходы прыстаюць у некалькіх вёрстах ад яго. У асяродку Казані захаваўся старасьвецкі крэмль-крэпасьць з вежай Сумбэкі—помнікам часоў Казанскага царства. Цяпер Казань ёсьць сталіцай Татарскай рэспублікі і важным культурным асяродкам. Казанскі унівэрсытэт (заложаны ў 1804 г.) адзін з найстарэйшых ува Ўсходняй Эўропе. Як гандлёва-прамысловы горад, Казань славіцца сваімі гарбарнямі і мылаварнямі, а таксама гандлем з Уралам, Сібірам, Сярэдняй Азіяй і Сярэдняй Маскоўшчынай.

Папярэднікам Казані па сваёй гандлёвай вазе быў да XIV веку горад Балгар, што ляжаў ніжэй вусьцяў Камы ў часы панаваньня ўва Ўсходняй Маскоўшчыне камскіх балгараў. Да гэтага часу захаваліся толькі руіны гэтага гораду.

Апроч Казані ў краіне мала значных гарадоў. Сталіца Чувaскага краю—*Чабаксары*, і сталіца Марыйскага краю *Краснакакшайск* могуць паводле сваёй велічыні раўняцца хіба з дробнымі мястэчкамі Беларусі.

Большую вагу маюць *Чыстапаль* (21000 нас.) на Каме і *Сарапул* (25000 нас.), што ляжыць ужо за межамі Татарскай рэспублікі. Блізка ад Сарапулу на мяжы з Прыуральскім краем ляжаць: *Воткінск* (24500 нас.) з жалезнымі гутамі, фабрыкамі паравозаў, параходаў і сельска-гаспадарчых прылад, і *Іжаўск* (52000 нас.), сталіца Воцкага краю (глядзі агляд тайгі) з вялікай фабрыкай зброі.

У будучыне можна чакаць разьвіцьця прамысловасьці ў *Сьвіяску*, што ляжыць каля сутокі Волгі і Сьвіягі. Там будзе пабудована вялікая электрычная станцыя, якая будзе карыстацца торфам, як апалам. Гэтая станцыя змэханізуе ўсю мясцовую мылаварную, скураную і інш. прамысловасьць.

# Украіна.

(Азнач географічнае палажэньне. Пералічы старонкі і краіны, з якімі Украіна мяжуецца. Якое мора абмяжоўвае Украіну з паўдня?).

На паўднёвы захад ад Паўднёвай Маскоўшчыны між вусьцямі Дону і Карпатамі расьцягнулася Украіна, самая багатая, вялікая і самая тыповая частка паўднёвага пасу Ўсходняй Эўропы.

З захаду на ўсход ад Карпат да р. Данца па сярэдзіне Украіны цягнецца яе аснова — старадаўны гранітны груд. Калісь гэты гранітны груд быў запраўдным горным ланцугом, але з таго часу прайшло многа мільёнаў гадоў; вада і выпятрэньне зрабілі сваю справу — бязмаль дашчэнту зруйнавалі ўкраінскі ланцуг. З цягам часу гранітны ланцуг зусім зьнізіўся, і нават усю Украіну пакрыла скрозь вада мора. Калі затым Украна зноў паднялася над роўнем мора і зрабілася сухазем‘ем, дык уся яна была ўжо пакрыта грубым пластом морскіх адкладаў. Паверх гэтых адкладаў у ледавіковы пэрыод у Паўночнай Украіне адклаўся пласт морэн, але нідзе гэты ледавіковы навал не выступае на паверхню. Паўсюды на паверхні Украіны адклаўся яшчэ пласт лёэсу. Морскія ды ледавіковыя адклады і лёэс пакрылі Украіну паземнымі пластамі, пад якімі схаваліся ўсе даўнейшыя няроўнасьці старонкі, у тым ліку і гранітны ўкраінскі груд.

Краявід Украіны залежыць галоўным чынам ад асаблівасьцяй самага павярхоўнага пласту, ад асаблівасьцяй лёэсу. Раўчакі, яры і рэкі, якія тут утварыліся з раўчакоў, густой сеткай пакрываюць Украіну. Рэкі прамылі сабе глыбокія даліны ў мяккіх пластох і часамі ўрэзаліся ў гэтыя пласты аж да самай іх гранітнай падставы. Такім чынам агаліўся ў рэчных далінах стары ўкраінскі гранітны груд і затрымаў далейшае ўразаньне рэчышчаў у земную кару. Рэкі адхіліліся на ўсход, пачалі абыходзіць груд, але нарэшце некаторыя з іх здолелі прабіцца праз яго і так-сяк трапілі да мора. Асабліва выразна адхіляецца гранітным грудом на ўсход галоўная рака Украіны—Дняпро. У тым месцы, дзе Дняпро прабіваецца праз груд, утварыліся слынныя дняпроўскія парагі, у якіх магутная рака з страшэннай шпаркасьцю імкнецца паміж спрадвечных крышталічных скал і іх адломкаў. Выплыўшы на нізіну, спусьціўшыся з гранітнага ланцуга, Дняпро ды іншыя ўкраінскія рэкі, большасьць якіх цячэ наагул на поўдзень у Чорнае мора, супакойваюцца, цякуць павольна, а каля самага мора ўтвараюць шырокія, але мелкія вусьці, так званыя ліманы, падобныя да вазёр або морскіх затокаў (з несалонай вадой), перад якімі морскія хвалі накідваюць пескавыя гакі. Ліманы вялікіх рэк — Днястра, Бугу і Дняпра, хаця і аддзелены ад мора пескавымі гакамі, але маюць праходы ў моры—так званыя горлы; ліманы дробных рэк зусім адлучаюцца ад мора, ператвараюцца ў ляморскія вазёры з салонай вадой, з якой што-год на дно ліману асядае новы пласт солі. (Пералічы адзначаныя на карце рэкі Украіны з іх галоўнымі прытокамі).



Клімат Украіны вільгатнейшы, як у Паўднёва-Ўсходняй Маскоўшчыне, але наагул сухі, з вялікімі хістаньнямі тэмпэратуры. Узімку маразы там прыблізна такія-ж, як і на Беларусі, або нават яшчэ большыя, ня гледзячы на меншую географічную шырыню (сярэдняя тэмпэратура студзеня ад—4 да—8° Ц.), але затое ўлетку гарачыня без параўнаньня большая, як у нас (у ліпені сярэдняя тэмпэратура на паўночным захадзе+20°, на паўднёвым усходзе+23°). Марозная пара трывае 3—4 месяцы, цёплая (з тэмпэратурай сутак вышэй за+10°)—каля паўгодзьдзя. Узімку вятры дзьмуць пераважна з паўночнага ўсходу і прыносяць мала сьнягоў. З гэтай прычыны маразы прыносяць яшчэ болей шкоды, бо сьнег не засланяе глебу ад прамярзаньня. Улетку таксама адчуваецца недахват дажджу. Найболей дажджоў выліваецца ў чэрвені, але і тады яны маюць характар улеваў, вада іх сьцякае па ўсохлым, ацьвярдзелым грунце і не пасьпявае як трэба прамачыць глебу.

У зьвязку з гэтым тут кепска растуць дрэвы. Уласна кажучы, дрэвы яшчэ маглі-б вытрымаць сухасьць, але ім перашкаджае вялікі процант шкодных соляй і вапны, якімі багаты грунты Украіны. Маладыя дрэвы, карэньні якіх яшчэ не пасьпелі ўглыбіцца ў багатыя солямі слаі грунту, а трымаюцца ў вышніх выпаласканых слаёх глебы, растуць на Украіне добра, але як толькі карэньні дасягнуць глыбейшых слаёў, у якіх вада не пасьпела выпаласкаць соль і вапну, дрэва пачынае сохнуць і гіне. З гэтай прычыны спачатку ўся Украіна была пакрыта бяздрэўным кавыльным стэпам. Аднак з цягам часу на поўначы каля рэк ды ў ярох, дзе веснавыя разводзьдзі добра прамываюць зямлю і выпаласкваюць з яе соль і вапну, пачалі зьяўляецца дрэвы, пераважна дубы і іншыя шыракаліставыя віды. Там, дзе раз утварыўся лес, там вада ўжо ня так хутка сьцякае, як у стэпе. Лес затрымоўвае раставаньне сьнягоў увясну, дапамагае павольнаму прасякненьню вады ў грунт. З гэтай прычыны лес дапамагае далейшаму выпаласкваньню соляй з грунту, і такім чынам сам нібы прачышчае сабе дарогу. Лес пашыраецца, захапляе ўсё новыя прасторы і выціскае стэпавую расьліннасьць. Так патроху ўся паўночная паласа Украіны пакрылася лесам, або, дакладней кажучы, перавярнулася ў лесастэп, па якім дубовыя гаі чаргуюцца з плямамі бяздрэўнага кавыльнага стэпу. Запраўдным стэпам можна лічыць толькі паўднёвую паласу Украіны, што цягнецца на поўдзень ад гранітнага груду аж да берагоў Чорнага і Азоўскага мораў. Там дрэўныя расьліны сустракаюцца толькі ў раўчаках, дый то звычайна маюць выгляд маленькіх хмызьнячкоў.

Усюды, дзе растуць або расьлі стэпавыя травы, утварылася ўрадлівая чорназемная глеба. Прухнучыя травы ператвараюцца ў перагной, мяшаюцца з суглінкавымі часткамі лёэсу, і такім спосабам пераварачваюць вышні слой лёэсу ў чорназем. Па сярэдзіне Украіны з захаду на ўсход цягнецца шырокая паласа асабліва тлустай глебы, якая зьмяшчае 6—10 і болей процантаў перагною. На поўначы, на мяжы з Беларусьсю, дзякуючы большай колькасьці лясоў, глеба мае сьвятлейшы колер. Грунтавая вада пасьпела

там раскласьці і выпаласкаць значную частку перагною, так што там яго засталося 3-6%. Гэта так званы паўночны чорназем і шэрыя лясныя глебы, якія сустракаюцца і на Беларусі. Таксама і на поўдні Ўкраіны, дзе стэп складаецца з горшай травы і часамі пераходзіць у саланчакі, таксама глеба горшая. Чорназем там завецца чакалядным і каштанавым і зьмяшчае толькі 4-6% перагною.

Агулам кажучы, зямля паўсюды вельмі ўраджайная, і ральніцтва паўсюды дае вялікую карысьць. Зразумела, што пры такіх варунках плуг знайшоў дарогу ўва ўсе куты старонкі, а нечапаныя стэпы і большасьць лясоў украінскага лесастэпу даўно замяніліся нівамі. Неўраджаі здараюцца тутака рэдка, дый украінцы прызвычаіліся змагацца з сухменямі. Земляробская культура стаіць тут вышэй, як у Маскоўшчыне. На ўсю Эўропу Ўкраіна можа лічыцца самай багатай на пшаніцу старонкай. Пшаніца тут зьяўляецца галоўным збожжам. Гэтым Украіна адразьняецца ад Дунайскіх нізін, дзе пераважваюць кіяхі, і ад Паўднёвай Маскоўшчыны, дзе болей сеюць жыта. Проса, табака, цукровыя буракі і каноплі, якія вымагаюць добрай глебы і сонечнага лета, знаходзяць на Ўкраіне найлепшыя для сябе варункі. Для алею сеюць каноплі, сонечнік, лён і рапс (расьліну, падобную да сьвірэпкі).

Звычайнае гародніцтва на Ўкраіне не пашырана; затое на поўдні вялікую вагу маюць баштаны, вялікія гароды, на якіх сеюць кавуны, дыні, гарбузы, гуркі. Вельмі любяць украінцы садоўніцтва. Каля кожнай хаты, дзе толькі могуць расьці дрэвы, саджаюць яблыні, грушы, сьлівы і вішні, але пакуль што прамысловую вагу садоўніцтва мае толькі ў некаторых маленькіх куточках.

Гадоўля жывёлы ў апошнія часы адыходзіць на другі плян, адступае перад земляробствам. Прынамсі гадоўля авечак лепшых гатункаў з мяккай тонкай воўнай у апошнія часы значна зьменшылася. Аднак і да гэтага часу ўкраінскія коні, авечкі, быдла, сьвіньні карыстаюцца славай і вывозяцца за межы.

Украіну часамі завуць залатым дном Усходняй Эўропы. Запраўды, гэтая надзвычайна ўраджайная старонка зьяўляецца адным з багацейшых краёў сьвету. Вялізныя багацьці хаваюцца і пад зямлёй на Ўкраіне. Тут знаходзяць найлепшыя гатункі жалезнай руды, каменнага вугалю, ёсьць тут і соль, і нафта, і медзь, і манган, і жывое серабро. Але гэтыя багацьці мала асочаны і яшчэ ня выкарыстаны належным чынам. Толькі ў апошнія гады ў каменнавугальных акругах пабудаваліся буйныя гуты і фабрыкі.

Палажэньне Ўкраіны зьяўляецца вельмі выгодным для замежнага гандлю. Украіна ляжыць над Чорным морам, якое нават каля берагоў замярзае толькі на некалькі тыдняў. Да гэтага мора кіруюцца і галоўныя прыродныя дарогі Ўкраіны—рэкі. Украінскае збожжа, жывёлу і іншыя мясцовыя тавары лёгка па рэках і чугунках даставіць да Чорнага мора, а адтуль у Заходнюю Эўропу. Цераз Украіну па Дняпры вывозіцца ў Між-



земнаморскія краіны і беларускае дрэва. Праз прыстані Чорнага мора вывозіцца большая частка ўсхдня-эўропэйскіх тавараў, тады як Балтыцкае мора служыць пераважна для прывозу тавараў ува Ўсходнюю Эўропу з захаду. Аднак замежны гандаль Украіны заўсёды знаходзіўся ў руках чужаземцаў, а сталы ўнутраны гандаль—у руках жыдоў. Украінскае сялянства прымае ўдзел галоўным чынам толькі ў кірмашовым гандлі, дый на кірмашох украінцы ня любяць заклікаць пакупцоў і задавальняюцца ціхамірным чаканьнем таго моманту, калі да іх возу падыдзе штосьці купляць жыд, масковец або цыган.

У даўнейшыя часы ўкраінцы любілі так званы чумацкі гандаль—пераезды з таварамі на валох з аднаго канца старонкі ў другі, але ў апошнія часы гэты гандаль зьнік з прычыны разьвіцьця чыгунак, і тавары перавозяцца або па рэках, або па чыгунках.



Мал. 104.—Украінская дзяўчына.

Украінцы (на захадзе іх часьцей завуць русінамі, на ўсходзе часам яшчэ маларусамі), якія паўсюды становяць большасьць насяленьня старонкі, належаць, як маскоўцы і беларусы, да ўсходня-славянскіх народаў. Ад беларусоў і маскоўцаў яны адразьняюцца высокім ростам, цямнейшым колерам скуры і вачэй і пераважна чорнымі валасамі. Параўнаўча з маскоўцамі яны зьяўляюцца болей чыстымі славянамі, але ад беларусоў адразьняюцца падмешкай крыві розных туркскіх народаў, якія вандравалі калісь па ўкраінскім стэпе. Вынікам гэтай прымешкі можна лічыць спакойны, ціхамірны нораў украінца. Паважнасьць, дасьціпнасьць, філёзофскі пагляд на акалічнасьці, адсутнасьць маскоўскай рухавасьці і прагавітасьці, упартасьць зьяўляюцца галоўнымі адзнакамі ўкраінцаў. Аднак у свой час, напрыклад, на вячорках, украінец з захапленьнем аддаецца вясёласьці, гульням і скокам. Становішча кабеты ў украінскай сям'і лепшае, як у маскоўскай, і наагул украінец ня ведае дэспотызму. Зямлёй украінцы ўладаюць пераважна падворна, а ня супольна ўсёй вёскай, як маскоўцы. Польную працу ўкраінец уважае болей за ўсе іншыя заняткі, вырабляе зямлю старэнна, значна лепей, чымся масковец. Аднак багацьце глебы не вымагае ад яго такой цяжкай працы, якую прыкладае да сваёй нівы беларус. У вопратцы, у страве, у мяшканьні, ў будоўлі праглядвае добры густ і ахайнасьць украінца. Вёскі і хутары складаюцца з чыстых, прыгожых і

прытульных хат-ляпянак, зробленых з гальля і гліны і заўсёды пабеленых вапнай. Каля хат звычайна засаджаны газоны пярэстых кветак і садочкі вішнёвых дрэў.

Украінская мова, як і польская, беларуская або расійская, зьяўляецца асобнай славянскай мовай, багатай і прыгожай, прыемнай для вуха, зьмяшчае мала чужаземных слоў. Народная поэзія ўкраінцаў па колькасьці, зьместу й мілагучнасьці песень, казак і прыказак можа раўняцца з беларускай і значна перавышае народную поэзію палякоў або расійцаў. Украінскія пісьменьнікі (Шаўчэнка, Куліш, Коцюбіньскі, Віньнічэнка і іншыя) могуць лічыцца аднымі з лепшых славянскіх пісьменьнікаў. Аднак як на Беларусі, гэтак і на Ўкраіне многа вякоў панавалі чужынцы, якія лічылі ўкраінскую мову мужыцкай, хлопскай, простай. Палякі казалі, што ўкраінская мова ёсьць адна з польскіх гаворак, маскоўцы звалі яе сапсутай расійскай. Паўкраінску забаранялася вучыцца, і гэта адбілася на становішчы асьветы. Украінцы паводле асьветы стаяць значна ніжэй за палякоў, процант няпісьменных на Ўкраіне такі-ж вялікі, як у Маскоўшчыне.

З вельмі даўных часоў багаты на траву ўкраінскі стэп прываблівау вандроўнікаў з Сярэдняй Азіі. Горды іх адна за аднэй навальваліся на Ўкраіну, пасьвілі свае статкі па стэпе і перасяляліся далей цераз Карпаты ў Вугоршчыну і Заходнюю Эўропу. Яшчэ задоўга да хрысьціянскай эры грэцкі вучоны Гэродот пісаў аб тым, што па ўкраінскіх стэпах вандравалі нейкія скіты. У часы вялікіх перасяленьняў праз Украіну пранесьліся гуны, якія зруйнавалі потым вялікую Рымскую імпэрыю. Нават тады, як сюды надышлі і тут асталяваліся славяне, продкі сучасных украінцаў, нават і тады сюды надыходзілі вобры (авары), хазары, вугры, торкі, печанегі, полаўцы, нарэшце татары, разбурвалі дауна-славянскія гарады і вёскі Ўкраіны, руйнавалі ўкраінскую аселасьць і культуру, але самі хутка рассыпаліся, падпадалі пад культурны ўплыў славянаў і зьнікалі ў моры ўкраінцаў, зьліваліся з імі ў адзіны народ.

Долей за ўсё пратрымаліся на Ўкраіне татары; у працягу вякоў яны аддзялялі ўкраінцаў ад мора і затрымоўвалі іх культурнае разьвіцьцё. Ад драпежных вандроўнікаў украінцы мусілі хавацца на поўначы сваёй старонкі, там, дзе ў тыя часы яшчэ існавалі вялікія лясныя пушчы. Там утварылася і першая ўкраінская дзяржава—Кіеўскае вялікае княства, уладу якога прызнавалі ня толькі ўсе ўкраінцы, але нават і вялікарусы Ноўгараду і Мураму. Цяжар татарскай няволі аслабіў магутнасьць Украіны, якая з цягам часу падпала пад валадарства Літоўска-Беларускай, а потым Польскай дзяржавы. Пад уладай Польшчы Ўкраіне прышлося кепска. Палякі апалячылі ўкраінскую шляхту, павыціскалі з гарадоў мяшчанства, прымацавалі да зямлі сялянства. Між тым крымскія татары, як і даўней, нападалі на Ўкраіну, а палякі не маглі абараніць яе. Тады за абарону бацькаўшчыны ўзяліся самі ўкраінцы. Паднявольныя сяляне Рэчы Паспалітай, як беларускага, гэтак і ўкраінскага пахаджэньня, уцякаючы ад панскага прыгону, высяляліся на



паўднёвыя межы даўнай Польшчы, будавалі тамака ўмацаваньні, пад заслонай якіх аралі зямлю, займаліся паляваньнем, рыбацтвам, а часамі й рабункам. Так утварылася слыннае казацтва, на чале якога стаялі запароскія казакі, што жылі ніжэй парагоў на Дняпры. Казакі біліся з татарамі, рабавалі жыдоў, а часамі падымалі паўстаньні супроць улады польскіх паноў. Самым удалым з гэтых паўстаньняў было паўстаньне Багдана Хмяльніцкага, вынікам якога было аднаўленьне незалежнай Украінскай дзяржавы, стварэньне так званай Гэтманшчыны. Аднак хутка зноў Украіна падпала пад панаваньне чужынцаў. Усходняя яе частка аддалася Маскоўшчыне, заходняя частка заставалася пад Польшчай. Спробы лепшых сыноў Украіны ўтварыць зноў самастойную Украінскую дзяржаву былі няўдалымі. Пасьля падзелаў Польшчы большая частка Ўкраіны дасталася маскоўцам, і толькі заходняя Падкарпацкая Ўкраіна пад назовам Усходняй Галіччыны або Чырвонай Русі адышла да Аўстра-Вугоршчыны.

Пасьля войнаў сусьветнай і расійска-польскай (1920 г.) заходняя частка Ўкраіны (так званая Надднястранская Ўкраіна, Холмшчына і Заходняя Валынь) адышлі да Польшчы і Румыніі; рэшта пад назовам Украінскай ССР (448000 кв. клм., 27200 тыс. насельнікаў) увайшла ў склад Саюзу Савецкіх Социялістычных Рэспублік (СССР).

Паводле асаблівасьцяй прыроды Ўкраіну можна падзяліць на 6 частак: 1) Заходнюю Ўкраіну або Падкарпацьце, 2) Правабочную Ўкраіну, 3) Левабочную Ўкраіну, 4) Слабажаншчыну, 5) Данеччыну і 6) Чорнаморскі нізінны стэп або Паўднёвую Ўкраіну.

**Заходняя Ўкраіна** зьяўляецца слаба хвалістым плоскаўзвышшам у 300—475 м. н. р. м. вышыні. Ужо тут каля самых Карпат пачынаецца старадаўны гранітна-гнэйсавы ўкраінскі груд, але тут ён ляжыць глыбока пад пазьнейшымі морскімі адкладамі і грубым пластом лёэсу. Глыбокія даліны рэк урэзаліся ў Заходня-Украінскае плоскаўзвышша і месцам на сваім дне агаляюць спрадвечныя скалы гранітнага груду. Галоўная з гэтых далін—даліна вышнявіны Днястра—аддзяляе так званае Падгор'е ад Падольска-Галіцкага плоскаўзвышша. Першае ляжыць каля самых Сярэдніх Карпат, другое цягнецца ўдоўж левага берагу Днястра і пераразаецца многалічнымі левымі прытокамі гэтай ракі. На паўночным захадзе Падольска-Галіцкае плоскаўзвышша пераходзіць у так званае Расточа, якое ўразаецца між Бугам і Вепрам, між Беларусьсю і Польшчай.

Параўнаўча з іншымі часткамі Ўкраіны Заходняя Ўкраіна адзначаецца лагаднейшым, мякчэйшым і вільгатнейшым кліматам. Дажджу і сьнегу тут выпадае болей за 600 мілім. што-год, значна болей, як у рэшце Украіны.

Львоў, што ляжыць у асяродку краіны, мае сярэднюю гадавую тэмпэратуру $+6{,}9^0$, сярэднюю студзеня — $4{,}6^0$, ліпеня $+18{,}0^0$. Чарноўцы, на паўднёвым усходзе, адпаведна маюць $+7{,}6^0$, $-5{,}4^0$, $+19{,}7^0$.

Тут можа расьці бук, сустракаецца і ціс або нягной-дрэўка, тыповыя заходня-эўропэйскія дрэвы. Лясоў тут наагул захавалася многа болей, як у іншых частках Украіны, яны тут пакрываюць прыблізна чвэрць усёй паверхні. Аднак букавыя і дубовыя лясы тут чаргуюцца з кавалкамі стэпу, а быў час, што стэп панаваў паўсюды, так што паўсюды ўтварылася стэпавая чорназемная глеба.

Дзякуючы дастатнасьці лясоў і малой грубасьці сьнегавога насьцілу рэкі Заходняй Украіны ўвясну не разьліваюцца так шырока, як на ўсходзе. Затое часамі, дзякуючы вялікай колькасьці летніх ападкаў, тут здараюцца летнія паводкі. Гэтым, як і прысутнасьцю такіх расьлін, як бук і ціс, краіна нагадвае Заходнюю Эўропу.

Насельнікі Заходняй Украіны складаюцца з украінскіх пляменьняў: бужанаў у Расточы, падгаранаў у Падгор'і, падалянаў на Падольска-Галіцкім плоскаўзвышшы. Апрача таго па гарадох жывуць палякі, жыды, немцы, а на поўдні яшчэ і румыны. Тутэйшыя ўкраінцы трымаюцца пераважна вуніяцкай веры. Царкоўную вунію яны прызналі тады-ж, як і беларусы, але ў Заходняй Украіне, якая не належала да Маскоўшчыны, гэтая вунія захавалася, тады як у нас і ўва Ўсходняй Украіне маскоўцы прымусам перавярнулі вуніятаў у праваслаўную веру.

У склад Заходняй Украіны ўваходзяць тры провінцы, з якіх кожная мела асобную гісторыю ў працягу апошні вякоў. Паўднёвы куток краіны—так званая Паўночная Букавіна—належала раней да Малдаўскага княства; у 1775 г. яе захапіла Аўстрыя, а пасьля сусьветнай вайны—Румынія. Рэшта Заходняй Украіны належала ў XVIII в. да Польшчы; у 1772 г. большая яе частка, так званая Чырвоная Русь або Ўсходняя Галіччына, адышла да Аўстрыі, а пасьля сусьветнай вайны і ўпартага нацыянальнага змаганьня зноў увашла ў склад Польскай дзяржавы. Паўночная частка—частка Расточа, якая завецца Холмшчынай—разам з усім так званым Царствам Польскім адышла да Расіі пасьля 1812 г. Незадоўга перад вайной яна была вылучана ў асобную Холмскую губэрню і абвешчана неаддзельнай часткай Расіі, а пасьля вайны зноў адышла да Польшчы. Становішча ўкраінскага сялянства ў краіне заўсёды было цяжкім, бо заўсёды польскія паны і ўраднікі панавалі ў Заходняй Украіне, але пад уладай Аўстрыі ўкраінцам жылося ўсё-ж такі лепей, як пад уціскам маскоўцаў, бо аўстрыякі прынамсі не забаранялі ўкраінцам навучаць сваіх дзяцей у роднай мове. Ува Ўсходняй Галіччыне з гэтай прычыны больш-менш вольна разьвівалася ўкраінская культура, існавалі ўкраінскія школы, гурткі, коопэратывы. У апошнія перад вайной гады Ўсходняя Галіччына была праўдзівым асяродкам украінскага руху.

Як і ўсе ўкраінскія землі, Заходняя Ўкраіна зьяўляецца багатай земляробскай краінай. Праўда, ля Днястра вялікія абшары пакрыты пяскамі і балотамі, але па вышэйшых месцах на лёэсе ўтварылася ўраджайная чорназемная глеба. Там добра ўзрастаюць пшаніца, кіяхі ды іншае збожжа;



вялікія прасторы засяваюць цукровымі буракамі, табакай; для алею сеюць лён. На ральніцтве грунтуецца апрацоўчая прамысловасьць: млынарства, цукраварства, бравcovарніцтва і выраб тытуну. Па поплавах каля рэк пасьвяцца лепшыя гатункі быдла і коняй; у Падгор'і некаторую вагу маюць лясныя заняткі. Аднак і мінэральныя багацьці краіны вельмі вялікія. У падгор'ях Карпацкага ланцугу трапляецца нафта, соль, земны воск (озокэрыт). Асабліва многа нафты здабываюць у мястэчку Барыслаў каля места Дарагабыч, у якім з гэтай нафты вырабляюць газу, бэнзыну і г. д. Соль здабываецца з многалічных салоных крыніц, якія сьведчаць аб прысутнасьці пад зямлёй солярродных пластоў. Асяродкам здабываньня звычайнай солі трэба лічыць невялікае места Калуш.

Самы вялікі горад Заходняй Украіны—*Львоў* (220000 насельн.)—ляжыць у самым асяродку краіны на скрыжаваньні чыгунак, якія йдуць з Польшчы ў Румынію і з Усходняй Украіны ў Вугоршчыну. Горад залюднены пераважна палякамі, аднак гэта адначасна важны асяродак украінскага нацыянальнага руху з многалічнымі культурна-асьветнымі ўстановамі, гурткамі, украінскімі кнігарнямі і г. д. Тут жыве і мітрополіт галіцкі, начальнік вуніяцкага духавенства. Ад часу аўстрыйскага панаваньня тут існуе унівэрсытэт, даўней нямецкі, з некалькімі ўкраінскімі катэдрамі, цяпер—польскі.

Другі горад Заходняй Украіны паводле велічыні—*Чарноўцы* (або Чарнавіцы з 93000 нас.), што ляжыць на рацэ Прут у Букавіне або, як яе яшчэ іначай завуць, на Зялёнай Русі. Горад цяпер належыць да Румыніі. Тут таксама ёсьць унівэрсытэт, які застаўся ад часоў панаваньня аўстрыякаў.

**Правабочная Ўкраіна** ляжыць на правым беразе галоўнай украінскай ракі Дняпра і цягнецца на захад ад Дняпра аж да прытокі Днястра Збруч і вышнявіны Бугу.

З Заходняй Украіны сюды між Днястром і Бугам уваходзіць Падольскае плоскаўзвышша, якое можа лічыцца паўднёвым схілам Украінскага гранітна-гнэйсавага груду. Паўночным схілам гэтага груду зьяўляецца ўзвышша Валыні, якое спачатку няпрыметна, а потым зрывіста спадае на поўнач у бок нізінных балотных прастораў Палесься. Зрывістая прыступка Валынскага ўзвышша, якая сьцяной уздымаецца над Палесьсем, завецца Аўратынскімі гарамі і на ўсходзе мае свой працяг, які пад назовам Каменнай грады цягнецца аж да Дняпроўскіх парагоў. Каменная града, уласна кажучы, і ёсьць тэй часткай украінскага старадаўнага груду, якая адхіляе на ўсход сярэдняе цячэньне Дняпра. Гранітна-гнэйсавыя скалы ўкраінскага груду шмат у якіх месцах пакрыты пазьнейшымі морскімі адкладамі і разам з гэтымі адкладамі хаваюцца на поўначы пад ледавіковым навалам і лёэсам, а на поўдні толькі пад лёэсам, бо ледавік дасягаў толькі да сярэдзіны ўкраінскага груду, да самага яго хрыбта. Краявід Правабочнай Украіны залежыць галоўным чынам ад уласьцівась-

цяй лёэсу, які дадае краіне выгляд роўнага, гладкага плоскаўзвышша, зрэзанага раўчакамі, ярамі і рэчнымі далінамі. Толькі ў гэтых глыбока ўрэзаных у грунт ярох і далінах на дне часамі выглядаюць на паверхню гранітныя і гнэйсавыя скалы ўкраінскага груду. У залежнасьці ад уласьцівасьцяй лёэсу рэчныя даліны маюць зрывістыя сьценкі, якія лёгка размываюцца, адзначаюцца частымі абурэньнямі, абваламі і спаўзаньнем грунту на ніз. Зрывістым, высокім, бязмаль-што горным выглядае і правы бераг Дняпра, які можа лічыцца ўсходняй мяжой краіны і ўсходнім схілам усяго Прыкарпацкага ўзвышша, якое абымае Заходнюю і Правабачную Украіну.



Мал. 105.—Львоў. Марыяцкі пляц.

Клімат у Правабочнай Украіне сушэйшы, як у Заходняй. Ападкаў тут выпадае меней (500-600 мілімэтраў), зіма значна халаднейшая, лета крышку цяплейшая.

Сярэдняя тэмпэратура году ў Кіеве +6,8°, сярэдняя студзеня—6,2°, ліпеня+19,2°.

Тут ужо няма букавых лясоў, не сустракаецца і цісу, але й тут стэп чаргуецца з дубовымі ды грабавымі гаямі. На Валыні лясоў захавалася яшчэ многа. Ня гледзячы на тое, што вялікую частку іх павысякалі, выкарчавалі і ўзаралі, нават цяпер пад лясамі там засталося каля трэцяй часткі ўсёй паверхні. На поўдні лясоў меней і там яны туляцца каля рэк і яроў, а на вадападзелах там пануе бяздрэўны кавыльны стэп.



Затое там асабліва ўраджайная чорназемная глеба. Нідзе чорназем не залягае такім грубым пластом, як на Падольскім плоскаўзвышшы. Зямля зусім не вымагае гною і дае надзвычайныя ўраджаі. Па некаторых месцах бязьзьменна што-год сеюць пшаніцу, і толькі за многа гадоў можна прымеціць, што ўраджаі робяцца горшымі. Аруць зямлю цяжкім плугам, у які запрагаюць па некалькі пар валоў. У буйных маёнтках, якіх тут было шмат да рэволюцыі, сустракаюцца і паравыя плугі. Як і ў Заходняй Украіне, тут ня толькі заўсёды хапае збожжа для мясцовай люднасьці, але заўсёды лішкі збожжа ў вялікай колькасьці вывозяцца за межы. Больш за ўсё сеюць пшаніцы-азімкі; на поўначы да яе далучаецца жыта; у ярыне пачэснае месца займае проса, на поўдні—кіяхі; бульбы сеюць многа толькі на поўначы, на межах з Беларусьсю. Каля сядзіб сяляне сеюць шмат табакі і канапель, значна болей, чым у нас на Беларусі. Па маёнтках і часткай па сялянскіх гаспадарках вялікія прасторы засяваюцца цукровымі буракамі. Сяляне сеюць гэтую расьліну ў невялікай колькасьці, а ўраджай прадаюць на цукраварні пры маёнтках; затое ў маёнтках цукровыя буракі месцам даюць галоўны прыбытак і зьяўляюцца найважнейшай расьлінай. Значную вагу мае баштанства, засеў гуркоў, гарбузоў, дынь і кавуноў. Каля вёсак сяляне саджаюць вішнёвыя ды сьліўныя садочкі, а па дварох часамі спатыкаюцца сады яблынь і йгруш, часамі па некалькі дзесяцін прасторай кожны. Любяць украінцы і пчалярства, але нізкі ровень асьветы перашкаджае сялянству сачыць за навінамі ў пчалярстве, і цяпер гэтая галіна сельскай гаспадаркі заняпала.

Без параўнаньня большую вагу мае гадоўля коняй і быдла, для польнай працы трымаюць слынных доўгарогіх вялікіх і здаровых украінскіх валоў; на мяса гадуюць вельмі добрае чаркаскае быдла, якое адгэтуль вывозіцца як у Маскоўшчыну, гэтак і ў Заходнюю Эўропу. Калісь, яшчэ тады, як галоўным спосабам ральніцтва быў дзірванны спосаб (што гэта за спосаб?), па папары пасьвіліся найлепшыя авечкі з мяккай воўнай, але цяпер колькасьць авечак зьменшылася, а якасьць пагоршылася. Затое на сьвіньні краіна вельмі багата. Асабліва многа сьвіней на Валыні, дзе іх жывяць жалудамі і пасьвяць па дубовых гаёх. Сала вывозіцца за межы ў яшчэ большай колькасьці, як з Беларусі. Многа вывозяць з краіны і продуктаў гадоўлі хатніх птушак: жывых і забітых курэй, гусей, пер'е, пух, яечкі. Наагул усе галіны сельскай гаспадаркі стаяць тут вельмі добра і даюць многа рэчаў для вывазу.

Затое апрацоўчая прамысловасьць накіравана на пераапрацоўку выключна вясковых продуктаў. Найвялікшую вагу маюць цукраварні, якія задавальнялі цукрам, прынамсі да вайны, усю Маскоўшчыну і Беларусь ды яшчэ вывозілі цукер у Заходнюю Эўропу. Асабліва вялікія цукраварні існуюць у мястэчку Сьмела. Апрача таго тут многа буйных паравых млыноў, алеянь, бравароў і г. д.

Правабярэжная Ўкраіна—ядро Ўкраіны, калыска Украінскай дзяржавы і ўкраінскай культуры. Многалічныя гарадзішчы ды курганы раскіданы па ўсёй краіне і гаворацъ аб слаўнай мінуўшчыне гэтага краю.

Тут калісь асталяваліся тыя славянскія пляменьні, якія далі пачатак украінскаму народу; тут утварылася першая Ўкраінская дзяржава—Кіеўскае вялікае княства, тут у лясох хаваўся ўкраінскі люд ад наступаў татар; тут утварылася слаўнае казацтва, якое ў XVII в. здабыло незалежнасьць Украіны пад кіраўніцтвам гэтмана Хмяльніцкага.

У 1654 г. яшчэ пры Хмяльніцкім казацтва прызнала над Украінай уладу маскоўскага цара, які абяцаўся захаваць вольнасьці ўкраінскага народу і казацтва. У хуткім часе расійцы аднак зьменшылі правы Украіны, нават аддалі Правабочную Ўкраіну Польшчы, а ў Левабочнай пачалі прыгнятаць украінцаў. Калі пасьля падзелаў Польшчы да Масквы адышла і Правабочная Ўкраіна, дык Маскоўшчына была ўжо такой магутнай, што не баялася неарганізаваных паўстаньняў. Украінскіх сялян расійцы аддалі пад прыгон паноў, украінскую мову ганьбілі і забаранялі. Толькі пасьля 1905 г. ўкраінцы зноў пачалі кратацца, а пасьля рэволюцыі 1917 г. выявілася канешная патрэбнасьць утварэньня незалежнай Украіны. Апошняя расійска-польская вайна аднак падзяліла Ўкраіну, як і Беларусь, штучнай мяжой на дзьве часткі. Да Польшчы адышла ня толькі Заходняя Ўкраіна, але яшчэ заходняя частка Валыні. Рэшта Правабочнай Украіны ўваходзіць у склад Украінскай Савецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Як краіна чыста земляробская, Правабочная Ўкраіна адзначаецца перавагай вясковай люднасьці. Вёскі тутэйшыя складаюцца з белых хатак-ляпянак, якія раскіданы па вёсцы без парадку, а ня ўдоўж вуліц, як у нас. Паселішчы туляцца да рэк і яроў, асабліва на Падольскім плоскаўзвышшы, дзе на вадападзелах вёскі сустракаюцца даволі рэдка. Гарадоў і мястэчак у Правабочнай Украіне многа, маюць яны звычайна па некалькі дзесяткаў тысяч насельнікаў, пераважна жыдоў, але адзначаюцца слабым разьвіцьцём прамысловасьці. Гэта аднастайныя, брудныя і пылныя месты, у якіх толькі ў час кірмашоў пачынаецца жыцьцё, гоман і клум, зьбіраецца народ і прывозіць з вёсак і з суседніх краін рознастайныя тавары.

Буйных гарадоў у краіне мала. Найвялікшы з іх—*Кіеў* (435 тыс. нас.)—ляжыць на Дняпры ніжэй сутокі яго з Дзясной, часткай на высокіх узгорках правага берагу, часткай на нізіне пад гэтымі ўзгоркамі, на так званым Падоле.

Уздымаючыся над шырокай магутнай ракой, Кіеў з сваімі старасьвецкімі цэрквамі, кляштарамі і саборамі, прыгожымі помнікамі, высокімі сучаснымі камяніцамі, садамі і бульварамі зьяўляецца адным з найпрыгажэйшых гарадоў Усходняй Эўропы.

Палажэньне Кіева вельмі выгоднае. Па Дняпры праз Кіеў з даўных часоў ішоў вялікі вадзяны шлях „з Вараг у Грэкі“; Дзясна зьяўляецца важнай дарогай на ўсход; трохі вышэй у Дняпро ўліваецца Прыпяць, галоўная з правых прытокаў Дняпра, важная дарога ў Заходнюю Эўропу. З даўных часоў тут, у сталіцы даўна-Украінскай дзяржавы, адбываўся абмен тавараў паміж захадам і ўсходам, паміж поўднем і поўначчу Эўропы. Сюды зьяжджаліся гандляры з Скандынавіі, Польшчы, Нямеччыны, Італіі, Бізантыі, Арабіі і нават з Індыі. Але пасьля татарскага надыходу, з заняпадам Украінскай дзяржавы, заняпала й сталіца гэтай дзяржавы. Толькі ў апошнія перад вайной гады Кіеў зноў набыў вялікую гандлёвую вагу; тут скрыжаваліся важныя чыгункі, аджыла прыстань на Дняпры, аднавіўся і гандаль. У лютым у Кіеве адбываецца важны так званы кантрактавы кірмаш, на якім падпісваюцца дагаворы на дастаўку збожжа, жывёлы, цукру і г. д.



У сучаснай Украінскай рэспубліцы Кіеў бязумоўна зьяўляецца галоўным асяродкам украінскага руху і ўкраінскай культуры. Вышэйшыя школы гораду, даўней расійскія, цяпер пачынаюць пакрысе пераварачвацца на ўкраінскія.

Старасьвецкія цэрквы і кляштары Кіеву, асабліва-ж слынная Пячорская лаўра, прынаджваюць сюды многа богамольцаў з розных канцоў Усходняй Эўропы.

На паўднёвы захад ад Кіеву ляжыць значнае гандлёва-прамысловае места *Белая-Цэркаў* (38 тыс. насельн.) з вялікімі цукраварнямі. Да рэволюцыі гэты горад зваўся мястэчкам, але сярод так званых мястэчак быў найвялікшым.

На захад ад гэтага места, прыблізна ў асяродку Правабочнай Украіны ляжыць *Бярдычаў* (44 тыс. насельн.), які вядзе бойкі гандаль коньмі і мае некаторае прамысловае значэньне.

На поўнач ад Бярдычаву на Валыні ляжыць *Жытомір* (64 тыс. насельн.). Гэты горад зьяўляецца пасярэднікам у гандлі багатага лесам Палесься і багатага збожжам украінскага лесастэпу.

На Падольскім плоскаўзвышшы вялікіх гарадоў мала. Найважнейшыя пункты там: *Віньніца* (51 тыс. насельн.), гандлёвы асяродак гэтай акругі, і *Каменец* (33 тыс. насельн.), старасьвецкі горад з прыгожым замкам—старой турэцкай крэпасьцю—наверсе аднаго з узгоркаў.

**Левабочная Украіна** ляжыць на левым беразе Сярэдняга Дняпра і зьяўляецца нізінай, якая злучае Палескую катліну з Чорнаморскай нізінай. Як і Правабочная Ўкраіна, Левабочная складаецца з паземных морскіх адкладаў, прыкрытых ледавіковым навалам, а на самай паверхні—лёэсам. Як і там, лёэсавая ледзь хвалістая паверхня разьедзена тут раўчакамі, ярамі і далінамі рэк (якіх?). Але тут нідзе дно гэтых раўчакоў і далін не дасягае да спрадвечных гранітных і гнэйсавых скал.

Клімат тут сушэйшы, як на Правабочы (ападкаў меней за 500 мілім.), лета бязмаль такое-ж гарачае, але зіма значна халаднейшая (сярэдняя

тэмпэратура студзеня—6°,—8°). Лясоў тут яшчэ меней. На поўначы, у Чарнігаўшчыне, яшчэ часта сустракаюцца дубовыя гаі, раскінутыя сярод бязьлеснага стэпу; у сярэдзіне, у Палтаўшчыне, плошча лясоў ледзь дасягае 6% усёй паверхні, а на крайнім поўдні, пад Крамянчугом, дрэвы могуць расьці толькі па ярох ды ў далінах. Толькі курганы ўздымаюцца над гэтай голай раўнінай і сьведчаць аб мінулых даўно зьнікшых народах, што вандравалі калісьці па стэпе. Першым тутэйшым славянскім насельнікам (севяранам) прышлося асабліва доўга змагацца з вандроўнымі туркскімі гордамі.

Асабліва ўпартыя змаганьні адбываліся між севяранамі і полаўцамі. Але, нарэшце, полаўцы пачалі падавацца пад уплывы славянскай культуры, пачалі пераймаць ад севяранаў праваслаўную веру і славянскую мову, пачалі брацца з севяранскімі дзяўчынамі і наагул пачалі зьлівацца з севяранамі ў адзіны народ. Татарская навальніца зноў разбурыла украінскую аселасьць і культуру. У часы панаваньня палякоў краіна была амаль зусім бязьлюднай. Тады сюды пачалі перасяляцца ўцекачы-сяляне з Заходняй і Правабочнай Украіны, з Палесься і Беларусі. З гэтых уцекачоў утварылася казацтва, якое здабыло сабе самастойнасьць, а ў 1654 г. аддалося Маскоўшчыне. Аднак да 1764 г. краіна мела самаўрад, свайго гэтмана і свае парадкі. Да цяперашняга часу ўкраінцы завуць краіну Гэтманшчынай, а шмат якія з тутэйшых сялян завуць сябе казакамі. Урад Кацярыны зьнішчыў казацкую вольнасьць, устанавіў тут прыгон і пачаў ганьбіць украінскую мову.

Левабочная Ўкраіна побач з Кіеўшчынай можа лічыцца сэрцам Украіны. Мясцовая палтаўская гаворка лягла ў аснову ўкраінскай пісьменнай мовы, як менская ў аснову беларускай, мясцовыя песьні, палтаўская вопратка, прыгожая і барвістая, тутэйшыя хаты-ляпянкі і хутары, што хаваюцца ў зеляніне садоў, лічацца найболей тыповымі для Ўкраіны.

Як амаль паўсюды на Ўкраіне, грунты тут чорназемныя, тлустыя, ураджайныя. Жыта, пшаніца, авёс, ячмень, грэчка, проса, табака, цукровыя буракі растуць тут вельмі добра. Багатыя нівы чаргуюцца з баштанамі, сады каля вёсак—з поплавамі ў далінах рэк. Гадоўля жывёлы мае тут наагул такую-ж значнасьць, як і на Правабочны, а гадоўля авечак—многа большую. Асаблівай славай карыстаюцца так званыя рашацілаўскія авечкі ў Палтаўшчыне, воўна і скура якіх вывозіцца ў Маскоўшчыну і на захад. Шмат у якіх месцах краіны здабываюць найлепшыя гатункі гліны. У Чарнігаўшчыне каля места Глухаў трапляюцца паклады белагліньня (каоліну), з якой саматужным спосабам, а часткай на фабрыках вырабляюць гаршкі, макатры і іншае глінянае судзьдзе.

Недахват лесу прымушае тутэйшых сялян ужываць на апал так званы кізяк, сушаны і прасаваны гной. Гарады карыстаюцца пераважна беларускім апалам. Па Дняпры з Беларусі прывозіцца ў замену за пшаніцу як у Правабочную, гэтак і ў Левабочную Ўкраіну вельмі многа дрэва.



Асабліва бойка гандлюе з Беларусьсю *Крамянчуг* (56 тыс. насельн.), які ляжыць на Дняпры ў тым месцы, дзе канчаецца правільны параходны рух па гэтай рацэ. Ніжэй Крамянчуга дняпроўскае рэчышча сьціснута гранітнымі скаламі, якія часта ўлетку перашкаджаюць руху параходаў, барак і бярлін.

На паўночны ўсход ад Крамянчуга на прытоцы Дняпра Ворскле ляжыць *Палтава* (88000 нас.), культурны асяродак Левабочча, адзін з найважнейшых асяродкаў украінскага нацыянальнага руху.

У Чарнігаўшчыне найважнейшы горад—*Нежын* (34000 нас.), слынны сваім вышэйшым гісторыка-філёлегічным інстытутам і гандлем гароднінай (асаблівай славай карыстаюцца нежынскія гуркі).



Мал. 106.—Хутар на Ўкраіне каля ракі Псёл.

**Слабажаншчына** ляжыць на ўсход ад Левабочнай Украіны і абымае ўзвышшы на вадападзеле Дона і Дняпра. Узвышшы гэтыя становяць паўднёвую частку вялікага Сярэдня-Рускага ўзвышша і складаюцца з паземных даўна-морскіх адкладаў, пакрытых пластом лёэсу. Даліны рэк тут глыбей урэзаліся ў грунт, як у Левабочнай нізіне, пашматалі ўсё ўзвышша і дадаюць яму выгляд узгаркаватай, а месцам бязмаль-што горнай краіны.

Зіма тутака яшчэ халаднейшая, як у Сярэдняй Украіне (студзень мае сярэднюю тэмпэратуру—8°,—10°); ападкаў па схілах узвышша выпадае яшчэ досыць для таго, каб там маглі расьці дубовыя лясы. Прыблізна 10% усёй паверхні пакрыта лясамі; рэшта—даўнейшы стэп—зьяўляецца багатай бязьмежнай нівай з тлустай чорназемнай глебай. Часамі, у сухія га-

ды, тут здараюцца неўраджаі, але яны з дастаткам папаўняюцца надмерамі збожжа ў звычайныя гады. Як і паўсюды на Ўкраіне, тутака сеюць пшаніцу і жыта, проса, кіяхі, цукровыя буракі, табаку. Вялікія прасторы засяваюць сонечнікам, сеюць і каноплі. Параўнаўча з Сярэдняй Украінай тут большую вагу маюць саматужныя промыслы: ганчарства, шавецтва, ткацтва і г. д.

Да XVII веку Слабажаншчына была блізка-што бязьлюднай краінай. Потым сюды пачалі надыходзіць уцекачы з тэй часткі Ўкраіны, якая належала тады да Польшчы. Яны пабудавалі тут свае хутары і вёскі-„слабоды“. Спачатку тутэйшыя насельнікі карысталіся самаўрадам і лічыліся вольнымі казакамі, але адначасна з зьнішчэньнем самаўраду ў Сярэдняй Украіне маскоўскі ўрад абвясьціў Слабажаншчыну неаддзельнай часткай Маскоўшчыны.

Побач з украінцамі ў Слабажаншчыне жыве шмат маскоўцаў. Часамі ў аднэй і тэй самай слабадзе белыя гліняныя, пашмараваныя вапнай ляпянкі ўкраінцаў чаргуюцца з шэрымі драўлянымі хатамі расійцаў. Першыя раскіданы ў маляўнічым беспарадку і хаваюцца ў зеляніне кветнічкаў і садоў, другія цягнуцца вуліцай і адзначаюцца шэрым аднатонным выглядам.

Украінцы аднак паўсюды становяць большасьць. Параўнаўча з іншымі ўкраінцамі слабажанцы адзначаюцца энэргіяй, нахілам да прамысловасьці і гандлю, большай дзеяльнасьцю, рухавасьцю.

Сярод паселішчаў пераважваюць так званыя слабоды—вялікія многалюдныя вёскі з некалькімі тысячамі насельнікаў у кожнай, раскіданыя па рэчных далінах і ярох. Насельнікі такіх слабод займаюцца пераважна ральніцтвам, радзей саматужнымі промысламі і лічацца сялянамі. Аднак некаторыя слабоды, што ляжаць каля вузлавых станцый чыгунак або ў якіх іншых выгодных па сваім палажэньні месцах, перавярнуліся ў запраўдныя гарады. Гандаль і апрацоўчая прамысловасьць у такіх слабодах-гарадох пераважваюць над ральніцтвам. Наадварот, шмат якія павятовыя гарады, якія ляжаць далёка ад сучасных дарог, фактычна зьяўляюцца вёскамі, а насельнікі іх займаюцца амаль-што выключна вясковымі занятакамі.

Сталіцай Слабажаншчыны, а цяпер і сталіцай УССР, зьяўляецца *Харкаў* (311 тыс. насельн.). У XVII в. гэта быў маленькі казацкі хутар, але, лежачы на скрыжаваньні дарог, па якіх везьлі свае тавары даўна-ўкраінскія чумакі, ён хутка зрабіўся важным гандлёвым месцам. Цяпер, злучаны чыгункамі з Масквой, Кіевам, Крымам і Донам, Харкаў зьяўляецца самым багатым гандлёвым асяродкам Усходняй Украіны. На буйных кірмашох адбываецца бойкі гандаль воўнай, скурамі, алеем, салам, быдлам і збожжам. З Масквы, Ленінграду і Польшчы на гэтыя кірмашы прывозілі крамніну, з Уралу—жалеза і г. д. У апошнія перад вайной гады ў Харкаве пабудавалася шмат розных фабрык, цукраварань і буйных паравых млыноў. Як у культурным асяродку, тут згуртаваліся унівэрсытэт, тэхнолёгічны інстытут, сельска-гаспадарчы інстытут і шмат іншых вышэйшых школ.



На паўночны захад ад Харкаву ляжыць другі паводле велічыні горад краіны—*Сумы* (36000 нас.) на рацэ Псёл. Гэта важны гандлёва-прамысловы пункт з буйнымі цукраварнямі і іншымі фабрыкамі. На поўначы краіны ўжо ў межах РСФСР ляжыць важны чыгуначны вузел *Белгарад* (29 тыс. нас.). Тут будзе ў хуткім часе пабудована вялікая электрычная станцыя, якая будзе жывіць электрычнай энэргіяй значную частку электрычна-чыгуначнай лініі Масква—Марыюпаль.

З так званых слабод найболей вядомы *Аляксееўка* (13000 нас.), асяродак вырабу сонечнікавага алею, і *Бутурлінаўка* (28000 нас.), якая ляжыць ужо па-за Донам на межах Украіны і Маскоўшчыны. Бутурлінаўка можа лічыцца запраўдным горадам, мае шмат цагелень, гарбарань, бравароў, ведама вялікім разьвіцьцём саматужнага шавецтва і гарбарства і бойкім гандлем.

**Данеччына** ляжыць на правым беразе прытокі Дону Данца і мае выгляд плоскаўзвышша (да 370 мэтраў увышкі над роўнем мора), з якога сьцякаюць рэкі ў Данец, у Дняпро (Самара) і беспасрэдна ў Азоўскае мора (Кальміюс). Рэкі прарылі сабе прыгожыя глыбокія даліны, у якіх на зрывістых правых берагох часта сустракаюцца прыродныя разрэзы пластоў земнай кары, з якіх складаецца так званы Данецкі груд. Груд гэты ёсьць працягам тэй Каменнай Грады, якая адхіляе на ўсход цячэньне Дняпра і праз якую Дняпро прабіваецца ў сваіх слынных парагах. Аднак у той час, як Каменная Града складаецца з старадаўных гранітных і гнэйсавых скал, прыкрытых толькі лёэсам, тут у Данецкім грудзе, апрача спрадвечных скал, пад лёэсам ляжаць яшчэ пластовыя адклады (каменна-вугальнай эпохі палеозойскай эры), якія зьмяшчаюць надзвычайна багатыя паклады каменнага вугалю і іншых карысных мінэралаў.

Як і ўвесь старадаўны Ўкраінскі груд, так і Данеччына, якая зьяўляецца яго ўсходнім аддзелам, была калісь запраўднай горнай краінай, але ў працягу мільёнаў гадоў горы былі тутака зьнішчаны праз выпятрэньне і размываньне. Цяпер гэта толькі ўзгор‘е, перарэзанае раўчакамі, ярамі і далінамі рэк. У той час, як Заходняя і Сярэдняя Ўкраіна, а таксама і Слабажаншчына належаць да пасу лесастэпаў, Данеччына зьяўляецца ўжо запраўдным стэпам, у якім ня сустрэнем ані дрэва, ані кусточка.

Сухі стэпавы клімат і недахват піцьцёвай вады ня прыцягвалі сюды перасяленцаў. Толькі ў XVIII в., калі гэтым краем ужо заўладаў маскоўскі ўрад, пачынаецца залюдненьне яго аселым сялянствам. Першымі сталымі насельнікамі краіны былі сэрбы з Хорваціі, якім расійскі ўрад прапанаваў заняць тутака прасторы нечапанага стэпу. (З гэтай прычыны ўся краіна доўга называлася Славяна-Сэрбіяй). Усьлед за сэрбамі сюды

надышлі ўкраінцы, якія хутка абукраінілі сэрбаў. У XIX в. пачаліся навуковыя досьледы Данеччыны. Выявілася, што данецкі вугаль па сваёй якасьці ня спушчае ангельскаму, і ўва ўсёй Усходняй Эўропе няма такіх багатых пакладаў вугалю, як у Данеччыне. Аднак адсутнасьць дарог і малалюднасьць ды някультурнасьць краіны перашкаджалі распрацоўцы гэтага багацьця. Ня гледзячы на дастатнасьць таннага падземнага апалу, мясцовыя сяляне зусім не зварочвалі на яго ўвагі і нават свае хаты агравалі сушаным прасаваным гноем-кізяком. Толькі гадоў 50 назад тут закладаюцца першыя шахты, адчыняюцца першыя гуты і фабрыкі. На працу ў капальнях і на фабрыках пачалі зьбірацца працоўныя людзі з усіх канцоў Усходняй Эўропы, спачатку ўкраінцы, потым беларусы, маскоўцы.

Перад вайной у Данеччыне здабывалася болей за мільярд пудоў вугалю, гэта значыць прыблізна ²/₃ ўсёй колькасьці гэтага апалу, здабыванага ў межах даўнай Расійскай імпэрыі. Тутака знаходзяць вугаль розных гатункаў: як чысты, найлепшы антрацыт, гэтак і так званы тлусты вугаль і г. д. Апроч таго ёсьць у Данецкім грудзе і. жалеза, і кінавар, і руда жывога серабра, і волава, і цынк, і медзь, і нават серабро. Рудні чаргуюцца з капальнямі і даюць заработкі тысячам людзей; Данеччына—адзіная частка Украіны, дзе нетракапальная і фабрычная прамысловасьць мае большую вагу, як сельская гаспадарка. Шмат знаходзяць у Данеччыне і каменнай солі; шмат у якіх месцах з-пад зямлі на паверхню выцякаюць салоныя крыніцы, а з вады гэтых крыніц простым выпарэньнем можна атрымаць чыстую звычайную соль.

Гарадоў на Данеччыне пакуль што ня лішне многа, але ў апошнія часы лік іх хутка павялічваецца, асабліва з таго часу, як краіну перарэзалі густой сеткай чыгунак. На падставе гандлю вугалем і рудой хутка растуць усе пасёлкі пры станцыях чыгунак, асабліва пры вузлавых станцыях. Гарадамі пасьпелі зрабіцца шмат якія капальні і гуты, якія раней ляжалі ў голым бязьлюдным стэпе.

Адным з важнейшых гарадоў краіны зьяўляецца *Лугань* (або Луганск, 58 тыс. нас.) з вялікімі жалезнымі гутамі, з вырабам машын, лёкомобіляў і г. д. Асяродкам здабываньня солі з салоных крыніц ёсьць здароўніца *Славянск*, пабудованы яшчэ сэрбамі. Каменная соль і жывое серабро здабываецца ў ваколіцах *Бахмуту* (29 тыс. нас.), які цяпер зрабіўся адміністрацыйным асяродкам краіны; найлепшы антрацыт—у *Грушаўцы*. На поўдні краіны на рацэ Кальміюс ляжыць *Юзаўка* (32 тыс. насельн.), таксама важны асяродак здабываньня каменнага вугалю і апрацоўкі жалеза. У Юзаўцы знаходзіцца самая даўная з сучасных гут Данеччыны, пабудованая яшчэ ў 1871 годзе.

Паводле проэкту электрыфікацыі СССР у Данеччыне мусяць працаваць 4 вялікія электрычныя станцыі, якія будуць карыстацца горшымі гатункамі мясцовага вугалю і па дроце будуць перадаваць электрычную энэргію далёка на суседнія фабрыкі, гуты і капальні.



**Паўднёвая Ўкраіна** абымае нізіну між Украінскім гранітна-гнэйсавым грудом і паўночнымі ўзьбярэжжамі Азоўскага мора і Адэскай затокі Чорнага мора. Як і ў рэшце Ўкраіны, павярхоўны пласт зямлі складаецца тут пераважна з лёэсу, пад якім хаваюцца паземныя адклады даўных мораў. Наагул кажучы, гэта гладкая раўніна, ледзь прыметна нахіленая на поўдзень. Каля мора сухазем'е тут крута абрываецца прыступкай, пад якой застаецца толькі вузкая йстужка так званага пляжу, якую часамі залі-ваюць морскія хвалі. Лёэсавую паверхню Паўднёвай Украіны пераразаюць раўчакі, яры і рэчныя даліны, выцягнутыя пераважна з поўначы на поўдзень. Большая частка рэк пачынаецца на схілах старадаўнага Ўкраінскага груду і каля свайго ўпаданьня ў мора утворвае пашыраныя вусьці-лі-



Мал. 107.—Дняпроўскія парагі.

маны, якія аддзяляюцца ад мора пескавымі гакамі і маюць выгляд паўзморскіх вазёр з салонай або саланаватай вадой. Рэкі нясуць у ліманы шмат глею і пяску і пакрысе засыпаюць іх сваімі адкладамі. Такім спосабам шмат якія ліманы перавярнуліся на саляныя балоты, а ў некаторых такіх балотах гразь лічыцца вельмі карыснай для здароўя. Каля такіх ліманаў пабудаваліся лячэбныя месты—здароўніцы або курорты. Туды што-год зьяжджаецца шмат хворых (на рэўматус, на запаленьне нэрваў і г. д.), яны тут купаюцца ў гразі і грэюцца пад гарачымі праменьнямі паўднёвага сонца. У некаторых ліманах вада такая салоная, што з яе што-год асядае на дно ліману пласт солі, якую здабываюць і вывозяць за межы краіны.

У Адэскую затоку ўліваецца толькі 3 ракі, ліманы якіх злучаны з морам так званым горлам. Гэта Днестр, Бог (Паўднёвы Буг) і Дняпро. Ліманы Богу і Дняпра зьліваюцца ў адзіны супольны ліман, злучаны з морам штучна паглыбленым горлам і адгароджаны ад гэтага мора падвойным шэрагам пескавых гакаў.

Дняпро зьяўляецца адзінай ракой, якая здолела прарвацца праз Украінскі гранітны груд. Аднак у тым месцы, дзе ён прабіўся праз скалы гэтага груду, між Кацярынаславам і Запарожжам (Аляксандраўскам), утварыліся слынныя Дняпроўскія парагі, якія аддзяляюць нізавіну Дняпра ад яго сярэдняга цячэньня. Гранітныя скалы пераразаюць тут рэчышча, і вада з надзвычайнай сілай перакатваецца цераз іх. Падводныя камені паўсюды раскіданы па рэчышчы, і патрэбна вялікая практыка і сьмеласьць, каб прапусьціць праз парагі плыт або барку нават у час веснавых разводзьдзяў. Параходы зусім ня могуць праходзіць праз парагі.

З рэк Азоўскага вадазбору найвялікшыя—Малочная і Кальміюс. Даўней па берагох Малочнай жылі расійцы, якія належалі да сэкты малаканаў. Яны жылі паэвангельску, добра гаспадарылі, але адмаўляліся ад вайсковай службы. З гэтай прычыны расійскі ўрад прыгнятаў іх, нарэшце прымусіў кінуць свае вёскі і перасяліцца на Каўказ, а землі іх аддаў нямецкім колёністым.

Клімат Паўднёвай Украіны вельмі сухі, ападкаў там заўсёды мала (часта меней за 400 мілім.), неба заўсёды яснае, лета вельмі гарачае, зіма марозная.

У Адэсе сярэдняя тэмпэратура году $+9{,}8^{0}$, сярэдняя студзеня—$3{,}7^{0}$, ліпеня $+26{,}3^{0}$.

Параваньне вады тут вельмі вялікае, у грунтох вады мала. Ува ўсёй краіне няма крыніц, у калодзежах вада часта высыхае, у некаторых месцах, калі ў калодзежах і ёсьць вада, дык такая салоная, што яе нельга піць. Дрэвы ў краіне зусім не растуць, хіба на штучна абваднёных месцах ды па ярох. Кавыльны стэп, пакрыты травой у рост чалавека, пярэсты ад рознастайных красак увясну, шэры і жоўты ўлетку, існаваў толькі на поўначы краіны. Чым далей на поўдзень, тым болей убогая расьліннасьць пакрывала стэп. На ўзьбярэжжы трава расла толькі пучкамі, а большая частка грунту была зусім голай. Палын і чарнобель займалі там болей пачэснае месца, як кавыль і цыбульныя расьліны. Месцам на поўдні сустракаюцца нават саланчакі, па якіх могуць расьці толькі самыя нягрэблівыя расьліны—салянкі, якія могуць жывіцца салонай вадой. Цяпер нечапаны стэп зьяўляецца ўжо рэдкасьцю; нівы паўсюды павыціскалі стэпавую дзікую расьліннасьць. Толькі пад аховай земляўласьнікаў дзе-ні-дзе захаваліся куточкі нечапанага стэпу.

Найцікавейшым куточкам нечапанага стэпу зьяўляецца маёнтак Асканія-Нова, што ляжыць на ўсход ад нізавіны Дняпра. Былы ўласьнік гэтага маёнтку—Фальцфэйн—зрабіў там зьвярынец, у якім жывуць, як мясцовыя, гэтак і заморскія жывёлы, прывезеныя з далёкіх краёў. Як нашая Белавеская пушча, Асканія-Нова можа лічыцца „нацыянальным паркам“ Украіны.



У залежнасьці ад асаблівасьцяй стэпавай расьліннасьці, паўночная частка краіны пакрыта ўрадлівай чорназемнай глебай (з 6—10% перагною). Бліжэй да мора—чорназем сьвятлейшы (так званы чакалядавы з 4—6% перагною), а месцам яго замяняюць бурыя глебы (з 2—4% перагною).

Першапачатковымі насельнікамі краіны былі розныя вандроўнікі, што надыходзілі сюды з Азіі, займаліся тут гадоўляй жывёлы і рабавалі суседніх аселых славянаў. Ад гэтых вандроўнікаў захаваліся да гэтага часу толькі могілкі-курганы, у якіх часамі знаходзяць багатыя акрасы і розныя прылады, пахаваныя разам з нябожчыкамі. Праўда, ужо ў IX в. сюды надыходзілі аселыя славяне, але кожны раз іх зганялі адгэтуль вандроўныя пляменьні (вугры, торкі, печанегі, куманы, аланы, хазары, гуны, полаўцы, нарэшце татары), якія адціскалі іх ад мора. У XVI в. сюды зноў пачалі надыходзіць украінскія колёністыя-казакі, якія залажылі тут на востраве на Дняпры „Запароскую Сеч“, пачалі змагацца з крымскімі татарамі і пакрысе адваёўвалі стэп. Аднак, да XVIII в. край заставаўся вельмі малалюдным. Маскоўскі ўрад, заўладаўшы Паўднёвай Украінай, прапанаваў тут сяліцца сэрбам з Аўстрыі, Вугоршчыны і даўнай Турэччыны, немцам, балгарам, маскоўцам. Аднак, у яшчэ большай колькасьці сюды надышлі ўкраінцы. Сэрбы хутка ўкраінізаваліся, і ў сучасны момант украінцы рашуча пераважваюць у краіне. Апроч іх, па асобных колёніях тут жыве некалькі сот тысяч немцаў, якія добра забясьпечаны зямлёй, карыстаюцца найлепшымі сельска-гаспадарчымі прыладамі і жывуць значна багацей за ўкраінцаў.

Спачатку асновай багацьця Паўднёвай Украіны была гадоўля жывёлы. Зямлю апрацоўвалі пад засевы збожжа толькі для ўласных патрэб. Большая частка стэпаў была пашай для быдла, авечак і коняй. Амаль што кожны гаспадар меў па некалькі дзесяткаў кароў і па колькі сот авечак. У канцы мінулага веку гушчыня залюдненьня ў краіне значна павялічылася, і гадоўля жывёлы пачала замяняцца ральніцтвам. Ня гледзячы на недахват вільгаці, зямля давала добрыя ўраджаі, і ральніцтва аказалася выгаднейшым за гадоўлю жывёлы. Зямельнай цеснасьці яшчэ не адчувалася, кожны меў па некалькі дзесяткаў дзесяцін і, каб лягчэй скарыстаць свае зямельныя багацьці, ужываў найлепшыя сельска-гаспадарчыя машыны: цяжкія, вялікія плугі, сеялкі, жнейкі, касілкі і г. д. Спосабы ральніцтва аднак былі яшчэ старыя. На палёх сеялі пшаніцу кожны год, не даючы зямлі адпачынку, пакуль яна давала хоць якую-колечы карысьць. Потым кідалі поле пад дзірван і на палёх пасьвілі авечкі да таго часу, пакуль там зноў не зьяўляўся кавыль; тады зноў засявалі поле пшаніцай. Толькі ў апошнія часы такі дзірванны або аблогавы спосаб ральніцтва замяніўся трохпалёўкай.

Пшаніца зьяўляецца галоўным багацьцем краіны. Яе галоўным чынам і вывозяць адгэтуль у Заходнюю Эўропу. У меншай колькасьці сеюць ячмень, авёс, кіяхі, табаку, для алею—рапс і сонечнік. Вялікія прасторы зямлі засяваюцца кавунамі і дынямі, гуркамі, гарбузамі, перцам, баклажанамі і іншай гароднінай. Дзякуючы цёпламу лету, пры штучным абвадненьні або ў далінах рэк, могуць вельмі добра пасьпяваць далікатныя гатункі садовіны: чарэшні, абрыкосы, лепшыя гатункі сьліў, вішань, яблыкаў, ігруш. Аднак вінаграднік расьце кепска, бо ня можа вытрымаць зімовых маразоў.

Гадоўля жывёлы да апошніх часоў заставалася галоўнай галінай сельскай гаспадаркі толькі па буйных маёнтках, дзе паны за недахватам працоўных рук не маглі перайсьці да болей выгоднага земляробства.

Апрача сельскай гаспадаркі, вялікую вагу мае ў краіне нетракапальны промысел. Каля сярэдняга цячэньня ракі Інгулец (прыток Дняпра) каля места Крывы Рог трапляюцца багатыя паклады найлепшай жалезнай руды, так што ў здабываньні жалеза краіна мае большую вагу, як Урал. Каля Дняпра, ніжэй парагоў, знаходзяць манганавую руду; у паўзморскіх вазёрах здабываюць соль.

Што-год багацьці Паўднёвай Украіны прынаджваюць новых перасяленцаў з поўначы, і колькасьць насельнікаў краіны хутка павялічваецца. За апошнія сто гадоў лік насельнікаў павялічыўся тут у 10 разоў.

Недахват вады для піцьця ў голым стэпе прымушае сялян сяліцца па далінах рэк і ў ярох, у якіх украінцы навучыліся затрымоўваць ваду дажджоў. Часамі даліна якой-небудзь ракі выглядае скрозь запоўненай будынкамі. Вёска за вёскай цягнецца без перарыву па даліне, нібы адна многавёрстная вуліца пад рознымі назовамі. Затое на вадападзелах, у баку ад далін,—толькі нівы або паша, ніводнай хаткі, ніводнага дрэва. Вялікія вёскі, якія ляжаць каля станцый, чыгунак, каля капалень, каля мора, лёгка робяцца гарадамі. Гарады краіны—пераважна маладыя з прастымі шырокімі вуліцамі, новымі будынкамі, правільна пасаджанымі радочкамі дрэў удоўж вуліц. Люднасьць гэтых гарадоў складаецца з жыдоў, украінцаў, маскоўцаў, грэкаў, армянаў, румынаў і чужаземцаў. Бойкі гандаль, эўропэйскі выгляд, хуткае ўзрастаньне адрозьніваюць тутэйшыя гарады ад ціхіх, прыгожых старасьвецкіх гарадоў Паўночнай Украіны.

Самым важным горадам Паўднёвай Украіны зьяўляецца *Адэса* (317000 насельн.), што ляжыць на аднаназоўнай затоцы Чорнага мора, на захад ад горла Дняпра-Богскага ліману. Як Марсэль лічыцца прыстаньню Ронскага вадазбору, гэтак Адэса можа лічыцца прыстаньню Дняпра. Ня толькі ўкраінскія, але й беларускія тавары вывозяцца ў Чорнае ды Міжземнае мора па Дняпры і далей праз Адэсу. Для Украіны Адэса становіць тое-ж, што для Маскоўшчыны Ленінград, а для Нямеччыны—Гамбург. Па Днястры, па Бозе, па Дняпры і па чыгунках сюды вязуць украінскае збожжа, цукер, мяса і скуры, беларускі лес, сернічкі, сьпірытус, а



па моры з-за меж прывозяць баваўну, гарбату, табаку, вугаль, пляды. (Перад вайной гандлёвы абарот адэскай прыстані дасягаў 137 мільёнаў руб. золатам).

Адэса—бойкі, багаты і прыгожы, зусім заходня-эўропэйскі горад. Вялікія сучасныя будынкі, раскошныя магазыны, простыя шырокія вуліцы, харошыя бульвары і сады, мяшанае насяленьне, гандлёвае і рухавае,—усё гэта мала нагадвае гарады Ўсходняй Эўропы. Як культурны асяродак краіны, Адэса мае шмат усякіх школ і ў тым ліку унівэрсытэт. У час рэволюцыі тут згуртавалася значнае кола беларускай інтэлігэнцыі, калі розныя окупацыі перашкаджалі беларускаму руху на Беларусі. У Адэскай прыстані заўсёды працавала шмат беларусоў.



Мал. 108.—Адэса. Помнік Рышэльё.

На Бозе, каля яго злучэньня з Інгулам, знаходзіцца другая важная прыстань краіны, даступная для другарадных морскіх караблёў—*Мікалаеў* (81000 нас. Гандлёвы абарот Мікалаеву да вайны дасягаў 108 міл. р. золатам). Перш за ўсё гэта вайсковы і караблябудаўнічы порт з вялізнымі майстэрнямі караблёў, фабрыкамі зброі, гармат, бліндажоў і г. д.

На Дняпры, крышку вышэй яго вусьця, на правым беразе ляжыць *Херсон* (41000 нас.), таксама важная прыстань для паўзьбярэжных морскіх караблёў. Адгэтуль вывозяць украінскае збожжа, скуры і беларускі лес. (Гандлёвы абарот да вайны дасягаў 44 міл. р. золатам).

На беразе Азоўскага мора ў межах Паўднёвай Украіны ляжаць яшчэ дзьве прыстані, якія маюць гандлёвае значэньне: *Бярдзянск* (22 тыс. нас.)

і *Марыюпаль* (35000 насельн.). Азоўскае мора даступна толькі для дробных караблёў, бо для вялікіх замелкае, але і на гэтых дробных паўзьбярэжных караблёх з Бярдзянску і Марыюпалю вывозяць шмат збожжа, а з апошняга апрача таго яшчэ й вугалю ды жалеза з Данеччыны.

У баку ад мора найвялікшым горадам Паўднёвай Украіны зьяўляецца *Кацярынаслаў* (127 тыс. нас.), які ляжыць на Дняпры трохі вышэй парагоў. Такім чынам тут канчаецца параходны рух па сярэдняй частцы Дняпра, ды й плыты, што сплаўляюцца з Беларусі па Дняпры і яго прытоках, даплываюць звычайна толькі да Кацярынаславу. Лежачы пасярэдзіне між Данеччынай і Крываcroскай жалезаздабывальнай акругай, Кацярынаслаў зрабіўся найважнейшым фабрычным горадам Украіны. Як у самым горадзе, гэтак і ў яго ваколіцах знаходзіцца шмат вялізных фабрык, на якіх апрацоўваюць жалеза, манган і г. д. У Кацярынаславе ёсьць і вышэйшая школа нетракапальных промыслаў.

Ніжэй парагоў на Дняпры ляжыць горад *Запарожжа* (Аляксандраўск, 44 тыс. насельн.), ад якога пачынаецца параходны рух па Дняпроўскай нізавіне. У Запарожжы проэктуецца залажэньне найвялікшай электрычнай станцыі СССР, якая мусіць карыстацца энэргіяй Дняпра ў парагох і будзе перадаваць электрычную энэргію ўсюды на фабрыкі Кацярынаславу, Крывароскай жалезаздабывальнай акругі і далей аж да Херсону.

Каля пачаткаў р. Інгул ляжыць яшчэ адзін багаты гандлёвы горад *Елізаветград* (50000 нас.), асяродак гандлю збожжам і вырабу сельскагаспадарчых машын.

## Карпаты.

(Азнач географічнае палажэньне. Паводле карты пералічы старонкі, якія мяжуюцца з Карпацкім краем на захадзе, на поўдні і на поўначы).

Уклад Карпацкіх зморшчавых гор належыць да тых ускрайных горных ланцугоў, якія атачаюць Усходня-Эўропэйскую раўніну. Паводле сваёй будовы і паходжаньня, Карпаты зьяўляюцца нібы працягам Паўночна-Ўсходніх Альп, ад якіх яны аддзелены толькі Венскай нізінай. Пачынаючыся каля Дунаю, Карпацкі ланцуг апісвае дугу, выгнутую на ўсход, і зноў даходзіць да Дунаю, да так званай Жалезнай Брамы, за якой пачынаюцца ўжо Балканы. Такім чынам Карпацкія горы нібы злучаюць уклады Альпійскіх і Балканскіх гор.

Параўнаўча з Альпамі Карпаты мала расчленены, адзначаюцца ад іх ня толькі адсутнасьцю вечнага сьнегу і горных ледавікоў, але таксама малой колькасьцю морэнавых адкладаў, якія засталіся ад ледавіковай эпохі, адкладаў, якія пакрываюць Альпійскі ўклад да самых падгор'яў.

Краявід тутака болей аднастайны. Няма тут прыгожых, вялікіх, блакітных вазёр, мала нізкіх выгодных праходаў, няма бліскучых зерналёдных палёў, меней сочных горных лугоў. Клімат тут сушэйшы, ападкаў меней. Вярхі гор ляжаць тутака значна ніжэй (ня вышэй 2-х з паловай вёрст), лясы не падымаюцца гэтак высока па схілах гор, як там. (Дрэвы зьнікаюць на вышыні 1500—1800 м., і хваёвыя хмызьнячкі не сустракаюцца вышэй за 1800—2200 м.). Затое тут пазьней асталяваліся людзі і не пасьпелі так зьнішчыць лясы, як у Альпах.



Угнуты ўнутраны край Карпат складаецца пераважна з крышталічных скал: часткай з гранітаў, гнэйсаў, часткай з выбуховых нова-вульканічных скал астыглай лявы (трахітаў і да т. п.). Знадворны, выгнуты край складаецца пераважна з пластоў пескавіку. Лявы ўнутранога краю адзначаюцца багацьцем на розныя руды і дарагія мэталы, а па прыгор'ях знадворнага краю сустракаецца каменная соль і нафта.

На захад ад Карпацкага ланцуга распасьціраецца Сярэдня-Дунайская або Вугорская нізіна, якая цягнецца аж да ўсходніх альпійскіх адгор'яў а на поўдні між Карпацкімі гарамі і Дунаем ляжыць Ніжня-Дунайская або Валаская нізіна, цесна злучаная з паўднёва-ўсходнімі прыгор'ямі Карпат, так званай Малдаўшчынай. Гэтыя нізіны зьяўляюцца дном даўных мораў, занесеных адкладамі рэк, што сьцякалі з Карпацкага ланцуга.

Паводле свайго клімату Дунайскія нізіны могуць лічыцца часткай паўднёвага пасу Ўсходняй Эўропы. Ападкаў тут выпадае мала, лета гарачае, зіма параўнаўча халодная. Падобнасьць да Паўднёва-Ўсходняй Эўропы выяўляецца і ў грунтох. Дунайскія нізіны і прыгор'і Карпат пакрыты лёэсам (што гэта за парода?), вышні пласт якога ператварыўся ў ураджайную чорназемную глебу. Аднастайны кавыльны стэп пакрывае Прыкарпацкія нізіны і толькі па ўзгорках і прыгор'ях пераходзіць у лесастэп або ліставы лес.

Большая частка Прыкарпацкіх зямель абвадняецца ракой Дунаем і яго прытокамі: Ваагам, Цісай, Алютай, Сэрэтам, Прутам. Рэкі гэтыя жывяцца горнымі дажджамі і заўсёды маюць шмат вады. У тых месцах, дзе яны прарываюцца праз горы, яны маюць шпаркае цячэньне, зрывістыя берагі, вузкія даліны. У нізінных частках свайго бегу яны цякуць павольна ў шырокіх, часта балотных берагох. Часта гэтыя рэкі шырока разьліваюцца, залiваюць свае даліны і руйнуюць паўзьбярэжныя вёскі і гарады.

Лежачы на межах Заходняй, Усходняй і Паўднёвай Эўропы, Карпацкі край адзначаецца вельмі markednastajnaj людnaсьцю. На захадзе, у Сярэдня-Дунайскай нізіне, пануе вугорская мова, якая стаіць блізка да моў прыуральскіх фінскіх народаў; на паўднёвым усходзе жывуць румыны, якія гавораць на аднэй з раманскіх моў; на паўночным захадзе пераважваюць кроўныя чэхам славакі, а на паўночным усходзе—украінцы. Па абліччы вугорцы і румыны маюць шмат падобнасьці да суседніх славянскіх народаў. У працягу вякоў яны мяшаліся з славянамі і ўвабралі ў сябе шмат славянскай крыві.

Як ува Ўсходня-Эўропэйскай раўніне, гэтак і ў Карпацкім краі культура і асьвета стаяць нізка. Ня гледзячы на значныя запасы карысных

мінэралаў, здабываньне іх займае другараднае месца, а апрацоўка зусім не пашырылася; паўсюды сельская гаспадарка рашуча пераважвае над фабрычнай прамысловасьцю. Зямлю апрацоўваюць кепска, палепшаныя спосабы ральніцтва і сучасныя сельска-гаспадарчыя прылады не пашырыліся. Аднак надзвычайна ўраджайная чорназемная глеба дазваляе нават пры благой апрацоўцы зямлі зьбіраць вялікія ўраджаі ўсялякага збожжа. Асабліва вялікую вагу тут маюць кіяхі, якія засяваюцца галоўным чынам для мясцовага ўжытку. На другім, а часамі і на першым месцы сярод гатункаў збожжа стаіць пшаніца, якая дае галоўны продукт вывазу. Паўсюды значныя прасторы засяваюцца цукровымі буракамі і табакай. Па нізінах усюды разводзяць вінаграднік, каля вёсак саджаюць пладовыя дрэвы, асабліва сьлівы. У горах яшчэ многа лесу, які адсюль вывозіцца ў бязьлесныя Дунайскія нізіны, а па горных лугох вялікую вагу мае гадоўля жывёлы.

З даўных часоў Карпацкія горы станавілі важную політычную мяжу, якая засланяла Вугорскую нізіну ад варожых наступаў з усходу. Да вайны 1914-18 гадоў Карпацкі хрыбет быў усходняй мяжой Вугорскай дзяржавы. У сучасны момант заходняя і сярэдняя часткі Карпацкага ланцуга належаць да Чэха-Славацкай рэспублікі, а паўднёвая частка да Румынскай дзяржавы. Да сучаснай Вугоршчыны належыць толькі Сярэдня-Дунайская нізіна. За кошт яе моцна павялічылася Румынія. Да яе раней належалі толькі Валаская нізіна, Малдаўшчына на ўсход да Пруту і масыў Дабруджа (глядзі агляд Балгарыі). Пасьля вайны ў склад Румыніі ўвайшла Бесарабія (між Прутам і Днястром), Букавіна ў вышнім цячэньні Пруту і Трансільванія—горная краіна ў паўднёва-ўсходнім кутку Карпат.

Паводле асаблівасьцяй прыроды і людпасьці, Прыкарпацкія землі можна падзяліць на 6 краін. У межах Карпацкага ланцуга знаходзяцца: 1) Славаччына або Заходнія Карпаты, 2) Вугорская Русь або Сярэднія Карпаты і 3) Сямёхгорадзьдзе або Трансільванія. Нізінная частка Прыкарпацкіх зямель раскладаецца на 4) Малдаўшчыну або паўднёва-ўсходнія прыгор'і Карпат, 5) Валахію і 6) Вугоршчыну.

**Заходнія Карпаты** пачынаюцца каля самага Дунаю (каля места Браціслава) і зьяўляюцца працягам лежачых на левым беразе гэтай ракі Лейцкіх гор, якія лічацца ўсходнім адгор'ем крышталічных Альп (глядзі агляд Усходніх Альп). Спачатку Заходнія Карпаты цягнуцца на паўночны ўсход, потым зварочваюць на ўсход. На ўсім сваім працягу яны складаюцца з трох, а месцамі з чатырох роўналежных ланцугоў, але ўсе гэтыя ланцугі перарэзаны папярочнымі далінамі рэк і раскладаюцца на некалькі асобных масываў кожны. Між гэтых ланцугоў пралягаюць прадоўжныя даліны, якія даюць сток або на поўнач да Віслы, або на поўдзень у Дунай.

Паўночны ланцуг (так званыя Заходнія Бяскіды) складаюцца з пескавікоў, маюць акругленыя, ня вельмі высокія вярхі (да 1725 м.) і прарэзаны важным праходам (Яблунка на вышыні 551 м.), па якім ідзе чыгунка з Нямеччыны і Заходняй Польшчы (Цешынскага Шлёнску) у Вугорскую нізіну. Шырокая важная лагчына (так званая брама Вэйскірхэну), аддзяляе гэты ланцуг ад Судэт і становіць важную дарогу, па якой пралягаюць чыгункі з Польшчы і Украіны ў Чэхію і Аўстрыю (Вену).



Другі ланцуг пачынаецца над Дунаем (пад назовам Малых Карпат), складаецца з спрадвечных крышталічных скал і ў масыве Высокая Татра дасягае вышыні 2663 м. (Гэрлсдорфскі верх), перавышаючы ўсе іншыя часткі Карпацкага ўкладу.

Вярхі Татры ляжаць вышэй сьнегавой мяжы, але зрывістыя схілы іх перашкаджаюць утварэньню на іх вечных сьнягоў і зерналёдных палёў. Голыя скалы дадаюць гэтым вярхом асаблівы змрочны выгляд. Лугоў на Татры мала, лясоў хапае (лясамі пакрыты горныя схілы ад падгор'яў да вышыні 1500 м.). Ува ўсе бакі з Татры сьцякаюць бурныя рэчкі, у далінах якіх трапляюцца цікавыя горныя вазёры, гэтак званыя „морскія вочы".

Трэці прадоўжны ланцуг Заходніх Карпат, як і другі, складаецца з крышталічных скал, але не дасягае ўжо такой высачыні, як Высокая Татра.

Чацьверты, самы паўднёвы ланцуг (так званыя Вугорскія Рудныя горы), складаецца пераважна з ацьвярдзелых ляў, багатых серабром, золатам, медзьдзю, жалезам, нікелем, кобальтам і дарагімі каменямі (опал). У пластох, якія чаргуюцца з вульканічнымі скаламі, знаходзяць багатыя запасы бурага вугалю.

Зразумела, што вялізныя падземныя багацьці зрабілі краіну Заходніх Карпат перш за ўсё краем нетракапальнай прамысловасьці. Аднак і тут па ўраджайных далінах вялікую вагу мае сельская гаспадарка і ральніцтва, гадоўля жывёлы, садоўніцтва, вінаградніцтва. (На паўднёвым усходзе краіны вырабляюцца асабліва слынныя так званыя токайскія віны). Даступнасьць Заходніх Карпат, дастатнасьць выгодных праходаў, багатыя паклады мінэралаў дапамагалі пашырэнью ў гэтай краіне гандлю, а бойкія зносіны з суседзямі дапамагалі разьвіцьцю культуры. Насельнікі краіны—славакі—адзначаюцца найвышэйшым ува Ўсходняй Эўропе становішчам асьветы, і з гэтага боку маюць шмат супольнага з сваімі родзічамі і суседзямі—чэхамі. На поўначы і ў Татры жывуць палякі.

Да часу вялікай вайны 1914-18 г. Славаччына належала да Вугорскай паловы Аўстра-Вугорскай дзяржавы. Вугорцы забаранялі славакам вучыцца ў роднай мове, прымушалі карыстацца вугорскай мовай у грамадзянскіх і адміністрацыйных установах. Шукаючы волі, тысячы славакаў выяжджалі ў Амэрыку, кідаючы свае землі і скарбы вугорцам, якія пачалі выціскаць славакаў з іх бацькаўшчыны.

Пасьля вайны Славаччына злучылася з Чэхіяй у адзіную дзяржаву. Славакі займаюцца як нетракапальнай прамысловасьцю, гэтак і сельскімі занятками, жывуць пераважна па хутарох, вёсках і маленькіх мястэчках. Буйных гарадоў тут мала.

Найвялікшы з іх—*Браціслава* (панямецку Прэсбург, 80000 нас.)—ляжыць на Дунаі на граніцы трох дзяржаў: Аўстрыі, Вугоршчыны і Чэха-Славаччыны. Праз гэты горад ідуць важныя шляхі з Паўднёвай Нямеччыны і Аўстрыі ў асяродак Вугоршчыны. Асяродкам здабываньня мэталаў лічыцца *Штаўніца* (панямецку Шэмніц, 15000 нас.) з акадэміяй нетракапальнай прамысловасьці. Паўночныя схілы Заходніх Карпат становяць Паўднёвую мяжу Польскай рэспублікі.

**Сярэднія Карпаты** зьяўляюцца найвузейшай часткай Карпацкага ўкладу. Карпаты тут цягнуцца з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход, маюць мала выгодных праходаў і адзначаюцца рэдкай залюдненасьцю. Знадворныя паўночна-ўсходнія ланцугі гор складаюцца тут пераважна з пескавікоў, адзначаюцца мяккімі абрысамі, акругленымі вярхамі і лагоднымі схіламі; бязмаль да самых вярхоў іх пакрываюць лясы: на нізе, у падгор'ях—букавыя, вышэй, па схілах—іглястыя.

Крышталічных спрадвечных скал тут няма. Унутраныя (паўднёва-заходнія) ланцугі складаюцца з астыглай лявы, маюць выгляд змрочных масываў з вострымі вярхамі і стромкімі схіламі і зьмяшчаюць значныя паклады мэталаў, асабліва серабра.

Насельнікі краіны (лемкі, бойкі і гуцулы) належаць да ўкраінцаў, жывуць пастарасьвецку, займаюцца ляснымі промысламі і гадоўляй жывёлы, моцна трымаюцца сваёй мовы і звычаяў. Перад вайной гэтая краіна, як і Славаччына, належала да Вугоршчыны, а цяпер адышла да Чэха-Славацкай рэспублікі. Краіна аднак карыстаецца самаўрадам, і ўкраінцам цяпер жывецца з культурна-палітычнага боку вальгатней, як пад вугорскім заборам.

**Сямёхградзьдзе** або Трансільванія абымае паўднёва-ўсходні кут Карпацкага ўкладу. Даліна Вышняй Цісы аддзяляе гэтую краіну ад Сярэдніх Карпат. На поўдзень ад гэнай даліны карпацкія ланцугі разыходзяцца. Адна галіна пад назовам Сямёхградзкіх Карпат цягнецца далей на паўднёвы ўсход, другая пад назовам Сямёхградзкіх Рудных гор зварочвае на паўднёвы захад.

Самёхградзкія Карпаты складаюцца з пескавіковых гор (на ўсходзе), спрадвечных крышталічных скал (у сярэдзіне) і астыглай лявы (на захадзе). Дасягнуўшы Валаскай нізіны, Самёхградзкія Карпаты заломіста зварочваюць на захад, набываюць назоў Трансільванскіх Альп і складаюцца там ужо выключна з спрадвечных крышталічных скал. (Якія пароды завуцца спрадвечнымі крышталічнымі скаламі?). Трансільванскія Альпы дасягаюць значнай вышыні, адзначаюцца дзікасьцю, няпрыступнасьцю, і да апошняй сусьветнай вайны былі мяжой між Вугоршчынай і Румыніяй. Схілы іх багаты на лес, а ў прыгор'ях трапляецца буры вугаль. На захадзе яны дасягаюць да Жалезнай Брамы на Дунаі і маюць свой працяг на правым беразе Дунаю ў так званых Сэрбскіх Рудных горах (глядзі агляд Балгарскай краіны).



Сямёхградзкія Рудныя горы аддзяляюць Трансільванію ад Вугорскай нізіны і таксама дасягаюць значнай вышыні (масыў Бігар дасягае да 1849 м. н. р. м.). З даўных часоў у гэтых горах здабывалася многа дарагіх мэталаў і ў тым ліку золата.

Паміж Сямёхградзкіх Карпат, Трансільванскіх Альп і Сямёхградзкіх Рудных гор ляжыць г. зв. Трансільванская ўзгаркаватая катліна.

Гэтая катліна была калісь дном затокі так званага Сармацкага мора, пад якім хавалася тады Вугоршчына, Украіна і Валахія. Адклады гэтай затокі зьмяшчаюць пласты каменнай солі. На самай паверхні па-над морскімі адкладамі ў Трансільваніі ляжаць яшчэ пласты лёэсу.

Клімат краіны, дзякуючы горам, якія яе атачаюць, сухі, контынэнтавы. Лета тут гарачае; часамі бываюць моцныя сухмені; зіма параўнаўча з суседнімі нізінамі сьцюдзёная.

У месьце Сібіу сярэдняя гадавая тэмпэратура $+8{,}6^{0}$, сярэдняя студзеня—$3{,}9^{0}$, ліпеня $+19{,}3^{0}$.

Тут добра ўзрастаюць кіяхі, пшаніца і іншае збожжа, асабліва ў тых месцах, дзе спачатку расьлі толькі стэпавыя травы, бо там утварылася тлустая чорназемная глеба. Каля вёсак і гарадоў разводзяць садовіну, асабліва сьлівы, якія тутака сушацца і вывозяцца адсюль пад назовам чорнасьліву. Пад заслонай горных ланцугоў добра пасьпявае і вінаграднік. У горах галоўнымі заняткамі зьяўляецца гадоўля жывёлы, валка лесу і асабліва здабываньне карысных мінэралаў: бурага вугалю, золата, солі. Фабрычная прамысловасьць не пашырана, але саматужная апрацоўка дрэва і мэталаў мае значную вагу. Насельнікі краіны складаюцца пераважна з румын.

Гэта патомкі раманізаваных дакійцаў, што жылі тутака ў даўныя вякі. У час вялікіх перасяленьняў, калі суседнія нізіны былі заселены славянамі, тут у горных лясох Трансільваніі захаваліся рэшткі гэтага народу. З часам адгэтуль частка іх зноў спусьцілася ў суседнія нізіны Малдаўшчыны і Валахіі.

Апрача таго, тут жыве шмат перасяленцаў з Вугоршчыны (сэклераў) і з Нямеччыны, але акругі, залюдненыя вугорцамі і немцамі, з усіх бакоў абкружаны прасторамі з румынскай люднасьцю.

Да сусьветнай вайны 1914-1918 г. краіна належала да Вугоршчыны, спачатку карысталася самаўрадам, а потым вугорцы абвясьцілі яе неаддзельнай часткай свайго каралеўства. Пасьля вайны румыны адваявалі Трансільванію і далучылі яе да сваіх уладаньняў.

Культурным асяродкам краіны зьяўляецца места *Клюж* (павугорску Коложвар, панямецку Кляўзэнбург, 61 тыс. насельн.) з румынскім універсытэтам.

**Малдаўшчына** яшчэ можа разглядацца, як усходняе прыгор'е Карпат, але яна зьяўляецца ўжо часткай Усходня-Эўропэйскай раўніны*). На захадзе яе ў беспасрэднай блізкасьці да Сямёхгорадзкіх Карпат цягнецца паласа ўзгоркаў, багатых сольлю і нафтай, а далей на ўсход у вадазборы рэк Сэрэту і Пруту распасьціраецца роўная прастора, перарэзаная ярамі і далінамі рэк, складзеная з паземных пластоў і пакрытая грубым слоем лёэсавых глін. На поўначы Малдаўшчына можа лічыцца яшчэ нявысокім плоскаўзвышшам, а на поўдні і паўднёвым усходзе няпрыметна пераходзіць у Чорнаморскую нізіну. (У якім кірунку цякуць галоўныя рэкі Малдаўшчыны? Як яны завуцца, куды ўліваюцца, дзе пачынаюцца?).

Рэкі Малдаўшчыны павыгрызалі ў мяккіх грунтох глыбокія даліны з зрывістымі сьценкамі. Увясну рэкі заліваюць свае даліны і часта мяняюць свае рэчышчы. Значныя паводкі бываюць і ўлетку, калі ў вышнявінах рэк— у Карпатах—ідуць дажджы і сходзяць сьнягі. Ува ўсходняй палове краіны ў так званай Бесарабіі, што ляжыць між Прутам і Днястром, рэкі ў сваіх вусьцях утвараюць ліманы, як і рэкі Паўднёвай Украіны.

Некаторыя з гэтых ліманаў зусім аддзелены ад мора пескавымі гакамі і перавярнуліся ў прыморскія вазёры з слаба салонай вадой. Дзякуючы нарастаньню дунайскай дэльты, ліманы некаторых рэк, якія даўней уліваліся беспасрэдна ў мора, цяпер апынуліся далёка ад мора каля самага паўночнага з вусьцяў Дунаю.

Клімат краіны сухі, сярэдняя тэмпэратура самага цёплага месяца дасягае $+22^0$, самага халоднага—$5^0$. Цёплая пара́ году (з сярэдняй тэмпэратурай ночадзеньня болей за $+10^0$) тут цягнецца болей за 6 месяцаў. Гэтым краіна адразьняецца ад рэшты Усходня-Эўропэйскай раўніны і нагадвае Валахію і Вугоршчыну. Дзякуючы гэтаму тут добра сьпее вінаград, які далей на ўсходзе дасьпявае толькі на самым узьбярэжжы Чорнага мора.

Расьліннасьць Малдаўшчыны пераважна стэпавая. Лясы, галоўным чынам букавыя, растуць толькі на паўночным захадзе ды ў самых прыгор'ях Карпат. Чым далей на паўднёвы ўсход, тым іх меней, яны замяняюцца лесастэпам і запраўдным кавыльным стэпам. Грунты паўсюды вельмі добрыя, чорназемныя. Аднак зямля вырабляецца кепска, нядбала. Сяляне прызвычаіліся да вялікіх ураджаяў збожжа і ня рупяцца аб тым, каб гнаіць зямлю або завадзіць палепшаныя спосабы ральніцтва.

Асьвета ў краіне стаіць нізка, большасьць насельнікаў належыць да няпісьменных і ня ведае спосабаў, каб выйсьці з цяжкага эканамічнага становішча. Большая частка зямлі належыць да буйных землеўласьнікаў-баяр, якія жывуць па вялікіх гарадох або за рубяжом, напрыклад, у Парыжы, і зусім ня цікавяцца зямлёй. Сяляне жывуць бедна, зямлі ня

*) Паводле сваёй люднасьці Малдаўшчына мае шмат супольнага з Карпатамі і рэзка адразьняецца ад Украіны і іншых краёў Усходня-Эўропэйскай раўніны. Шмат ёсьць супольнага і ў прыродзе Малдаўшчыны і Карпат. З гэтай прычыны лепш разглядаць гэтую краіну, як частку Карпацкага краю.



маюць і працуюць на панскай зямлі, як арэндары ды парабкі. Кіяхі ды мамалыга крутая, як хлеб (каша з кіяховай мукі), складаюць галоўную страву малдаўскага сялянства, а пшаніца, як збожжа болей каштоўнае, прадаецца ў гарадох і вывозіцца за межы. Для працы на палёх трымаюць пераважна валоў, на мяса гадуюць сьвіней і авечак. Апошнія даюць і воўну, з якой малдаўцы выробляюць сабе хутраванкі, паясы, суконную вопратку. Каля Дунаю пашырылася рыбацтва—ловяць дунайскіх селядцоў і асятроў, здабываюць асятровую ікру. З іншых галін сельскай гаспадаркі значную ролю граюць вінаградніцтва і садоўніцтва. Вінаградняў у Малдаўшчыне многа і расьце вінаграднік там добра. З прычыны нізкай культуры малдаўцы не навучыліся гатаваць добрых він; вінаград там ня смачны, а віны не салодкія. Садоўніцтва мае лепшае становішча. Малдаўцы вельмі любяць свае сады, добра даглядаюць іх і ўважаюць болей, чымся польную працу. Апрача йгруш і яблынь саджаюць абрыкосы, пэрсікі, чарэшні, валоскія арэхі, асабліва-ж сьлівы. Сушаныя сьлівы (чорнасьліў) зьяўляюцца важным продуктам, які ідзе на страву сялянства і на вываз за межы. Фабрычная прамысловасьць пакуль што не пашырылася. Рэчы хатняга ўжытку выробляюцца саматужным спосабам. Буйныя прадпрыемствы апрацоўваюць толькі вясковыя продукты. Болей за ўсё тут паравых млыноў; пачынае пашырацца фабрычнае гарбарства.

Як у земляробскай краіне, у Малдаўшчыне большасьць насельніцтва жыве па вёсках, пад саламянай страхой, у маленькіх, убогіх хатах, зробленых з гліны, саломы і гною. Гной ідзе і на апал, як на Украіне. Яго сушаць, прасуюць і кучамі складаюць на панадворку, як у нас дровы (як завуць на Украіне сушаны гной?). Гарадоў у краіне мала, большасьць з іх зьяўляецца толькі вялікімі вёскамі з напалову земляробскай люднасьцю.

Галоўны з запраўдных гарадоў *Ясы* (80000 н.), што ляжаць у сярэдзіне Малдаўшчыны на скрыжаваньні галоўных чыгунак. Калісь тут знаходзіліся дзяржаўныя ўстановы Малдаўскага княства. Цяпер гэта культурны асяродак краіны з унівэрсытэтам. На ўсходзе ў Бесарабіі галоўным горадам зьяўляецца *Кішынёў* (114000 нас.) з буйнымі паравымі млынамі.

Гандлёвай прыстаньню краіны ёсьць *Галац* (74000 нас.), што ляжыць на Дунаі, але даступны для морскіх караблёў.

Большасьць насельнікаў Малдаўшчыны становяць малдаўцы, якія зьяўляюцца галінай румынскага народу. Як і ўсе румыны, яны адразьняюцца ад іншых раманцаў маўклівасьцю, пакойнасьцю, гультаяватасьцю. У паўднёвай частцы Бесарабіі апрача малдаўцаў жыве шмат балгар, украінцаў і грэкаў. На поўначы (у Хоцінскім павеце) украінцы месцам складаюць большасьць мясцовай людносьці. Далей па ўсёй краіне раскіданы цыганы і жыды. Апошніх аднак моцна ўціскае румынскі ўрад, хаця паводле канстытуцыі яны маюць поўныя правы грамадзянства.

У сярэднія вякі Малдаўшчыну захапілі туркі. Аднак на чале яе стаялі асобныя князі, і краіна карысталася самаўрадам. У 1812 г. ўсходняя палова краіны—Бесарабія—адышла была да Расіі; у 1856 г. частка Бесарабіі адышла назад да Турэччыны, а з 1878 году аж да мінулай вайны зноў уся Бесарабія ўваходзіла ў склад Расійскай імпэрыі. Паўночна-заходні куток—так званая Паўднёвая Букавіна—належала да Аўстрыі і толькі ў 1918 г. злучылася з рэштай Румыніі. Пасьля вайны ў руках Румыніі апынулася і Бесарабія, хаця з Расіяй, да якой раней належала Бесарабія, Румынія не ваявала. СССР не прызнае Бесарабію часткай Румыніі і вымагае, каб працоўнаму люду гэтага краю была дадзена магчымасьць самому вызначыць свой лёс. Шырокія колы прыгнечанага сялянства краіны імкуцца аддзяліцца ад Румыніі і залажыць Малдаўскую ССР. На левым беразе Днястра куточак Украіны, залюднены малдаўцамі, ужо абвешчан Малдаўскай ССР. З гэтай рэспублікай і жадаюць злучыцца сяляне Бесарабіі.

**Валаская нізіна** ляжыць між Трансільванскімі Альпамі і Дунаем. Калісь і тут было мора, заваленае з цягам часу адкладамі рэк. Прарваўшыся праз Жалезную Браму (глядзі агляд Балгарскай краіны), на Валаскую нізіну ўходзіць Дунай, утвараючы тут шырокую балотную даліну, паўднёвую мяжу краіны і граніцу між Балгарскай і Румынскімі землямі.

Краявід Валахіі не адзначаецца хараством. Гэта роўная краіна, пакрытая лёэсам, вышні пласт якога стаўся ўраджайнай чорназемнай глебай. Бяздрэўны, сухі стэп у сухую пару выпальваецца сонцам; грунты трэскаюцца, у паветры лётае пыл. Пасьля дажджоў паўсюды стаяць лужы, паўсюды бруд, грязь.

Клімат краіны бязмаль такі самы, як у Малдаўшчыне, адно толькі крышку цяплейшы.

Бухарэст мае сярэднюю гадавую тэмпэратуру $+10{,}6^{0}$, сярэднюю студзеня—$2{,}9^{0}$, ліпеня $+22{,}8^{0}$.

Ападкаў паўсюды меней за 500 мілімэтраў, і толькі ў прыгор'ях Трансільванскіх Альп колькасьць іх дасягае і нават перавышае 600 міл. Згодна з гэтым разьмеркаваньнем ападкаў кавыльны стэп, які пануе на нізіне, па прыгор'ях пераходзіць у лесастэп або запраўдны букавы лес.

Насельнікі краіны—валахі, як і малдаўцы, зьяўляюцца адным з двох галоўных пляменьняў румынскага народу. Выціснутыя калісь адгэтуль славянамі ў Трансільванію, румыны з цягам часу зноў пакрысе распаўсюджыліся тут сваю мову. Аднак відаць, што ў кроў сучасных румын улілося шмат славянскай крыві. Як малдаўцы, гэтак і валахі, моцна розьняцца ад сваіх родзічаў па мове—італійцаў або гішпанцаў.

У іх няма тэй жвавасьці, рупатнасьці, рухавасьці, якімі вызначаюцца паўднёва-заходнія романцы. Валахі роўнаважны, цярплівы, сумленны народ, ня вельмі працавіты, але здатны, сьмелы і ахвяраздольны. На жаль, нізкае становішча асьветы і без-



царамоннасьць баяр-земляўласьнікаў, якія выціскаюць усе сокі з сялян, перашкаджаюць узбагачэньню Валахіі і румынскага народу. З гэтай прычыны як у Малдаўшчыне, гэтак і ў Валахіі сялянства жыве бедна.

У сярэднія вякі Валахія, як і Малдаўшчына, была захоплена туркамі і таксама зрабілася самаўрадным княствам, якое плаціла падатак турэцкаму султану. Спачатку туркі не зварочвалі ўвагі на ўнутраныя справы Валахіі, на чале якой стаяў мясцовы князь румынскага пахаджэньня. Аднак у XVIII в. турэцкі ўрад пачаў назначаць сюды грэцкіх кіраўнікоў, якія прагавіта рабавалі румынскае сялянства. За кіраўнікамі з Турэччыны сюды пачалі надыходзіць грэцкія гандляры і ўраднікі, якія трымалі ў сваіх руках усе галіны народнай гаспадаркі і ганьбілі мясцовых насельнікаў. У 1822 г. Валахія зноў атрымала права мець мясцовых князёў і пачала вызваляцца ад грэцкіх уплываў. Пачала пашырацца румынская культура, навука, літаратура, але царква доўга яшчэ заставалася пад уплывам грэцкіх папоў. Асьвета, якой кіравала праваслаўная царква (румыны па сваёй веры пераважна праваслаўныя), стаяла вельмі нізка. У 1859 г. Валахія злучылася з Малдаўшчынай у адну Румынскую дзяржаву, на чале якой стаў нямецкі прынц, а з 1881 г.—кароль. Зрабіўшыся констытуцыйным каралеўствам, Румынія хутка пачала заводзіць у сябе заходня-эўропэйскія парадкі. Яшчэ ў 1878 г. да Румыніі была далучана Дабруджа ўзамену за Бесарабію, якую забрала тады ад румынаў Расія. Асабліва вялікую вагу набыла Румынія пасьля апошняй сусьветнай вайны 1914-18 г. Румынія заўладала Бесарабіяй, Трансільваніяй, Букавінай і часткай Банату. Такім чынам у сучаснай Румыніі ня толькі злучыліся ўсе землі, залюдненыя румынамі, але й значныя прасторы, у якіх большасьць складаецца з іншых народаў: украінцаў (у Паўночнай Букавіне і Паўночна-Усходняй Бесарабіі), балгар (у Дабруджы і Паўднёвай Бесарабіі), вугорцаў і немцаў (у Трансільваніі), сэрбаў (у Банаце).

Валахія зьяўляецца галоўнай часткай, ядром Румынскай дзяржавы (якая абымае прастору ў 296000 кв. клм. з 16 мільён. насельн.). Тут на багатай чорназемнай глебе асабліва добра ўзрастае ўсялякая збожжа і асабліва ўлюбёнае румынскае збожжа—кіяхі. Пшаніца, як каштаўнейшае збожжа, засяваецца пераважна для продажу. У значна меншай колькасьці сеюць ячмень і зусім мала аўса. Дзеля алею сеюць рапс, далей сеюць боб, табаку, каноплі. Для ўласных патрэб саджаюць вінаграднік і морву, гародніну і садовіну. Усё гэта расьце тутака добра, і краіна магла-б быць аднэй з найбагацейшых у Эўропе, калі-б ня буйная земляўласнасьць і бязрупатнасьць баяр. У апошнія часы ўрад пачаў клапаціцца аб зьмяншэньні буйной земляўласнасьці, і сельская гаспадарка пачала паляпшацца.

Даліны Дунаю і меншых рэк Валахіі зьяўляюцца найлепшымі сенажацямі, у якіх косяць траву для многалічнай жывёлы—бавалаў, звычайнага быдла, авечак і г. д. Вельмі многа ў Валахіі і сьвіней. Хутры, скуры, воўна і сала вывозяцца з Валахіі побач з пшаніцай і кіяхамі.

У прыгор'ях Трансільванскіх Альп здабываецца соль і нафта. Там нафта месцам фантанам выліваецца на паверхню з сьвідраваных калодзежаў. На фабрыках з нафты вырабляюць газу, бэнзыну і мінэральны алей.

Аднак наагул фабрычная прамысловасьць, як і паўсюды ўва Ўсходняй Эўропе, не пашырана. Апрацоўчая прамысловасьць часьцей мае характар дробнай, хатняй прамысловасьці. Тут яшчэ шмат глухіх куткоў, дзе кожны гаспадар сам вырабляе ўсе патрэбныя рэчы хатняга ўжытку. Лепей за прамысловасьць стаіць гандаль, якому дапамагае добрая сець чыгунак і выгодная гандлёвая дарога—Дунай, але гандаль, як дробны, унутраны, гэтак і буйны, замежны, знаходзіцца ў руках чужынцаў—армян, грэкаў, жыдоў, якіх шмат жыве па гарадох Валаскай нізіны.

Як і ў Малдаўшчыне, гэтак і тут, гарадоў ня лішне многа. Сталіца і найвялікшы горад усёй Румыніі *Бухарэст* (338 тыс. насельн.) ляжыць блізка-што ў асяродку Валахіі. Тут згуртованы ўсе ўрадавыя ўстановы, шмат школ і ў тым ліку лепшы з румынскіх унівэрсытэтаў. Гэта досыць прыгожы горад з харошымі сучаснымі будынкамі, з вялікімі магазынамі, з прыгожымі паркамі і садамі.

На поўнач ад сталіцы каля прыгор'яў Карпат знаходзіцца асяродак здабываньня нафты—*Плёэшты* (57000 насельн.).

На левым беразе Ніжняга Дунаю крыху вышэй Галацу ў паўночна-ўсходнім кутку Валахіі ляжыць галоўная прыстань краіны—*Браілаў* (66000 нас.). Праз гэты горад вывозіцца большасьць валаскіх тавараў на морскіх караблёх, якія могуць даплываць да самага Браілаву.

**Вугоршчына** або Сярэдня-Дунайская нізіна ляжыць на захад ад Карпат і складаецца з дзьвёх катлін: Вышня-Вугорскай і Ніжня-Вугорскай, аддзеленых адна ад аднэй ланцугом нявысокіх Сярэдня-Вугорскіх гор.

Сярэдня-Вугорскія горы маюць падобнасьць да гор Заходняй Эўропы, таксама зьяўляюцца горстамі, адзначаюцца прыгожымі ляснымі схіламі, мяккімі абрысамі і невялікай вышынёй. Галоўны горст Баконскі Лес ледзь дасягае 713 м. над р. м. Між Дунаем і Дравай у Ніжня-Вугорскай катліне ляжыць зусім асобна прыгожы горст Пяцёхкасьцёльле, у якім знаходзяць паклады каменнага вугалю.

За выключэньнем горстаў абедзьве вугорскія нізіны адзначаюцца роўнасьцю і ляжаць зусім нявысока над роўнем мора.

Шырокі Дунай прарываецца праз Сярэдня-Вугорскія ўзвышшы і злучае ў адно абедзьве нізіны. У Вышня-Вугорскую нізіну Дунай прыплывае з Венскай нізіны і ніжэй Брацiславы (глядзі аб Заходніх Карпатах) разьдзяляецца на некалькі адтокаў, утвараючы 2 вялізныя востравы, складзеныя з рэчных адкладаў: Вялікі і Малы Шут.

На поўдзень ад Дунаю ў Вышня-Вугорскай нізіне ляжыць мелкае саланаватае Нэйзыдлерскае возера, рэштка даўнейшых вялікіх вадзяных прастор. Часамі гэтае возера зусім усыхае. На ўсход ад Нэйзыдлерскага



возера цягнуцца грузкія балоты, гожыя на пашу, але нявыгодныя для будоўлі. У апошнія часы гэтыя балоты часткай асушаны і перавярнуліся на ральлю.

У Ніжня-Вугорскай нізіне, якая па сваёй прасторы ў некалькі разоў перавышае Вышня-Вугорскую, Дунай прымае свае галоўныя прытокі: Цісу зьлева і Драву, што цячэ па мяжы Вугоршчыны і Харвацка-Славонскага міжарэчча,—з правай стараны. Дунай, Ціса і Драва ды й іншыя рэкі Ніжня-Вугорскай нізіны з прычыны яе роўнасьці цякуць павольна, ціхамірна ў шырокіх далінах, пакрытых рэчнымі адкладамі і багатых старарэччамі, утвараюць шмат рэчных астраўкоў і адзначаюцца вялікімі паводкамі, ад якіх шмат церпяць лярэчныя паселішчы. У апошнія часы вугорцы робяць спробы зьменшыць небясьпеку ад разводзьдзяў з дапамогай штучных грэбляў па берагох рэк.

У Ніжняй Вугоршчыне ёсьць адно вялікае, але няглыбокае возера,—Плятэн, што ляжыць каля падгор'яў Баконскага Лесу. Як і гэты Баконскі Лес, возера Плятэн выцягнута з паўднёвага захаду на паўночны ўсход.

Сучасная будова паверхні Вугоршчыны тлумачыцца гісторыяй утварэньня гэтай нізіны. Калісь уся яна была горнай краінай, якая злучала ўклады Альпійскіх і Карпацкіх зморшчавых гор. Потым, у той час, калі адбываліся апошнія процэсы гораўтварэньня ў Альпах і Карпатах, Вугоршчына пачала апускацца і зьнізілася нават ніжэй роўня мора, так што за выняткам сучасных горстаў уся краіна зрабілася дном мора. Так званае Сармацкае мала-салонае мора пакрывала Вугоршчыну, Сямёхгорадзьдзе, Украіну, Малдаўшчыну і Валахію. З цягам часу гэтае мора падзялілася на асобныя ўнутраныя вазёры, злучаныя паміж сабой рэчнымі пратокамі. Вазёры з свайго боку пакрысе завальваліся адкладамі рэк, якія ўліваліся ў іх з суседніх гор. Толькі параўнаўча маленькія вазёры Нэйзыдлерскае і Плятэн захаваліся да цяперашняга часу, як рэшткі вялікіх вадзяных прастораў даўніны.

Павярхоўны пласт Вугорскай нізіны складаецца з лёэсу, вышні слой якога ператварыўся ў тлустую ўраджайную чорназемную глебу. Толькі дзе-ні-дзе каля рэк замест ураджайнага лёэсу на паверхні ляжаць сыпкія пяскі, з якіх складаюцца невялікія пусткі і лярэчныя пескавыя выдмы.

Клімат Вугоршчыны контынэнтавы, падобны да клімату Валаскай нізіны. Толькі зіма тутака трошкі цяплейшая, а лета халаднейшае, як там.

Будапэшт мае сярэднюю тэмпэратуру году +10, сярэднюю студзеня—1,9°, сярэднюю ліпеня +21,4°.

Тутака вельмі добра ўзрастаюць кіяхі, дыні, табака, вінаграднік, але малая колькасьць ападкаў і сухмені перашкаджаюць узрастаньню дрэў. Лясы, пераважна дубовыя ды букавыя, сустракаюцца толькі па ўскрайках краіны ды ў Сярэдня-Вугорскіх горах. Рэшта краіны—неаглядны кавыльны стэп, так званая Вугорская пушта. Аж да сярэдзіны XIX веку гэты стэп

выглядаў нечапаным. Увясну ён стрыкацеў рознакалёрнымі краскамі, улетку жоўкнуў, а ўвосені рабіўся голым, выпаленым гарачымі праменьнямі сонца. Вольна пасьвіліся цэлы год тутака статкі коняй і быдла, кіраваныя коньнікамі—пастухамі. Цяпер стэп узаралі, і багатыя нівы зьмянілі аднастайную расьліннасьць стэпу. Толькі ўвосені пасьля жніва голыя нівы з рэшткамі ўсохлага пустазельля на іх выглядаюць, як стэп, або хутчэй, як пустыня. Напаленае паветра, як у пустынях, зьзяе нейкім сьвятлом, раскладаецца на слаі, у якіх, нібы ў люстэрку, адбіваюцца вобразы розных прадметаў. Гэта тыповае зьявішча пустынь—рэдкае ў Эўропе марава (міраж).



Мал. 109—Вугорскі стэп (пушта). Засевы кіяхоў.

Абгароджаная з усіх бакоў гарамі, Сярэдня-Дунайская нізіна мае шмат асаблівасьцяй у клімаце, грунтох і расьліннасьці, рэзка адразьняецца ад суседніх краін і нібы самой прыродай назначана для асобнага народу, які мог-бы стварыць тутака сваю ўласную культуру і самастойную дзяржаву. Такім народам і зьяўляюцца вугорцы. Паводле сваёй мовы яны лічацца за народ фінскай галіны, кроўны паўночна-уральскім вагулам і асьцякам. Гэтай мовай, а таксама сваёй вопраткай і звычаямі вугорцы моцна розьняцца ад суседніх народаў, але, абкружаныя з усіх бакоў славянамі, румынамі, немцамі, яны ў працягу некалькіх вякоў мяшаліся з сваімі суседзямі, так што сваім абліччам нагадваюць хутчэй эўропэйцаў, чымся паўночных уральцаў. Разрэз вачэй у іх правільны, просты, валасы хвалістыя, а ня простыя, як у запраўдных уральскіх фінаў. Цёмным колерам скуры, валосаў і вачэй вугорцы нагадваюць хутчэй за ўсё паўднёвых славян. Вугорцы маюць сваю досыць багатую літаратуру, вядомы сваёй



музыкальнасьцю, але паводле становішча асьветы далёка не дасягнулі яшчэ таго роўня, на якім стаяць іх заходнія ды паўночныя суседзі—немцы і чэха-славакі.

Палажэньне ў беспасрэднай блізкасьці да культурных старонак Заходняй Эўропы, а з другога боку стэпавая, усходняэўропэйская прырода і суседзтва з стэпамі, па якіх лёгка пранікалі ў Эўропу азійскія вандроўныя народы, з даўных часоў выклікалі бязупыннае змаганьне ў Вугоршчыне заходня-эўропэйскіх і ўсходніх уплываў. Ледзьве пасьпяваў тут асталявацца які-небудзь аселы народ, як з усходу сюды навальваліся стэпавыя вандроўнікі, руйнавалі пачаткі аселасьці ў краіне, але самі хутка пачыналі падпадаць пад уплывы аселых тубыльцаў. У сярэднія вякі тут жылі славакі, нават і да цяперашняга часу асобнымі астравочкамі сустракаюцца іх паселішчы па ўсёй Вугоршчыне. Аднак ужо ў IX веку з усходу сюды надышлі вугры або мадзьдзяры. Яны перасяліліся сюды з Украіны цераз Карпаты, павыганялі з Сярэдня-Дунайскай нізіны славян і спачатку вандравалі з месца на месца па пушце, займаліся рабункамі і гадоўляй жывёлы. У канцы X веку вугры запазычылі ад сваіх суседзяў хрысьціянскую каталіцкую веру, пачалі мяшацца з славянамі і патроху зьмянілі вандроўны стан быцьця на аселы. Аднак сваю мову і незалежнасьць вугорцы з посьпехам баранілі ад суседзяў. Нават злучыўшыся з Нямецкай Аўстрыяй пад уладай аднаго караля, вугорцы захавалі ў чыстаце сваю мову і не паддаліся нямецкім уплывам. Вугоршчына карысталася шырокім самаўрадам, а з 1867 г. фактычна сталася зусім незалежнай, мела свае законы, асобны сойм і асобных міністраў. Супольнымі ў Аўстрыі і ў Вугоршчыне былі толькі кароль, войска, замежная політыка і грашовыя справы. Да Вугоршчыны належала ня толькі ўся Сярэдня-Дунайская нізіна, але, апроч таго, Заходнія Карпаты, Вугорская Русь, Трансільванія і нават Кроацыя з Славоніяй аж да берагоў Адрыятычнага мора. У межах Вугорскага каралеўства жыло шмат славакаў, украінцаў, румынаў, сэрбаў, харватаў і немцаў. Некаторыя з гэтых народаў размнажаліся шпарчэй за вугорцаў, якім пагражала страта першага па ліку месца ў сваёй дзяржаве. З гэтай прычыны вугорцы стараліся як мага абвугорыць падуладныя народы, прымушалі іх вучыць дзяцей у вугорскіх школах і гутарыць павугорску ў установах. Многа славянаў і румынаў выяжджала з Вугоршчыны ў Амэрыку, многія з іх пакрысе абвугорваліся. Толькі ў Хорваціі і Славоніі сэрбы карысталіся некаторым самаўрадам. Пасьля сусьветнай вайны 1914—18 г. і вайны з Румыніяй Вугоршчына страціла ўсе тыя часткі сваёй дзяржавы, у якіх большасьць складалася з народаў нявугорскага пахаджэньня.

Сучасная Вугорская дзяржава (93000 кв. клм., 7900 тыс. насельн.) зьяўляецца рэспублікай, на чале якой стаяць буржуазныя партыі. У склад гэтай дзяржавы ўваходзіць нават ня ўся Сярэдня-Дунайская нізіна, бо ўскрайкі яе на ўсходзе адышлі да Румыніі, а на поўдні—да Паўднёва-Славяншчыны.

Вугорцы займаюцца пераважна земляробствам і гадоўляй жывёлы, але апошні з гэтых заняткаў далёка ня грае тэй ролі, якую граў раней, калі большая частка пушты ня была яшчэ ўзорана.

Як і ў Румыніі, галоўным збожжам зьяўляюцца кіяхі і пшаніца, якія адначасна служаць і галоўным продуктам спажывы мясцовай люднасьці і найважнейшым прадметам вывазу за межы. З палямі кіяхоў і пшаніцы чаргуюцца палі, засеяныя бульбай, цукровымі буракамі, табакай і кармавымі травамі. Вялікую вагу маюць і вінаградні. Вугорскія віны карыстаюцца сусьветнай славай і вывозяцца за межы ў вялікай колькасьці.

Пакуль што добра стаіць і гадоўля жывёлы. За межы вывозяцца коні, авечкі сьвіньні, у невялікай колькасьці быдла і яйкі хатніх птушак. Наадварот, пчалярства і шаўкоўніцтва задавальняе толькі мясцовыя патрэбы.



Мал. 110.—Будапэшт. Мост цераз Дунай.

Фабрычная прамысловасьць пашыраецца марудна. Вагу мае толькі апрацоўка сельска-гаспадарчых продуктаў: млынарства, выраб сьпірытусу, цукру. Іншыя галіны апрацоўчай прамысловасьці маюць характар саматужных промыслаў.

Зразумела, што такі кірунак народнай гаспадаркі злучан з перавагай вясковай люднасьці над гарадзкой. Сярод багатых раўнінных ніў, часьцей за ўсё каля рэчак і рэк, параскіданы вугорскія вёскі і хутары. Белыя вясковыя хаткі, збудованыя з гліны і саломы, пашмарованыя вапнай ці крэйдай, крытыя саламянай страхой, хаваюцца ў зеляніне сьліўных і вышнёвых садочкаў, стромкіх тополяў і белых акацый (робіній). Панадворкі абгароджваюцца платамі, а над імі, як і па нашых вёсках і хутарох, уздымаюцца жоравы студняў. Гарады адразьняюцца ад вёсак толькі велічынёй, большым лікам насельнікаў. Будынкі ў гарадох звычайна ў адзін паверх, вуліцы шырокія, небрукаваныя, ціхія. Толькі ў час кірмашоў гарады аджываюць, пачынаецца рух, бойкі гандаль.



Адзіным сучасным буйным эўропэйскім горадам можа лічыцца толькі сталіца Вугоршчыны—*Будапэшт* (913000 насельнікаў), што ляжыць на Дунаі ніжэй яго прарыву праз Сярэдня-Вугорскія горы. Лежачы на скрыжаваньні галоўных чыгунак краіны, з якіх некаторыя маюць паміжнародную значнасьць, Будапэшт зьяўляецца галоўным гандлёвым асяродкам Вугоршчыны. Найвялікшага росквіту дасягнуў ён перад сусьветнай вайной у час найбольшага красаваньня Вугоршчыны.



Мал. 111.—Будапэшт. Базыліка.

На высокім правым беразе Дунаю хораша ўздымаецца нямецкая частка гораду—Буда, або Офэн, з многалічнымі вінаграднямі і старасьвецкімі будынкамі ды касьцёламі, пабудованымі на старанямецкі лад. Тут знаходзяцца галоўныя ўрадавыя ўстановы. Насупроціў, на левым беразе, ляжыць вугорскі асяродак Пэшт, тыповы горад раўніны, але прыгожы, багаты, зусім сучасны з раскошнымі магазынамі, многалічнымі фабрыкамі машын, паравымі млынамі, буйнымі гарбарнямі, ткацкімі фабрыкамі, на якіх выробляюць баваўнянку і г. д. Пэшт—грашовы і гандлёвы асяродак Вугоршчыны з важнымі кірмашамі, на якіх гандлююць збожжам, воўнай, алеем і гэтак далей. Тут згуртаваліся і галоўныя культурна-асьветныя ўстановы: унівэрсытэт, акадэмія мастацтваў і наагул усё, што ёсьць выдатнае ў вугорскай навуцы і мастацтве.

# Крым.

(Азнач географічнае палажэньне Крымскага паўвострава. Пералічы, якія моры яго атачаюць. Які пярэсмык злучае Крым з Украінай? Якая пратока злучае Азоўскае мора з Чорным? Які паўвостраў аддзяляецца ад Крыму на ўсходзе?).

Між Азоўскім морам і Адэскай затокай Чорнага мора ляжыць паўвостраў Крым, злучаны з Украінай толькі вузкім Перакопскім пярэсмыкам. На ўсход ад гэтага пярэсмыку між Украінай і Крымам урэзалася ўсыхаючая затока Азоўскага мора, вядомая пад назовам Сівашу або Гнілога мора. Берагі Сівашу пескаватыя, зьвілістыя, вада салоная, так што на дне кожны год асядае пласт солі, якую там здабываюць у вялікай колькасьці. Вузкі і даўгі Арабацкі гак аддзяляе Гнілое мора ад Азоўскага і дадае Сівашу выгляд вялікага ліману. Выпарэньне вады з паверхні Гнілога мора тякое вялікае, што вада Азоўскага мора заўсёды цячэ ў Сіваш, папаўняючы ўбытак паруючай вады. Такім чынам Азоўскае мора мае падобнасьць да стокавага возера і мае ваду амаль-што прэсную, а Сіваш нагадвае бясстокавае возера, колькасьць солі ў ім заўсёды павялічваецца і яна мусіць крышталізавацца тут, асядаць на дно. Вада Сівашу такая салоная, што ў ёй цяпер ня могуць жыць ані рыбы, ані якія іншыя морскія організмы. Рэшткі даўнай расьліннасьці Сівашу, выкінутыя хвалямі на ўзьбярэжжа, гніюць і выдзяляюць няпрыемна пахнучы серка-вадародны газ ($H_2S$). Гнілое мора вельмі вялікае, так што цераз яго аказалася магчымым пракласьці чыгунку, якая злучыла Крым з Украінай і Маскоўшчынай. Чыгунка гэтая часткай праходзіць па гаках і астравах Сівашу, часткай па мастох, часткай па грэблях, насыпаных на дне самага мора.

Аддзелены Сівашом ад рэшты Ўсходняй Эўропы, лежачы блізка да Міжземнаморскіх старонак, Крым, або як яго йначай завуць Таўрыя, жыў з даўных часоў сваім асобным жыцьцём і вельмі рана запазычыў даўна-грэцкую культуру. Сюды адзін за адным пранікалі народы, што вандравалі па ўкраінскім стэпе, а з другога боку па моры сюды наяжджалі гандляры і колёністыя з Паўднёвай Эўропы. З гэтай прычыны люднасьць Крыму складаецца з самых рознастайных народаў і пляменьняў. Болей за ўсё тут украінцаў, якія надышлі сюды параўнаўча нядаўна; за імі па колькасьці йдуць патомкі крымскіх татар, сумленны народ, які захаваў у чыстаце даўныя звычаі і старасьвецкі спосаб жыцьця.

Рэшту насяленьня складаюць маскоўцы, грэкі, жыды, караімы (сэкта жыдоўскай веры, якая заве сябе патомкамі даўніх хазараў), армяне, немцы, балгары, цыганы, беларусы і г. д.

З пачатку гістарычных часоў у Крыме жылі так званыя кімэрыйскія тракійцы. З часам іх павыцiскалі адтуль таўры, народ скіцкага пахаджэньня, які запазычыў даўна-грэцкую культуру. Раскопкі царскіх магіл даўных таўраў прывялі да вынаходкі ужываных таўрамі дзіўных ваз, акрасаў, грошай, спрату і прылад, зробленых з каштоўных мэталаў і прыкрашаных малюнкамі. Гэтыя прылады сьведчаць, што ўжо ў самыя даўныя часы гісторы Крым быў гандлёвым пасярэднікам між Грэцыяй і Ўсходняй Эўропай, гандляваў нават з Уралам, адкуль толькі і маглі пахадзіць некаторыя мэталічныя вырабы, пахаваныя ў таўрскіх магілах. Ужо тады на ўзьбярэжжах Крыму існавалі багатыя грэцкія колёніі, якія ўплывалі адгэтуль на культурнае жыцьцё ўсёй Усходняй Эўропы. У часы панаваньня ў Эўропе Вялікага Рыму ў Крыме ўтварылася магутная дзяржава, так званае Босфорскае царства слыннага Мітрыдата. На рубяжы даўных і сярэдніх вякоў сюды надышлі готы, народ гэрманскага племя, які панаваў тады і на ўсім паўднёвым усходзе Эўропы. Рэшткі готаў захаваліся ў Крыме аж да XVII в. Кожны народ, які вандраваў па стэпах Паўднёвай Украіны, даваў новых перасяленцаў і ў Крым. Аднак, у той час, як на Украіне новыя хвалі вандроўнікаў хутка змывалі папярэдніх насельнікаў, у Крыме ў баку ад галоўнай дарогі з Азіі ў Эўропу старыя народы затрымоўваліся значна даўжэй. Ёсьць довады, што яшчэ ў 1334 г. ў Крыме трымаліся патомкі аланаў, зьнікшых многа раней у рэшце Эўропы. Гандлем Крымскага паўвострава пасьля грэкаў кіравалі вэнэцыйцы, якіх потым замянілі гэнуйцы, што залажылі тут багатыя гандлёвыя колёніі. Апошнімі з вандроўнікаў Усходняй Эўропы, якія захаплялі Крым, былі татары, што залажылі тут Крымскае ханства. Горды крымскіх татараў, вядомыя часамі пад назовам перакопскіх і нагайскіх гордаў, доўга палохалі ўсю Украіну, а часамі непакоілі Беларусь і Польшчу. Аддаўшыся пад уладу турэцкага султана, крымскія татары яшчэ болей умацаваліся, часта нападалі на Украіну, набіралі там палонных і прадавалі ў няволю ў Турэччыну. У 1783 г. Крым адышоў да Маскоўшчыны, і большасьць яго татарскай людпасьці павысялялася ў Турэччыну. Замест іх тут пачалі сяліцца ўкраінцы, немцы, маскоўцы і балгары.



Пасьля рэволюцыі ў Расіі Крым зрабіўся самаўраднай рэспублікай (38500 кв. клм., 594 тыс. насельн.), якая ўваходзіць у склад РСФСР.

Паводле прыроды Крым можна падзяліць на тры краіны: 1) Стэпы Паўночнага Крыму, 2) Крымскія горы і 3) Керчанскі паўвостраў.

**Паўночна-заходняя частка Крыму** зьяўляецца працягам украінскіх стэпаў. Гэта ўзгаркаватая раўніна, пакрытая лёэсам або лёэсавымі глінамі, перарэзаная ярамі і перасыхаючымі рэкамі. Толькі адна рака Салгір, якая пачынаецца ў горах Паўднёвага Крыму і ўліваецца ў Гнілое мора, не перасыхае ў значнай частцы свайго бегу, але нават у ёй улетку вада ледзь пакрывае рэчышча.

Клімат тут яшчэ сушэйшы, як у Паўднёвай Украіне. (Толькі на поўдні, у прыгор'ях Крымскіх гор, дажджу выліваецца болей за 300 мілім.)

Сімфэрополь мае сярэднюю тэмп. году $+10{,}1^0$, сярэднюю студзеня—$0{,}8^0$, ліпеня $+20{,}8^0$.

Глеба тут бурая, з малым працантам перагною, часамі пераходзіць у бясплодныя саланчакі, але месцам сустракаецца і чорназем, хаця і не такі багаты, як на Украіне (зьмяшчае 4-6% перагною). Тут яшчэ захаваліся месцам кавалкі нечапанага стэпу, пярэстага ад красак на лепшых грунтох, шэрага, аднастайнага на саланчаках. Гадоўля жывёлы і ральніцтва зьяўляецца тут галоўнымі заняткамі люднасьці. Гадуюць авечкі, быдла, коні, месцам нават вярблюдаў. У лепей абвадненых месцах сеюць пшаніцу, а каля вёсак, дзе магчыма штучнае абвадненьне, пераважна ў далінах рэк, сеюць табаку, кавуны, дыні, баклажаны, перац, памідоры, кіяхі; саджаюць вінаграднік, абрыкосы, чарэшні, яблыні і йгрушы, морву і г. д. У ліманах і ў Гнілым моры здабываюць соль.

На захадзе краіны каля мора ляжыць асяродак здабываньня солі, лячэбнае места *Эўпаторыя*, прыстань для караблёў паўзьбярэжнага плаваньня з найлепшым для морскага купаньня пляжам.

На Салгіры і на чыгунцы ў прыгор'ях Крымскіх гор ляжыць *Сімфэрополь* (71000 насельн.), сучасная сталіца Крымскай самаўраднай рэспублікі, багаты горад з прыгожым гарадзкім садам, добрымі магазынамі, прыгожымі помнікамі, царквамі і мячэцямі. Залюдненая татарамі старая частка гораду мае зусім усходні выгляд, адзначаецца крывымі вуліцамі, плоскімі дахамі, высокімі мінарэтамі многалічных мячэцяй.

Яшчэ болей старасьветчыны захавалася ў *Бахчысараі*, які ляжыць на тэй-жа чыгунцы, што злучае Крым з Украінай і Маскоўшчынай, у катліне, абкружанай вапнавымі скаламі. Гэтая даўняя сталіца крымскіх ханаў і да цяперашняга часу зьяўляецца татарскім местам з жоўтымі хатамі, крытымі плоскімі дахамі, многалічнымі кавярнямі, гэтымі клюбамі татар, з грэцкімі і татарскімі крамамі, нарэшце з цікавым ханскім палацам, у ўнутраных панадворках і садочках якога вечна пырскае вада фонтанаў, і ціха шасьцяць лісты старых морваў. У ваколіцах Бахчысараю знаходзіцца „горад памершых“ з пячорнымі пакоямі—Чуфут-Кале, сьвятыня караімаў.

Ад Бахчысараю галоўная Крымская чыгунка цягнецца далей на паўднёвы захад, у тунэлях пераразае адгор'і Крымскіх гор і каля мора дасягае *Сэвастополю* (63 тыс. нас.), галоўнай морскай крэпасьці Усходняй Эўропы, якая ляжыць каля найлепшай разьвіленай букты.

Гэта прыгожы чыста эўропэйскі горад з шырокімі вуліцамі, раскошнымі магазынамі, цікавымі музэямі, харошымі бульварамі. Калісь каля сучаснага Сэвастополю існавала грэцкая колёнія Хэрсонэк (Карсунь), у якой нібы-то хрысьціўся ў 988 г. кеўскі князь Уладзімір сьвяты. На месцы гэтай колёніі ў ваколіцах Сэвастополю пабудован г. зв. Хэрсонэскі кляштар.

**Крымскія горы** цягнуцца на паўночны усход ад Сэвастополю роўналежна паўднёваму берагу Крымскага паўвострава. Гэта параўнаўча маладыя зморшчавыя горы, якія лічацца за працяг Балканскіх гор з аднаго боку і Каўкаскіх гор—з другога. Сучасныя Крымскія горы зьяўляюцца



толькі маленькай рэшткай вялізнага горнага зморшчу, што цягнуўся калісь ад Балкан да Каўказу. Па сярэдзіне гэтага зморшчу ўдоўж яго ўтварылася даўгая вялізная шчыліна, а ўся частка зморшчу, што ляжала на поўдзень ад гэтай шчыліны, асунулася і абурылася ў глыб зямлі. Гэтым тлумачыцца сучасная будова Крымскіх гор, у якіх нібы адсутнічае паўднёвы схіл. На месцы даўнай шчыліны з-пад зямлі павылівалася шмат цякучай лявы, з якой утварыліся вульканы. Рэшткі гэтых вульканаў (Аюдаг, Ай-Тодор, Кастэль) яшчэ й цяпер уздымаюцца над самым морам у стане невялікіх стожкавых гор.

Над гэтымі гарамі ўзвышаюцца галоўныя ўзвышшы Крымскага ланцуга, складзеныя з цьвёрдых вапнякоў, павыгрызаных пячорамі, катлінамі, ямамі (найвышэйшы пункт Раман-Кош 1543 м. н. р. м.). Вярхі Крымскіх гор, звычайна плоскія, бязводныя, багатыя карставымі зьявамі, пакрыты



Мал. 112.—Здароўніца Новы Сімэіз на паўднёвым беразе Крыму.

толькі ўбогай траўкай і завуцца Яйлой (Яйла—паша). На поўдзень Яйла раптам абрываецца, на поўнач пахіляецца павольна, прычым вапнякі хаваюцца пад пластамі глiністых лупнякоў і пескавікоў. Схілы Крымскіх гор пакрыты лясамі, наверсе хваёвымі, ніжэй дубовымі і букавымі.

Нізкія праходы аддзяляюць ад галоўнай Яйлы некалькі асобных масываў і ў тым ліку Чатырдаг (1523 м. н. р. м.), які раней лічыўся найвышэйшым месцам усяго Крыму.

Пад забаронай Крымскіх гор паўднёвае ўзьбярэжжа паўвострава карыстаецца вельмі прыемным, цёплым кліматам і паводле прыгожасьці свайго

краявіду і мяккасьці клімату нагадвае Рыв'еру. Узімку маразоў тут зусім ня бывае, і толькі, як паўсюды ў Паўднёвай Эўропе, часта выпадаюць дажджы. Вясна цёплая, раньняя; лета гарачае, але сьпякота ўмяраецца блізкасьцю мора; восень прыемная, багатая на вінаград і плады.

Сярэдняя тэмп. году ў Ялце $+13{,}4^0$, сярэд студзеня $+3{,}5^0$, ліпеня $+24{,}2^0$.

Яснае неба, цёплае паўднёвае сонца, бліскучае цёмнае мора дадаюць надзвычайную чароўнасьць і харaство краявіду. Дзікія голыя скалы Крымскіх гор, змрочныя цясьніны, зрывістыя бяздоньні чаргуюцца тутака з вясёлымі зялёнымі вінаграднямі, з лясамі букаў і хвой, з садамі, паркамі ды прыгожымі мястэчкамі.



Мал. 113. — Мястэчка Гурзуф на паўднёвым беразе Крыму. На пярэднім пляне зьлева растуць купрэсы, на заднім пляне гара Аюдаг.

Мірты і ляўры, магноліі ды олеандры, купрэсы і сунічныя дрэвы сваім вечназялёным лісьцем дадаюць краіне падобнасьць да Міжземнаморскіх краёў. Тут добра пасьпяваюць пэрсікі, растуць найлепшыя гатункі вінаградніку, выябляюцца найлепшыя гатункі він. Сады, вінаградні ды засевы найдалікатнейшых гатункаў табакі становяць галоўнае багацьце Паўднёвага ўзьбярэжжа Крыму. Прыемны, здаровы клімат і прыгожы краявід прынаджвае сюды тысячы хворых на сухоты і проста багатых людзей, якія жадаюць тут адпачыць ад працы, падмацаваць здароўе і весела правесьці час у шыкоўных тутэйшых здароўніцах. У апошнія дзесяцёхгодзьдзі ўвесь паўднёвы бераг Крыму пакрыўся вясёлымі, харошымі мястэчкамі-здароўніцамі, у якіх існуюць санаторыі для хворых і раскошныя готэлі для багатыроў.



Горы, сонца, вечная зелень і мора зрабілі ўсё ўзьбярэжжа аднэй вялікай чароўнай здароўніцай з дзіўнымі замкамі (Орыянда, Лівадыя), якія належалі раней да расійскіх цароў, з прыгожымі паркамі і ботанічнымі садамі (Нікіцкі сад), у якіх растуць усе гатункі міжземнаморскіх расьлін.

Асяродкам гэтага краю зьяўляецца *Ялта*,—невялікі, але прыгожы, чысты, шыкоўны горад-здароўніца на схілах гор над самым морам. На ўсходзе, дзе канчаюцца Крымскія горы, стаіць *Тэодосія* (23000 нас.), гандлёвая прыстань, злучаная чыгункай з Паўночным Крымам.

**Керчанскі паўвостраў** пачынаецца на ўсход ад Тэодосіі. Гэта ўзгаркаваты стэп, падобны паводле кліматычных варункаў і расьліннасьці да Паўночнага Крыму. Пласты земнай кары тут складаюцца ў нізкія плоскія зморшчы, якія лічацца заходнімі адгор'ямі Каўказу. Шмат у якіх месцах тут сустракаюцца гразявыя крыніцы, або як іх даўней звалі „гразявыя вульканы". Час-ад-часу з іх выкідаецца гразь, якая хутка ўсыхае і стварае стожкавідны ўзгорак, падобны па выглядзе да маленькага вулькану з жэралам наверсе.

Выбухі гразі тлумачацца распадам органічнай матэры, якая ляжыць пад зямлёй. Газы, утварыўшыся з гэтай матэры, з імпэтам выдзяляюцца з шчылін у земных пластох і выкідаюць разам з сабой струмені гразі, падкідваючы іх на некалькі цаль увышкі.

Запраўдных вульканічных зьявішчаў тут ня бывае, але гарачыя мінэральная крыніцы, распаўсюджаныя ў краіне, сьведчаць аб тым, што недзе пад зямлёй да гэтага часу ляжаць пласты неастыглай лявы. Керчанскі паўвостраў вельмі багаты на нафту, якая месцам тут выцякае сама на паверхню. Ёсьць тут і вялікія паклады жалезнай руды, але да цяперашняга часу мінэральныя багацьці бязмаль-што не распрацоўваюцца.

З даўных часоў Керчанскі паўвостраў меў вялікае гандлёвае і стратэгічнае значэньне, бо пануе над выйсьцем з Азоўскага мора. Курганы з багатымі кладамі, зарытымі разам з нябожчыкамі, сьведчаць аб густой залюдненасьці і даўнейшым багацьці краіны. Тут была калісь сталіца даўнага багатага Босфорскага царства, сучасны горад *Керч* (26000 нас.), што ляжыць каля аднаназоўнай пратокі. Цяпер гэта морская крэпасьць і гандлёвая прыстань, у ваколіцах якой у моры і ў пратоцы ловяць так званыя керчанскія селядцы.

# Казацкія стэпы.

(Азнач паводле карты географічную шырыню і даўжыню. Якія старонкі мяжуюцца з Казацкімі стэпамі?)

Стэпы Паўднёвай Украіны працягваюцца на ўсход у вадазбор Дону і дасягаюць да груду ўзгоркаў Эргеняў, што ляжаць на вадападзеле Азоў-

скага і Касьпійскага вадазбораў. Дон у сваёй вышнявіне (у межах Паўднёвай Маскоўшчыны) цячэ з поўначы на поўдзень, потым зварочвае на паўднёвы ўсход і падходзіць блізка да Царыцынскага калена Волгі.

Каля Царыцыну пярэсмык паміж Донам і Волгай мае толькі 60 вёрст ушыркі і ўжо даўна расійскі ўрад меў замер пракапаць тутака суднаходны канал, каб злучыць галоўную раку Маскоўшчыны з Чорным морам. Аднак Дон цячэ на 20 сажняў вышэй за Волгу і толькі ўвясну мог-бы даваць ваду ў канал у дастатнай колькасьці. Пры сучасным становішчы тэхнікі гэтую перашкоду можна перамагчы, але яна затрымала ажыцьцяўленьне проэкту злучэньня рэк.

Пачынаючы ад свайго ўсходняга калена, Дон цячэ ўжо на паўднёвы захад, далей на захад і нарэшце ўліваецца некалькімі вусьцямі ў Таганрогскую затоку Азоўскага мора. Левы бераг Дону нізінны, лугавы; правы— высокі, зрывісты.

Нізіна, што працягнулася ўдоўж левага берагу Дону, на поўдзень ад Донскай нізавіны, пераходзіць у Заазоўскую нізіну, па якой працякае рака Кубань. Гэтая рака пачынаецца ў горах Каўказу, жывіцца горным сьнегам і разьліваецца як увясну, гэтак і ўлетку, у час шпаркага раставаньня каўкаскіх сьнягоў. У нізавіне сваёй Кубань цячэ павольна, ціхамірна, нарэшце разьдзяляецца на дзьве адтокі, з якіх адна цячэ ў Азоўскае, а другая ў Чорнае мора. Берагі абодвух гэтых вусьцяў Кубані багаты балотамі, густымі зарасьнікамі чароту і трысьцінаў, у якіх хаваюцца дзікі ды іншыя зьвяры і гняздуюць розныя балотныя птушкі. Між кубанскіх вусьцяў застаецца ўзгаркаваты Таманскі паўвостраў, які цягнецца між Азоўскім і Чорным морам насустрэч Керчанскаму паўвостраву Крыму.

На ўсходзе Заазоўская нізіна павышаецца і пераходзіць у так званае Стаўрапальскае плоскаўзвышша, за якім пачынаецца ўжо Прыкасьпійскі стэп. Толькі на поўнач ад Стаўрапальскага плоскаўзвышша, між ім і грудом Эргеняў, Заазоўская нізіна злучана з Прыкасьпійскай так званай Кума-Маныцкай лагчынай. Па гэтай лагчыне працякае прытока Дону Маныч. Улетку гэтая рака ўсыхае і пераварачваецца ў шэраг саланаватых вазёр, а ўвясну напаўняецца вадой, разьвільваецца і нясе сваю ваду па аднэй адтоцы на захад у Дон, а па другой—на ўсход у бок Кумы, якая ўліваецца ў Касьпійскае возера. Кума-Маныцкая лагчына зьяўляецца рэшткай, усохлым дном даўнай пратокі, што злучала Касьпійскае вазера з Азоўскім і Чорным морамі. Калі-б ровень вады ў Чорным моры падняўся толькі на 25 мэтраў, дык яно заліло-б Кума-Маныцкую лагчыну і зноў злучылася-б з Касьпійскім возерам.

Уся прастора Прыдонскіх і Заазоўскіх раўнін пакрыта грубым пластом лёэсу і лёэсавых глін, вышні слой якіх складае ўраджайную чорназемную глебу.

Клімат гэтага краю яшчэ сушэйшы, як у Паўднёвай Украіне. Толькі на поўдзень ад Кубані, у прыгор'ях Каўказу, колькасьць ападкаў значна



ўзрастае, павялічваецца з 300 да 900 мілімэтраў. Бязьлесны стэп, такі самы, як у Паўднёвай Украіне, распасьціраецца па ўсім гэтым краі. Увясну гэты стэп стрыкаціць тулíпанамі, півоніямі, касачамі, улетку шарэе ад кавылю ды іншых стэпавых траў, увосені выпальваецца сонцам, набывае жоўты і нарэшце чорна-жоўты колер. Нечапаных стэпаў тут захавалася яшчэ значна болей, як на Украіне, але й тут што-год павялічваецца плошча ральлі, а нечапаны стэп робіцца рэдкасьцю.

Люднасьць Прыдонскіх і Падкаўкаскіх стэпаў складаецца пераважна з казакоў, якія ўладаюць вялікімі надзеламі і жывуць параўнаўча багата.

Казакі былі падзелены на 3 „войскі“: донскае, кубанскае і тэрскае. Казакі карысталіся некаторым самаўрадам. На чале кожнага „войска“ стаяў абіраны прадстаўнікамі казакоў „наказны атаман“; краіна кожнага „войска“ была падзелена на акругі, акругі на станіцы і ў кожнай такой адзінцы казакі мелі права абіраць сваё начальства. Затое казакі былі абавязаны агульнай вайсковай службай, і кожны дарослы казак па першым закліку расійскага ўраду мусіў з сваім канёмісьці ваяваць, куды-б яго ні пагналі.

Паводле сваёй мовы казакі належаць да ўкраінцаў і да маскоўцаў. Да першых належыць большасьць кубанцаў, якія зьяўляюцца патомкамі перасееленых сюды запарожцаў, і частка донскіх. Большасьць донскіх казакоў складаецца з маскоўцаў.

З пачатку гістарычных часоў па сучасных казацкіх стэпах вандравалі розныя туркскія і іншыя народы: скіты, сарматы, аланы, хазары, печанегі, полаўцы, татары. Ад усіх гэтых народаў засталіся толькі могілкі-курганы, паўсюды раскіданыя па стэпе. З гор Каўказу ў Кубанскі стэп час-ад-часу спускаліся чаркесы, якія пасьвілі тут свае коні і здабывалі соль у вазёрах Маныцкай лагчыны.

У XVI в. на Дон пачынаюць надыходзіць уцекачы з Маскоўшчыны, якія не маглі сьцярпець уціску маскоўскіх баяр і ўраду. Тут яны асядаюць па магчымасьці далей ад сваёй бацькаўшчыны, селяцца дзе-небудзь каля рэчкі, дзе ёсьць рыба, трава для жывёлы і вада для піцьця. У выпадку варожых нападаў яны хаваюцца па балотных астравох ракі Дону. З цягам часу лік гэтых уцекачоў павялічваецца, яны злучаюцца ў адзіную вайсковую організацыю, як украінскія казакі Запарожжа. Для барацьбы з вандроўнікамі яны будуюць гарады-крэпасьці, пад заслонай якіх займаюцца гадоўляй жывёлы іральніцтвам. Як і запарожцы, тутэйшыя ўцекачы завуць сябе казакамі і з охвотай прымаюць у сваю сям'ю новых і новых уцекачоў ад маскоўскага прыгняценьня. Сюды прыходзяць уцекачы-стараверы, якія ня вытрымалі рэлігійнага ўціску, і сяляне, што ўцякалі ад прыгону. У 1570 г. донскія казакі прызналі над сабой уладу маскоўскага цара, але захавалі свае вольнасьці: права абіраць начальнікаў і вечавы парадак (казацкі круг). Расійскі ўрад карыстаўся казакамі, як заслонай проціў вандроўнікаў, але часамі імкнуўся зьменшыць казацкія вольнасьці. Некалькі разоў

казакі падымалі паўстаньні, абурваліся на расійскія гарады ў Прыволжы, пагражалі нават Маскве, але маскоўскі ўрад кожны раз перамагаў, нішчыў паўстаньні і часамі акрутна караў казакоў. Пётра I пасьля аднаго з паўстаньняў разбурыў усе непакорныя станіцы, а па Доне пусьціў плыты з шыбеніцамі, на якіх віселі правадыры паўстанцаў. Пасьля гэтага руйнаваньня многа казакоў уцякло з Прыдонскага стэпу ў Заазоўскі, дзе ўжо ў XVI веку зьявіліся першыя перасяленцы з Дону, якія не жадалі скарацца маскоўскаму цару. Там яны спакойна жылі побач з сваімі суседзямі-чаркесамі, кабардынцамі і чачэнцамі, займаліся ральніцтвам і гадоўляй жывёлы. Горшыя варункі стварыліся там пасьля таго, як пры Кацярыне II маскоўцы сілком пасялілі на чаркескіх землях рэшткі запароскага войска. Чаркесы пачалі бараніць свае землі, і пачалася ўпартая барацьба, якая цягнулася да таго часу, пакуль расійскія войскі не заўладалі Заходнім Каўказам і не павыганялі большую частку чаркесаў у Турэччыну.

Апрача казакоў у Прыдонскіх і Падкаўкаскіх стэпах жыве шмат сялян, пераважна ўкраінцаў, часткай расійцаў і нават беларусоў, якія працавалі, як парабкі, на казацкай зямлі. Самі казакі спачатку грэбавалі ральніцтвам і займаліся болей рыбацтвам, гадоўляй жывёлы і паляваньнем. Павялічэньне гушчыні залюдненьня ў краіне прымусіла і іх зьвярнуць увагу на зямлю, і цяпер ральніцтва зьяўляецца галоўным заняткам насельнасьці. Для апрацоўкі зямлі ўжываюць палепшаныя сельска-гаспадарчыя прылады, але спосабы ральніцтва старыя—дзірванны і трохпалёўка. Сеюць тут пераважна пшаніцу, значна меней жыта, многа ячменю, проса, кіяхі. Дзеля алею сеюць рапс, сонечнік, каноплі, лён: на баштанах саджаюць кавуны, дыні, гуркі; у далінах рэк—садовіну і вінаграднік. На Донскай нізавіне з вінаграду вырабляюць моцныя шыпячыя віны, на Тэраку слынуць моздоцкія і кізьлярскія віны.

Коні, быдла і авечкі былі калісь галоўным багацьцем краіны, але яшчэ й цяпер параўнаўча з іншымі старонкамі Эўропы казацкія стэпы лічацца вельмі багатымі на жывёлу.

Найболей пашыраныя паселішчы краю—казацкія станіцы—лічацца паселішчамі вясковага тыпу, хаця некаторыя з іх, дзякуючы выгодам палажэньня, маюць выгляд запраўдных гарадоў. Другія з станіц болей падобны да слабод Слабажаншчыны або да украінскіх сёл з прыгожымі белымі ляпянкамі. Трэція—у казакоў вялікарусаў—складаюцца з драўляных хат і нагадваюць вёскі Паўднёвай Маскоўшчыны. Гарадоў у краі параўнаўча мала. У Доншчыне яны згуртаваліся каля вусьцяў Дону, дзе жывуць так званыя гандлёвыя казакі.

На прытоцы Дону Аксаі ляжыць сталіца Донскага казацкага войска—*Новачаркаск* (43 тыс. нас.) з політэхнічным інстытутам і шэрагам іншых культурна-асьветных устаноў.

Ніжэй сутокі Дону з Аксаем ляжыць вялікі горад *Растоў-на-Доне* (181 тыс. нас.), з якім ужо зьліўся другі горад *Нахічавань*, заложаны



армянамі-перасяленцамі з Закаўказьзя. Растоў—даступны для дробных морскіх караблёў і зьяўляецца галоўнай прыстаньню казацкіх стэпаў. Адгэтуль у Заходнюю Эўропу вывозілася шмат збожжа і іншых мясцовых і прыволскіх тавараў. (Гандлёвы абарот прыстані перад вайной дасягаў 96 мільёнаў рублёў золатам). Людзі ўсіх станаў і розных нацый—расійцы, украінцы, грэкі, армяне, жыды, татары—мітусяцца па вуліцах гэтага гандлёвага места, купляюць, прадаюць, гамоняць і дадаюць Растову падобнасьць да Адэсы. Як у прамысловым асяродку Доншчыны, тут існуюць вялізныя паравыя млыны і табачныя фабрыкі. У час вайны ў Растоў перавялі расійскі унівэрсытэт з Варшавы.



Мал. 114.—Кляштар каля Пяцігорску.

Пярэдняй прыстаньню Растову можна лічыць *Таганрог* (100 тыс. нас.), што ляжыць на аднаназоўнай затоцы Азоўскага мора, але ўжо ў межах Украінскай С.С.Р. (Гандлёвы абарот да вайны—46 мільёнаў рублёў золатам).

У самым вусьці Дону ляжыць асяродак рыбацтва *Азоў*. Асяродкам Кубанскай зямлі зьяўляецца даўнейшы Кацярынадар, цяпер *Краснадар* (143000 нас.) па сярэдняй Кубані. Гэта важны асяродак гандлю пшаніцай з буйнымі млынамі.

У Краснадары будзе пабудована вялікая электрычная станцыя, якую спачатку будуць апальваць нафтай з суседняга багатага нафтай гораду Майкапу. Потым спадзяюцца замяніць апал сілай падаючай вады з ракі Белай. Гэтая станцыя можа

электрызаваць мясцовыя млыны і алейні. Сілай гэтай станцыі можа карыстацца нават Новарасійск (гл. ніжэй) і іншыя прыстані Чорнага мора.

На Стаўрапальскім плоскаўзвышшы ляжыць губэрскі горад *Стаўрапаль* (53000 нас.), а ў Тэршчыне ў падгор'ях згаслых вульканаў Машука і Бэштау пабудаваліся вясёлыя і прыгожыя здароўніцы, слынныя сваімі мінэральнымі крыніцамі: *Пяцігорск* (40000 нас.) з серкавымі крыніцамі, *Кіславодзк* (22000 нас.) з вуглятленістымі крыніцамі, *Эсэнтукі* (20000 нас.) з лугавымі крыніцамі, *Жалезнаводзк* з жалезістымі крыніцамі.

Прыемны, карысны для здароўя клімат і лячэбныя крыніцы прываблiваюць сюды мноства хворых.

Значная частка тавараў Заазоўскага стэпу вывозіцца за межы па чыгунках, якія пераразаюць Заходні Каўказ і злучаюць кубанскія гарады з каўкаскімі прыстанямі на Чорным моры. Такім чынам частка Закаўказьзя, што ляжыць на паўночна-ўсходнім узьбярэжжы Чорнага мора, цесна злучана з экономічнага боку з Кубаншчынай. Гэтае ўзьбярэжжа, забароненае гарамі з паўночнага ўсходу, адзначаецца прыемным падзваротнікавым кліматам і багатай міжземнаморскай расьліннасьцю. (З гэтай прычыны гэтую акругу часамі завуць Расійскай Рыв'ерай).

Галоўная прыстань там *Новарасійск* (49 тыс. нас., гандлёвы абарот да вайны—80 міл. руб.) Недахватам Новарасійску зьяўляюцца моцныя паўночна-ўсходнія вятры „бора“, такія, як у Дальмацыі.

## Прыкасьпійскі стэп.

На ўсход ад груду Эргеняў і Стаўрапальскага плоскаўзвышша пачынаецца вялікая Арала-Касьпійская катліна, якая яшчэ параўнаўча зусім нядаўна, ужо пасьля ледавіковай эпохі, была дном вялікага Арала-Касьпійскага мора, што абымала ўсю Сярэднюю Азію і была злучана з Чорным морам цераз Кума-Маныцкую лагчыну.

Значная частка Арала-Касьпійскай катліны каля берагоў Касьпійскага возера да цяперашняга часу ляжыць ніжэй роўня вады ў акіяне, а паверхня самага Касьпійскага возера ніжэй роўня мора на цэлых 25 мэтраў.

Довадам, які падмацоўвае дагадку аб даўным моры, што пакрывала калісь катліну, зьяўляецца надзвычайная роўнасьць яе—толькі даўнейшае морскае дно можа быць такім роўным. Гляістыя й пескавыя грунты Прыкасьпійскай нізіны зьмяшчаюць прымешку морскай солі і рэшткі тых жывёл-мякуноў (молюскаў), якія й да цяперашняга часу жывуць у Касьпійскім возеры.

Перагною ў грунтох Прыкасьпійскага стэпу вельмі мала, звычайна меней за 2%, і глеба мае сьветлы, жоўта-буры колер. Месцам бурая глеба зьмяшчае вялікі процант солі і пераходзіць у гэтак званыя саланчакі.



Асабліва многа солі бывае ў лагчынах, бо дажджавая вада выпаласквае соль з грунту і пераносіць яе ў самыя нізкія месцы, дзе і ўтвораюцца саланчакі або салоныя вазёры. У залежнасьці ад таго, на якім падгрунце ўтварылася глеба, яна бывае суглінкавай або супескавой, а на поўдзень ад вусьцяў Волгі і шмат у якіх іншых месцах каля Касьпійскага возера на паверхні ляжаць голыя сыпкія пяскі. Пяскі цягнуцца грудамі з захаду на ўсход і ўразаюцца ў Касьпійскае возера, так што паміж пескавымі грудамі застаюцца маленькія затокі (так званыя ерыкі). Далей ад Касьпія між пескавых грудоў ляжаць, нібы працягі гэтых заток, вузкія даўгія вазёры (гэтак званыя ільмені). Яшчэ далей ад Касьпія пад уплывам вятроў пескавыя груды ператвараюцца ў выдмы (барханы) правільнай формы паўмесяцаў.

Паводле сваёй прыроды ўся Арала-Касьпійская катліна зьяўляецца тыповай часткай Азіі. Аднак цераз гэтую катліну працякае нізавіна галоўнай ракі ўсёй Эўропы—Волгі, і з гэтай прычыны тую частку Арала-Касьпійскай катліны, якая ляжыць у вусьцях Волгі і на захад ад іх, звычайна далучаюць да Эўропы.

Па ўсёй гэтай краіне раскідана вельмі многа салоных бясстокавых вазёр. Гэта нібы рэшткі даўнага вялікага мора, пад якім калісь хавалася ўся краіна. Кожны дождж павялічвае колькасьць солі ў вазёрах, вымываючы яе з грунту ў вышэйшых месцах. Вада паруе з паверхні возера, але соль застаецца і асядае што-год новым пластом на дне яго. Рэк у краіне наагул мала, большасьць з іх не дасягае да Касьпійскага возера, а зьнікае ў пяскох і салоных вазёрах. Звычайна ўлетку рэкі краіны перасыхаюць.

Выняткам зьяўляецца Волга. Яна нясе з Маскоўшчыны гэтак многа вады, што, як у Афрыцы Ніл, утворвае вялікі оаз у Прыкасьпійскай пустыні, утворвае вялікую дэльту і сваімі адкладамі засыпае паўночна-заходнія часткі Касьпійскага возера. Ужо каля Царыцыну Волга разьдзяляецца на многалічныя адтокі, між якіх застаюцца тысячы рэчных астравоў. Адтокі Волскай нізавіны бязупынна мяняюць свае рэчышчы, размываюць старыя астравы, накідваюць сваімі адкладамі новыя, сплятаюцца адно з адным і складаюць заблытаную сетку вялікіх і малых рэчных пратокаў ды рознастайных балотных астравоў. Галоўная адтока—так званая Уласная Волга—цячэ па заходняй мяжы волскай дэльты; найвялікшая з пабочных адток—суднаходная Ахтуба—становіць усходнюю мяжу Волскай нізавіны. Дэльта Волгі шырокім паўвостравам уразаецца ў Касьпійскае возера і што-год нарастае, бо што-год у вусьцях адкладаюцца новыя масы прынесеных Волгай пяску і глею.

Апроч Волгі толькі Кума часамі дабягае да Касьпійскага возера, але звычайна і яна ўлетку губіцца ў пяскох, не дасягнуўшы некалькіх вёрст да Касьпія.

Усыханьне рэк, адсутнасьць стоку ў вазёрах, прысутнасьць пескавых выдмаў і іншыя падобныя зьявы Прыкасьпійскай краіны тлумачацца над-

звычайна сухім бяздожджным, кліматам яе. Заўсёды, а асабліва ўзімку, тут рашуча пераважваюць сухія паўночна-ўсходнія вятры. Ападкаў паўсюды выпадае меней за 300 мілімэтраў у год. Дажджы—вельмі рэдкае зьявішча, сьнег выпадае яшчэ радзей і рэдка пакрывае скрозь стэпавую глебу. Халодныя завірухі, якія часта здараюцца ўзімку, ня толькі ня прыносяць сьнегу, але нават наадварот, як венікам, зьмятаюць сьнег з голай раў-



Мал. 115.—Калмычка.

ніны куды-небудзь у лагчыну. Завірухі адзначаюцца нізкай тэмпэратурай паветра пры моцным ветры. Часта ад сьцюжы ў завіруху гінуць і людзі, і жывёла. Зіма ў краіне халаднейшая, як у нас на Беларусі, але затое ўлетку там пануе надзвычайная сьпякота.



Астрахань мае сярэднюю гадавую тэмпэратуру+9,4°, сярэднюю студзеня—7,2°, ліпеня+25,5°.

Сухі клімат і саланаватыя грунты перашкаджаюць жыцьцю ня толькі дрэўных, але наагул усякіх расьлін. Трава не пакрывае глебу скрозь, а расьце толькі асобнымі кусткаватымі пучкамі. Па суглінкавай бурай глебе можа расьці толькі палын, чарнобель ды калючая вярблюжая трава. Па саланчакох сустракаюцца толькі солялюбы, так званыя салянкі, якія могуць жывіцца салонай вадой. Па голых пяскох, напрыклад, па выдмах, трымаюцца рэдкія кусточкі тамарыксу з дробымі вечназялёнымі лісточкамі, праз якія выпараецца мала вады, і сухалюбныя траўкі. Большая частка краіны зьяўляецца тыповай пустыняй, і толькі ў далінах, асабліва па астраўкох дэльты Волгі, растуць нават дрэвы—тапелі, дубы і брызьліны. Тут сярод чаротаў і трысьцін варушыцца жыцьцё: па рэчных балотах туляцца качкі, чаплі, кулікі, крачкі, бакланы. У пустыні мала і жывёл. Праўда, там на ўсход ад Волгі яшчэ захаваліся антылёпы-сайгі, што жылі калісь і ў Чорнаморскім стэпе, але гэта тлумачыцца толькі малой колькасьцю ў Заволскім стэпе ворагаў гэтых жывёл—людзей.

Для жыцьця чалавека Прыкасьпійскі стэп нявыгодны, і люднасьць жыве там вельмі рэдка. Ральніцтва ў краіне зусім немагчыма, і заўсёды галоўным заняткам насельнікаў там была гадоўля жывёлы. Аднак і жывёла, шукаючы спажывы, мусіць абыходзіць вялікія прасторы ўбогага стэпу, а ўсьлед за жывёлай мусіць вандраваць яе ўладар—чалавек. З гэтай прычыны да цяперашняга часу тут жывуць вандроўныя народы: калмыкі і нагайскія татары.

Калмыкі належаць да мангольскай галіны народаў жоўтай расы і адзначаюцца выразным мангольскім абліччам: вузкімі вачыма, плескаватым носам, шырокім тварам, выдатнымі скуламі, жоўтай скурай і чорнымі простымі валасамі. Як вандроўны народ, калмыкі ня маюць сталых паселішчаў; яны вандруюць па ўсёй прасторы між Эргенямі, Кумой і Волгай, а жывуць у гэтак званых „кібітках“—лёгкіх часовых лямцовых палатках, якія ў час вандроўкі разьбіраюцца і кладуцца на вярблюдаў.

Галоўным заняткам калмыкоў зьяўляецца гадоўля авечак, быдла, коняй і вярблюдаў, галоўнай ядой—мяса і малако, галоўным піцьцём—гарбата, якую гатуюць, як варыва, з сольлю, мукой і маслам.

Гультаяватыя, нядбалыя калмыцкія мужчыны даўней займаліся паляваньнем і рабункам, а цяпер толькі сочаць за статкамі або гутараць з таварышамі ці гуляюць у карты; хатнюю працу выпаўняюць кабеты.

З таго часу, як расійцы адціснулі калмыкоў ад рэк, гаспадарка іх пачынае занепадаць. Завірухі нішчаць іх галоўнае багацьце—жывёлу, а раней ад завірух калмыкі хаваліся ў лярэчных чаротах і зарасьніках. Яшчэ болей, як ад завірух, гіне жывёлы ад вобліву (голялёду), калі жывёла ня можа здабыць сабе травы з-пад лёдавай коркі і гіне з голаду.

Шмат калмыкоў што-год уходзіць на заработкі на Волгу або на раку Урал, дзе ловяць рыбу, або ў гарады.

Калмыкі не паддаюцца расійскім уплывам і моцна трымаюцца сваёй веры (будыйскай), сваіх даўных звычаяў і вопраткі. Пасьля рэволюцыі зямля калмыкоў зроблена самаўраднай Калмыцкай рэспублікай (99 тыс. кв. клм., 127 тыс. насельн.).

Калмыкі прышлі ў Прыкаспійскі стэп у XVII в. з Алтаю, адкуль іх павыганялі кітайскія магамэтане-дунганы. Выцiснуўшы з краіны нагайскіх татар, калмыкі спачатку часта нападалі на суседнія расійскія паселішчы. Прыблізна праз паўтараста гадоў расійцы заваявалі Калмыцкія стэпы, пасьля чаго большасьць калмыкоў нарыхтавалася ў дарогу адваротна на Алтай. Аднак расійцы і кіргізы, якія жывуць у пустыні на ўсход ад Волгі, загарадзілі ім дарогу, і толькі некалькі тысяч калмыкоў уцяклі на бацькаўшчыну продкаў.



Мал. 116.—Калмыцкая „кібітка".

Між Кумой і Тэракам на поўдзень ад калмыкоў жывуць даўнейшыя насельнікі краіны—нагайскія татары. Часткай яны жывуць асела, часткай, як і даўней, вандруюць па стэпе. Як калмыкі, гэтак і нагайскія татары пакрысе выміраюць. Затое каля рэк, асабліва ў дэльце Волгі, хутка павялічваецца колькасьць расійцаў, якія жывуць, зразумела, асела, займаюцца рыбацтвам, баштанствам і гандлем.

Нізавіна Волгі вельмі багата на рыбу. Што-год тут ловяць каля 25-30 мільёнаў пудоў воблы, селядцоў, тараноў, судакоў, самоў, ляшчоў і г. д. Радзей пападаецца каштоўная бяскосная рыба: сьцярлядкі ды асятры, ікра якіх лічыцца асабліва смачнай і каштоўнай стравай. Рыбу ловяць невадам, разьмяркоўваюць па гатунках, чысьцяць, соляць і сушаць ды



вывозяць ува ўсе куты Ўсходняй Эўропы. Па берагох Каспійскага возера ловяць нэрпаў. На ўсход ад Волгі ў вазёрах Эльтон і Баскунчак здабываюць вельмі многа солі, якую вязуць на Волгу і па рацэ вывозяць у Маскоўшчыну.

Па берагох Волгі сеюць кавуны, дыні, саджаюць вінаграднік.

Волга зьяўляецца важнай гандлёвай дарогай: па ёй сплаўляюць маскоўскія тавары ў Сярэднюю Азію і Пэрсію, па ёй вязуць у Маскоўшчыну газу з Каўказу, паўднёвыя плады і шоўк з Пэрсіі, баваўну з Сярэдняй Азіі; па ёй развозяць ува ўсе бакі мясцовую рыбу і соль.

Асяродкам гандлю Волскай нізавіны зьяўляецца *Астрахань* (133 тыс. нас.), якая ляжыць на адным з астраўкоў вусьцяў Волгі і вядзе бойкі гандаль з іншымі Каспійскімі прыстанямі: Баку, Краснаводзкам і пэрсідзкімі гарадамі.

Рознапляменьневая люднасьць гораду складаецца з расійцаў, татар, пэрсаў і армян. Сучасныя саборы і цэрквы ўздымаюцца тут побач з татарскімі (суньніцкімі) і пэрсідзкімі (шыіцкімі) мячэцямі. Старасьвецкая крэпасьць—крэмль—сьведчыць аб даўнейшым стратэгічным значэньні Астрахані.

На ўсход ад Волскай нізавіны распасьціраецца Кіргіскі стэп, заходняя частка якога, што ляжыць між рэкамі Волгай і Уралам, часамі лічыцца за частку Эўропэйскай Расіі. Толькі самыя заходнія куточкі гэтай краіны маюць сувязь з Волгай і абменьваюцца з ёй сваімі вырабамі. Рэшта ня мае ніякага дачыненьня да Эўропы і мусіць разглядацца разам з іншымі краінамі Азіі.